Установа адукацыі
"Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка"

Філалагічны факультэт

Кафедра мовазнаўства і літаратуразнаўства

(рэг. № УМ 31-1/ 79/2019)

УЗГОДНЕНА
Загадчык кафедры
_____Д.В. Дзятко
25.06. 2019 г.

УЗГОДНЕНА
Дэкан філалагічнага факультэта
_____В.Л. Старычонак
26.06.2019 г.

ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНЫ КОМПЛЕКС ПА ДИСЦЫПЛІНЕ
"БЕЛАРУСКАЯ ДЫЯЛЕКТАЛОГІЯ"

для спецыяльнасцей:
1 – 02 03 01 Беларуская мова і літаратура
1 – 02 03 03 Беларуская мова і літаратура. Замежная мова

Складальнік:
Чарняк В.В., кандыдат філалагічных навук

Разгледжана і зацверджана
на пасяджэнні Савета БДПУ "27" 06 2019 г., пратакол № 10

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

ОГЛАВЛЕНИЕ

ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА……...3

I. ТЭАРЭТЫЧНЫ РАЗДЗЕЛ…….6
КАНСПЕКТ ЛЕКЦЫЙ ПО ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЕ…….6

II. ПРАКТЫЧНЫ РАЗДЗЕЛ…….....23
1. ТЭМАТЫКА СЕМІНАРСКІХ ЗАНЯТКАЎ……...…...23
2. САМАСТОЙНАЯ КІРУЕМАЯ РАБОТА СТУДЭНТАЎ……...……....27
3. СУПРАВАДЖАЛЬНЫЯ МАТЭРЫЯЛЫ...……..……...29

III. РАЗДЗЕЛ КАНТРОЛЮ ВЕДАЎ...……32
1. ТЭСТАВЫЯ ЗАДАННІ……..……..…….....32
2. ПЫТАННІ ДЛЯ САМАПРАВЕРКІ..……..……...…..…37
3. ПЫТАННІ ДА ЗАЛІКУ.....……..……..……...…….....37

IV. ДАПАМОЖНЫ РАЗДЕЛ…….....……..…..40
1. ВУЧЭБНАЯ ПРАГРАМА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ..…….....40
2. МЕТАДЫЧНЫЯ РЭКАМЕНДАЦЫІ ПА АРГАНІЗАЦЫІ І ВЫКАНАННІ КІРУЕМАЙ САМАСТОЙНАЙ РАБОТЫ СТУДЭНТАЎ. СПІС РЭКАМЕНДАВАНАЙ ЛІТАРАТУРЫ.....64
3. МЕТАДЫЧНЫЯ РЭКАМЕНДАЦЫІ ПА АРГАНІЗАЦЫІ І ВЫКАНАННІ САМАСТОЙНАЙ РАБОТЫ СТУДЭНТАЎ ……66
4. ПРЫКЛАДНЫ ПЕРАЛІК ЗАДАННЯЎ КІРУЕМАЙ САМАСТОЙНАЙ РАБОТЫ СТУДЭНТАЎ……69

СПІС РЭКАМЕНДАВАНАЙ ЛІТАРАТУРЫ……72

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Вучэбна-метадычны комплекс па дысцыпліне “Беларуская дыялекталогія” прызначаны для рэалізацыі на першай ступені вышэйшай адукацыі ў межах цыкла спецыяльных дысцыплін.

Дысцыпліна “Беларуская дыялекталогія” знаёміць студэнтаў з вынікамі даследавання дыялектнай мовы і раскрывае асноўныя заканамернасці яе функцыянавання, паказвае найважнейшыя асаблівасці беларускай дыялектнай мовы на ўсіх ўзроўнях моўнай сістэмы ў структурна-тэрытарыяльных разнавіднасцях, тлумачыць сувязь і агульныя рысы з сістэмай літаратурнай мовы, прадстаўляе сістэму навуковых паняццяў гэтай лінгвістычнай галіны і асноўныя дасягненні ў даследаванні народных гаворак.

Асноўныя мэты выкладання дысцыпліны:

– сфарміраваць у будучых настаўнікаў уяўленне пра беларускую нацыянальную мову ва ўсёй разнастайнасці формаў яе існавання;

– развіць практычныя навыкі выяўляць і назіраць дыялектныя асаблівасці ў мове жыхароў пэўнай мясцовасці, запісваць і аналізаваць канкрэтны дыялектны матэрыял;

– пазнаёміць студэнтаў з гісторыяй станаўлення і этапамі развіцця беларускай дыялекталогіі і яе асноўнымі дасягненнямі;

– выхаваць любоў і павагу да духоўнай і інтэлектуальнай спадчыны беларускага народа, пачуццё нацыянальнай самапавагі і самаідэнтыфікацыі.

З названых мэт вынікаюць наступныя задачы вывучэння дысцыпліны:

– пазнаёміць студэнтаў з сістэмай навуковых паняццяў, прынятай у беларускай дыялекталагічнай навуцы, і метадамі дыялекталагічных даследаванняў;

– выпрацаваць навыкі апрацоўкі і аналізу асаблівасцей дыялектнай мовы;

– навучыць методыцы палявых даследаванняў і запісу асаблівасцей дыялектнай мовы, у тым ліку і з выкарыстаннем сучасных тэхнічных сродкаў;

– паказаць сувязь дыялекталогіі з рознымі раздзеламі беларускага мовазнаўства і іншымі гуманітарнымі навукамі;

– падрыхтаваць будучага настаўніка роднай мовы да самастойнай працы ва ўмовах мясцовага дыялекту.

У выніку вывучэння дысцыпліны студэнт павінен

ведаць:

– сістэму навуковых паняццяў беларускай дыялекталогіі;

– метады дыялекталагічных даследаванняў і методыку збіральніцкай працы;

– сувязь дыялекталогіі з рознымі раздзеламі беларускага мовазнаўства і іншымі гуманітарнымі навукамі;

– гісторыю станаўлення і этапы развіцця беларускай дыялекталогіі;

– асноўныя дасягненні айчынных навукоўцаў у галіне беларускай дыялектнай лексікаграфіі, фразеаграфіі і лінгвагеаграфіі;

– групоўку беларускіх гаворак, асноўныя асаблівасці асобных дыялектаў і груп гаворак на ўсіх узроўнях мовы;

– асаблівасці фарміравання сучаснай беларускай літаратурнай мовы на аснове народных гаворак;

– методыку выкладання роднай мовы ў дыялектных умовах;

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

– навуковую, вучэбную і даведачную літаратуру па дадзенай галіне мовазнаўчай навукі;

умець:

– збіраць, апрацоўваць, класіфікаваць і аналізаваць дыялектны матэрыял;

– параўноўваць моўную сістэму гаворкі з сістэмай літаратурнай мовы на ўсіх узроўнях;

– выкарыстоўваць тэхнічныя сродкі для збірання, апрацоўкі і аналізу моўных фактаў;

– складаць дыялектны слоўнік і лінгвістычную карту;

– арганізоўваць навуковую дыялекталагічную працу вучняў і кіраваць дыялекталагічным гуртком;

– выкарыстоўваць метады, прыёмы , сродкі і формы навучання роднай мове ў дыялектным асяроддзі;

– карыстацца навуковай, вучэбна-метадычнай і даведачнай літаратурай па беларускай дыялекталогіі.

Вучэбна-метадычны комплекс “Беларуская дыялекталогія” займае важнае месца ў сістэме лінгвістычнай падрыхтоўкі студэнтаў філалагічных спецыяльнасцей, з’яўляецца надзейнай базай для грунтоўнага засвоення беларускай мовы.Пры вывучэнні дысцыпліны “Беларуская дыялекталогія” прадугледжваецца пераемнасць і цесная сувязь данага вучэбна-метадычнага комплекса з вучэбна-метадычнымі комплексамі па дысцыплінах “Сучасная беларуская літаратурная мова”, “Стараславянская мова” і “Гісторыя беларускай мовы”.

Вучэбна-метадычны комплекс “Беларуская дыялекталогія” ўключае тэарэтычны, практычны, кантролю ведаў і дапаможны раздзелы.

Тэарэтычны раздзел вучэбна-метадычнага комплекса змяшчае матэрыялы для тэарэтычнага вывучэння вучэбнай дысцыпліны ў аб’ёме, які ўстаноўлены тыпавым вучэбным планам па спецыяльнасці 1 – 02 03 01 Беларуская мова і літаратура; 1 – 02 03 03 Беларуская мова і літаратура. Дадатковая спецыяльнасць, у прыватнасці тыпавую вучэбную праграму па дысцыпліне і вучэбную праграму БДПУ імя Максіма Танка па дысцыпліне.

Практычны раздзел вучэбна-метадычнага комплекса змяшчае спісы пытанняў, што выносяцца на практычныя заняткі, тэматыку рэфератаў, заданні да кантрольнай працы, якія поўнасцю адпавядаюць тыпавому вучэбнаму плану БДПУ імя Максіма Танка па спецыяльнасці 1 – 02 03 01 Беларуская мова і літаратура; 1 – 02 03 03 Беларуская мова і літаратура. Дадатковая спецыяльнасць. Тут размешчаны дыялектныя тэксты з розных рэгіёнаў Беларусі, узоры аналізу тэкстаў для навучання студэнтаў умець параўноўваць моўную сістэму гаворкі з сістэмай літаратурнай мовы на ўсіх узроўнях.

Раздзел кантролю ведаў вучэбна-метадычнага комплекса змяшчае матэрыялы бягучай і выніковай атэстацыі (крытэрыі ацэнкі вынікаў навучання, пералік пытанняў да заліку, узор заліковага тэсту, прыкладную тэматыку курсавых і дыпломных прац), якія дазваляюць вызначыць адпаведнасць вынікаў вучэбнай дзейнасці студэнтаў патрабаванням адукацыйнага стандарту вышэйшай адукацыі і вучэбна-праграмнай дакументацыі адукацыйных праграм вышэйшай адукацыі.

Дапаможны раздзел вучэбна-метадычнага комплекса змяшчае пералік вучэбных, навуковых і інфармацыйна-аналітычных матэрыялаў, якія

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

рэкамендуюцца студэнтам для выкарыстання пры вывучэнні дысцыпліны “Беларуская дыялекталогія”. Тут размешчаны парады па падрыхтоўцы да практычных заняткаў, рэкамендацыі па выкананні заданняў па КСР, рэкамендацыі па правядзенні самастойных навуковых даследаванняў, парады па выкананні тэставых заданняў, правілы афармлення курсавых і дыпломных прац, тэрміналагічны слоўнік па беларускай дыялекталогіі.

Вывучэнне “Беларускай дыялекталогіі” дапаможа студэнтам сістэматызаваць набытыя веды пры вывучэнні іншых лінгвістычных дысцыплін, навучыць будучых настаўнікаў заўважаць, кваліфікаваць і выпраўляць памылкі вучняў, у тым ліку абумоўленыя ўплывам дыялектнага маўлення і праблемамі білінгвізму ў краіне.

Вучэбна-метадычны комплекс складзены ў адпаведнасці з рэкамендаваным тыпавым вучэбным планам агульным аб’ёмам дысцыпліны для спецыяльнасці Беларуская мова і літаратура (72 гадзіны), для спецыяльнасці Беларуская мова і літаратура. Замежная мова (84 гадзіны) і відамі вучэбнай работы.

Віды вучэбнай работы	Колькасць гадзін
Аўдыторныя заняткі: - лекцыйныя - практычныя	42/42 20/20 22/22
Агульная працаёмкасць дысцыпліны	72/84
Від выніковага кантролю	залік

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

І. ТЭАРЭТЫЧНЫ РАЗДЗЕЛ

КАНСПЕКТ ЛЕКЦЫЙ ПА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЕ

Тэма 1. Уводзіны. Дыялекталогія як раздзел мовазнаўства (1 гадзіна)

Роднае беларускае слова, такое ласкавае і пяшчотнае, як подых цёплага летняга ветрыку ці дотык ранішняга сонечнага праменьчыка, звонкае і пералівістае, як спеў празрыстых сцюдзёных крынц, суровае і грознае, як пошум раптоўнай летняй навальніцы... Роднае слова не толькі важнейшы сродак нашага духоўнага развіцця, скарбніца шматпакутнай і багатай гісторыі народа. Яно ўводзіць нас у жыццё і думкі людзей, з'яўляецца пастаянным і неабходным сродкам нашай сувязі са сваімі блізкімі, яднае нас у нацыю. Яно ж з'яўляецца самай выразнай і прыкметнай адзнакай этнічнай прыналежнасці чалавека. “Пазнаюць людзей ці па гаворцы, ці па адзежы... вось жа гаворка, язык і ёсць адзежа душы”, – пісаў адзін з пачынальнікаў новай беларускай літаратуры Францішак Багушэвіч.

Уся гісторыя фармавання і развіцця розных нацыянальных моў у свеце зводзіцца галоўным чынам да адлюстравання разнастайных працэсаў узаемадзеяння паміж літаратурнай мовай і мясцовымі тэрытарыяльнымі дыялектамі. Вывучэннем апошніх і займаецца такая лінгвістычная дысцыпліна, як **дыялекталогія** (ад грэц. *dialectos* 'размова, гаворка').

Як вядома, дыялекталогія як самастойны раздзел мовазнаўчай навукі ўзнікла на базе этнаграфіі на пачатку XIX ст. Гэта было абумоўлена той акалічнасцю, што дыялектныя асаблівасці насельніцтва таго ці іншага рэгіёна фіксаваліся разам з помнікамі этнаграфіі і разглядаліся этнографамі “перш за ўсё як важная этнаграфічная прыкмета”. Апісваючы традыцыйны народны побыт беларусаў і запісваючы тэксты іхніх песняў, этнографы адлюстроўвалі разнастайныя дыялектныя рысы жыхароў розных мясцовасцяў Беларусі. І хоць, дзеля справядлівасці, трэба заўважыць, што колькасць гэтых занатаваных рысаў была нязначная, але ў пэўнай ступені яны даюць уяўленне аб той ці іншай гаворцы”. Паступова дыялекталогія вылучылася як асобны раздзел этнаграфіі. У ім пачалі рабіцца спробы даць агляд дыялектаў і гаворак дадзенай мовы, што афармлялася звычайна ў выглядзе “каталогаў” дыялектных асаблівасцяў, уласцівых гаворкам розных тэрыторый. Аднак сама дыялектная мова ў канкрэтным населеным пункце яшчэ не разглядалася як цэласная сістэма. Такія падыходы і разуменне прыйшлі да мовазнаўцаў значна пазней разам з тэарэтычным развіццём самой лінгвістычнай навукі.

Мова любой сучаснай развітой нацыі або народнасці ўяўляе з сябе складаную сістэму (сістэму сістэмаў), у якую ўваходзяць, з аднаго боку, стандартызаваная, апрацаваная літаратурная разнавіднасць дадзенай нацыянальнай мовы з разнастайнымі функцыянальнымі стылямі, а з другога – яе дыялектная разнавіднасць.

Дыялекталогія як лінгвістычная навука падзяляецца на два асобныя раздзелы – апісальную і гістарычную. **Апісальная дыялекталогія** даследуе рэальны стан мясцовых гаворак на сучасным этапе, іх лінгвістычныя асаблівасці на розных

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

узроўнях мовы (фанетычным, марфалагічным, сінтаксічным, лексічным), групоўку і ўзаемаразмяшчэнне гаворак адносна адна адной. **Гістарычная дыялекталогія** тлумачыць паходжанне і развіццё мясцовых гаворак, іх асаблівасцяў і групаў, складванне дыялектнай мовы ўвогуле як цэласнай сістэмы. Паміж апісальнай і гістарычнай дыялекталогіяй няма і не можа быць выразна акрэсленай мяжы, бо разнастайныя гістарычныя факты істотна дапамагаюць вывучыць і апісаць сучасныя дыялектныя мовы, і, наадварот, без дасканалага ведання сучаснага стану дыялектаў, паасобных лінгва-дыялектных фактаў немагчымае іх гістарычнае вывучэнне.

2.1 Дыялектная мова і літаратурная мова – дзве формы існавання нацыянальнай мовы (1 гадзіна)

Гісторыя фармавання пераважнай большасці нацыянальных літаратурных моваў пачыналася звычайна з ужывання жывой народнай мовы ў пісьмовых зносінах, з узнікнення на гэтай мове ў першую чаргу літаратурных твораў, а таксама іншых пісьмовых дакументаў, што сведчыла аб абуджэнні нацыянальнай самасвядомасці народа, аб яго моцным і шчырым імкненні да нацыянальнага адзінства і самастойнасці ў гістарычным развіцці. Як вядома, узнікненне пісьмовай мовы на глебе народнай мовы само па сабе не стварае моўнага адзінства. Але пачатак пісьмовых зносінаў найбольш востра ставіць пытанне аб неабходнасці такога адзінства, аб неабходнасці пошукаў шляхоў да моўнай агульнасці ў межах пісьменства.

Сучасныя нацыянальныя літаратурныя мовы, у тым ліку і сучасная беларуская літаратурная мова, – гэта досыць новыя па сваёй прыродзе і функцыях з'явы моўнай культуры народаў. І таму яны істотна адрозніваюцца не толькі ад гаворак, але і ад старажытных пісьмовых моваў. Дастаткова заўважыць, што ранейшыя пісьмовыя мовы ў многіх народаў былі чужымі, запазычанымі і не маглі задавальняць у поўнай меры патрэбы грамадства (да прыкладу, лаціна ў еўрапейскіх народаў або арабская мова ў многіх краінах Азіі).

У навуковай літаратуры прынята называць старажытныя пісьмовыя мовы, як і сучасныя, літаратурнымі мовамі. Пад тэрмінам 'літаратурная' маецца на ўвазе не толькі тое, што тая ці іншая моўная сістэма служыць сродкам пісьмовых зносін, абслугоўвае перш за ўсё патрэбы літаратуры, пісьменнасці, але і тое, што гэтая моўная сістэма з'яўляецца агульнай для ўсяго народа. Агульнай па сваёй ролі і функцыях. Таму старыя пісьмовыя мовы поўнасцю адпавядаюць назве літаратурныя і ў падобным разуменні нічым не адрозніваюцца ад сучасных літаратурных моваў.

Найбольш надзейнай крыніцай пры вывучэнні беларускай дыялектнай мовы з'яўляюцца непасрэдныя запісы жывога народнага маўлення, што праводзяцца ў любым абраным населеным пункце метадам непасрэднага назірання за гаворкай.

Існуе два віды фіксацыі фактаў – запіс на слых і запіс на магнітафонную стужку. Гэта могуць быць узоры звязных тэкстаў пра разнастайныя асаблівасці і падзеі звычайнага вясковага жыцця, народныя легенды, паданні, казкі, замовы, песні, прыпеўкі, апісанні традыцыйных абрадаў, прыказкі, прымаўкі, загадкі, выслоўі, адказы на пытанні спецыяльных дыялекталагічных праграмаў ці інструкцыяў.

Больш надзейнымі і каштоўнымі лічацца магнітафонныя і лічбавыя запісы жывога маўлення, паколькі яны вылучаюцца большай дакладнасцю і даюць

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

магчымасць неаднаразовага праслухоўвання і пераправеркі матэрыялаў у любым пажаданым тэмпе, а таксама могуць выкарыстоўвацца пры разнастайных эксперыментальна-фанетычных доследах. Багаты дыялектны матэрыял змяшчаюць разнастайныя этнаграфічныя і фальклорныя запісы як мінулага, так і сучасныя. Для высвятлення пэўных пытанняў гістарычнай дыялекталогіі важнай крыніцай з'яўляюцца помнікі старажытнай беларускай пісьменнасці.

Для запісу дыялектных матэрыялаў выкарыстоўваецца спецыяльны фанетычны алфавіт. Асновай для яго служыць сучасны алфавіт беларускай літаратурнай мовы з уключэннем у яго некаторых дадатковых, надрадковых і падрадковых, знакаў. Асноўнае прызначэнне фанетычнага алфавіту – дакладна перадаць на пісьме кожны пачуты гук дыялектнай мовы. Такая перадача вуснага маўлення на пісьме ў лінгвістычнай навуцы называецца фанетычнай транскрыпцыяй.

Вывучэнне народных гаворак у мінулым будавалася, як правіла, па адным з двух прынцыпаў: 1) адзначаліся адрозненні ад рускай або беларускай літаратурнай мовы, 2) дыялектныя факты параўноўваліся з лінгвістычнымі асаблівасцямі старажытных помнікаў і адзначаліся змены, што адбыліся у гаворцы на працягу гісторыі мовы. Аднак абодва названыя метады выклікаюць пэўныя пярэчанні. Пры даследаванні толькі адрозненняў ад літаратурнай мовы нярэдка губляюцца рысы, істотныя для агульнай характарыстыкі гаворкі, а вывучэнне адрозненняў гаворкі ад старажытнага стану не дае дакладнага ўяўлення аб элементах і іх узаемаадносінах, што характарызуюць яе сучасны стан. Найбольш мэтазгодным уяўляецца фіксацыя і даследаванне ў кожным населеным пункце Беларусі ўсіх фактаў на фанетычным, марфалагічным, сінтаксічным і лексічным узроўнях мовы. Толькі такое падрабязнае манаграфічнае вывучэнне кожнай асобнай гаворкі можа забяспечыць аб'ектыўны і поўны аналіз усёй структуры беларускай дыялектнай мовы.

Тэма 3. Лінгвістычная геаграфія
(2 гадзіны)

Штогод Інстытут мовазнаўства імя Якуба Коласа АН Беларусі, універсітэты, педагагічныя інстытуты арганізуюць спецыяльныя мовазнаўчыя экспедыцыі. Іх мэта – збор мясцовых словаў. Да гэтых экспедыцый спецыяльна рыхтуюцца – распрацоўваюць тэмы гутарак, спісы пытанняў, малюнкі, схемы і г.д. "Палявыя" дыялекталагічныя атрады выязджаюць у папярэдне абраныя вёскі ўсёй Беларусі. Навукоўцы высвятляюць, як па-мясцоваму вымаўляюцца гукі і іх спалучэнні, якія канчаткі маюць словы пры змяненні, як словы ўтвараюцца і спалучаюцца ў сказах, якія словы ўжываюцца для найменння розных прадметаў і з'яваў рэчаіснасці. Гэта экспедыцыі па моўнай, або лінгвістычнай, геаграфіі. Яны вызначаюць ужыванне і пашырэнне мовы ў пэўных геаграфічных межах, у паселішчах людзей на пэўнай тэрыторыі.

Лінгвагеаграфія, **лінгвістычная геаграфія** – раздзел мовазнаўства, які вывучае тэрытарыяльнае пашырэнне моўных з'яваў, іх узаемаразмяшчэнне адносна адна адной і заканамернасці ўзаемадзеяння паміж імі.

Лінгвагеаграфія вылучылася з дыялекталогіі як навуковы метад выяўлення і адлюстравання мясцовых гаворак у іх узаемасувязі.

Як і любая іншая галіна навукі, лінгвагеаграфія мае сваю сістэму навуковых паняццяў (тэрмінаў), асноўнымі з якіх з'яўляюцца: сетка апорных населеных пунктаў, праграма даследавання (Апытальнік), лінгвістычная карта,

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

ізаглоса, лінгвістычны (дыялекталагічны) атлас, арэал, дыялектная зона, супрацьпастаўленыя і несупрацьпастаўленыя дыялектныя адрозненні.

Сеткай апорных населеных пунктаў з'яўляюцца абраныя для лінгвагеаграфічных даследаванняў населеныя пункты (вёскі, паселішчы) на пэўнай моўнай тэрыторыі. Як правіла, гэтая сетка бывае выбарачнай.

Апорныя населеныя пункты вызначаюцца прыкладна на аднолькавай адлегласці адзін ад аднаго. Гушчыня канкрэтнай апорнай сеткі (колькасць даследуемых населеных пунктаў) залежыць ад задач лінгвагеаграфічнага даследавання, абранай для вывучэння тэрыторыі, наяўнасці дастатковай колькасці навуковых сілаў і інш.

Праграма даследавання складаецца ў выглядзе лінгвагеаграфічнага Апытальніка, у якім змешчаны шэраг канкрэтных указанняў на тыя моўныя з'явы, наяўнасць якіх трэба ўстанавіць у гаворках апорных населеных пунктаў і выключна дакладна занатаваць.

У **Апытальніку** называюцца і апісваюцца з'явы, падаюцца прыклады іх выяўлення ў паасобных беларускіх гаворках і г.д. Навуковая апрацоўка сабраных у экспедыцыях дыялектных матэрыялаў – стварэнне лінгвістычных картаў і іх збораў – лінгвістычных (дыялекталагічных) атласаў.

На **лінгвістычнай карце** з дапамогай спецыяльнай сістэмы ўмоўных знакаў падаюцца звесткі пра якую-небудзь асобную дыялектную з'яву і яе рэалізацыю ў кожнай канкрэтнай гаворцы.

Найчасцей асноўнай асаблівасцю кожнай карты з'яўляецца адлюстраванне на ей разнаякасных структурных адносін паміж варыянтамі картаграфуемай з'явы. Напрыклад, на карту наносяцца адказы на пытанні пра тое, як вымаўляецца той ці іншы гук або спалучэнне гукаў у пэўнай фанетычнай пазіцыі, які канчатак мае слова ў канкрэтнай граматычнай форме, якім словам называюць той ці іншы прадмет, з'яву, дзеянне, прымету і г.д.

Кожная **дыялектная з'ява** на карце пазначана спецыяльным знакам або яго варыянтам, што дае магчымасць паказаць шматпланавасць структурных сувязяў разнастайнага варыравання картаграфуемага аб'екта.

Першапачаткова сабраны матэрыял наносіцца на спецыяльную **карту-бланкоўку**, якая ўяўляе з сябе геаграфічную карту даследуемай тэрыторыі з пазначанымі на ёй асноўнымі геаграфічнымі аб'ектамі: буйнымі рэчкамі, гарадамі, нярэдка межамі тэрытарыяльна-адміністрацыйных адзінак, сеткай апорных населеных пунктаў.

Такім чынам, толькі карта нярэдка дапамагае разблытаць складаны клубок якасна адрозных элементаў структуры мовы, што адлюстроўваліся ў назвах, утвораных на перакрыжаванні розных структурных узроўняў мовы.

Тэма 4.1 Звесткі з гісторыі фарміравання беларускіх тэрытарыяльных дыялектаў
(2 гадзіны)

На тэрыторыі сучаснай Беларусі вучоныя паводле роднаснай блізкасці народных гаворак выдзяляюць два буйныя дыялекты – паўночна-ўсходні і паўднёва-заходні, а таксама дзве пазадыялектныя групы гаворак – сярэднебеларускія і заходнепалескія, або брэсцка-пінскія, гаворкі.

Як вядома, дыялекты – найбольш старыя адзінствы гаворак, нават старэйшыя

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

за саму беларускую мову. Таму групоўка гаворак, якая намі разглядаецца, з сучаснага пункту погляду часам можа істотна адрознівацца ад групоўкі гаворак з гістарычнага пункту гледжання, г.зн. ад групоўкі гаворак у розныя гістарычныя перыяды.

Аднак групоўка гаворак па паходжанні заўсёды з'яўляецца вынікам гістарычнай рэканструкцыі. Мы ж на практыцы маем перад сабою сучасныя гаворкі ў іх сучасных узаемаадносіўнах, што і дае нам магчымасць іх групоўкі з сучаснага пункту погляду.

Асаблівасці беларускай дыялектнай мовы знайшлі сваё адлюстраванне спачатку ў фальклорна-этнаграфічных запісах на пачатку XIX ст. У гэты час у друку з'явіліся невялікія даследаванні беларускай дыялектнай мовы Канстанціна Калайдовіча (1822), Ф.Галатузава (1852), Мікалая Анімеле (1853) і інш.

Спробы ж лінгвістычнага асэнсавання і абагульнення назапашаных дыялектных матэрыялаў адносяцца да другой паловы XIX – пачатку XX ст. і звязаны з імёнамі Івана Насовіча, Мітрафана Коласава, Карла Апеля, Івана Нядзёшава, Еўдакіма Раманава, Уладзіміра Дабравольскага, Аляксандра Сержпутоўскага, Ісака Сербава і многіх іншых. Аднак заснавальнікам беларускай дыялекталагічнай навукі, як, дарэчы, увогуле ўсёй беларускай філалогіі, справядліва прынята называць Яўхіма Карскага. Менавіта ён першы ажыццявіў гістарычны аналіз развіцця асаблівасцяў беларускай дыялектнай мовы, сабраў неабходныя звесткі пра тэрыторыю яе пашырэння і склаў у 1903 г. дыялекталагічную карту “Беларускія гаворкі”. Асобныя пытанні беларускай дыялекталогіі неаднаразова закраналіся і ў працах рускіх мовазнаўцаў Аляксея Сабалеўскага, Аляксея Шахматава, Васіля Багародзіцкага, Мікалая Дурнаво і інш.

Прыкметнае ажыўленне дыялекталагічных даследаванняў на Беларусі назіраецца ў 20-я гады нашага стагоддзя, што праводзіліся ў межах праграмы камісіі па складанні слоўніка жывой беларускай мовы Інбелкульта. Сярод актыўных працаўнікоў гэтае дзялянкі беларускага мовазнаўства таго часу трэба назваць Пятра Бузука, Івана Бялькевіча, Іосіфа Воўк-Левановіча, Мікалая Каспяровіча, Сцяпана Некрашэвіча, Паўла Растаргуева, Мікалая Шатэрніка і інш. Але на пачатку 30-х гадоў у сувязі з вядомымі палітычнымі падзеямі ў краіне даследаванне беларускай дыялектнай мовы было фактычна спыненае.

Шырокамаштабная і выключна плённая дыялекталагічная праца на Беларусі была разгорнутая пасля Вялікай Айчыннай вайны. Досыць падрабязна даследаваны мясцовыя гаворкі паасобных рэгіёнаў, асобныя граматычныя катэгорыі (назоўнік, прыметнік, займеннік, лічэбнік) і нават асобныя лінгвістычныя раздзелы (словаўтварэнне, сінтаксіс, фанетыка) і г.д. Значныя дасягненні нашых навукоўцаў у галіне беларускай дыялектнай лексікаграфіі і лінгвагеаграфіі. Даследаванні ў гэтых галінах настолькі значныя, што гаварыць аб іх неабходна паасобку.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Тэма 4.2 Паўночна-ўсходні дыялект
(1 гадзіна)

Паўднёвая мяжа паўночна-ўсходняга дыялекту праходзіць прыблізна па лініі ад Свіры на паўночным захадзе да Бягомля і далей на паўднёвы ўсход да Магілёва і Суража Бранскай вобласці.

Ізаглосы асобных моўных з'яў, што выдзяляюць паўночна-ўсходні дыялект, досыць значна вар'іруюць пры набліжэнні да Мінска, а на паўднёвым усходзе – да Бабруйска і Гомеля, г.зн. утвараюць даволі шырокую паласу гаворак, неаднародных

па моўных з'явах.

Дадзеная акалічнасць дае вучоным падставы для адрознага правядзення на паўднёвым усходзе Беларусі мяжы паўночна-ўсходняга дыялекту. Аўтары акадэмічнага падручніка па беларускай дыялекталогіі пад рэд. Р.Аванесава, а таксама пазней Э.Блінава і Е.Мяцельская мяжу паўночна-ўсходняга дыялекту праводзяць прыкладна на поўнач ад г. Сураж Бранскай вобласці, што мяжуе з Краснапольскім раёнам Магілёўскай вобласці і, такім чынам, поўнасцю выключаюць гаворкі ўсходняй Гомельшчыны з гэтага дыялекту.

А.Крывіцкі ў сваіх працах адносіць яе значна далей на захад і часам далучае сюды гаворкі ўсходніх раёнаў Гомельшчыны (напрыклад, Кармянскага, Чачэрскага, Веткаўскага, Добрушскага і іншых раёнаў)

Паўночна-ўсходняму дыялекту беларускай мовы ўласцівы наступныя рысы:

1. Дысімілятыўнае аканне ў першым пераднаціскным складзе пасля цвёрдых зычных. Пры гэтым тыпе акання ў першым складзе перад націскам галосны гук [а] на месцы [а], [о], [е] вымаўляецца тады, калі ў наступным складзе пад націскам знаходзіцца любы галосны гук, акрамя [а]. Калі ж пад націскам выступае [а], то ў першым складзе перад націскам на месцы [а], [о], [е] вымаўляецца не галосны [а], як у літаратурнай мове, а гукі [ы], [ъ].

2. Дысімілятыўнае яканне ў першым пераднаціскным складзе пасля мяккіх зычных, г.зн. вымаўленне гука [і] у першым складзе перад націскам на месцы [а], [о], [е], калі ў наступным складзе пад націскам выступае гук [а]. Калі ж пад націскам любы іншы галосны гук, акрамя [а], то ў першым складзе перад націскам пасля мяккіх зычных на месцы [а], [о], [е] вымаўляецца [а]. Акрамя таго, на частцы тэрыторыі ўсходняй Віцебшчыны пры дысімілятыўным яканні гук [і] выступае не толькі перад нацскным галосным [а], але і перад [е], а гук [а] – перад астатнімі галоснымі пад націскам.

3. Ужыванне ў розных лексіка-граматычных умовах як цвёрдага зычнага гука [р], так і мяккага [р']. Мяккі гук [р'] ужываецца, як правіла, у гаворках усходніх раёнаў Віцебскай і Магілёўскай абласцей.

4. Прыстаўны гук [ь] перад пачатковымі [о], [у]. Дарэчы, падобны пратэтычны зычны [в] ужываецца пры вымаўленні ў названай пазіцыі не толькі ў традыцыйнай лексіцы, але і ў многіх засвоеных гаворкай пазней словах.

5. Падаўжэнне зычных, г.зн. наяўнасць у пэўным становішчы паміж галоснымі гукамі спалучэнняў аднолькавых мяккіх або цвёрдых зычных [с'с'], [з'з'], [дз'дз'], [ц'ц'], [л'л'], [н'н'], [шш], [жж], [чч]. Гэтая фанетычная з'ява мае месца ў становішчы, дзе адпаведны зычны спалучаўся з наступным зычным j [й]. Як і папярэдняя фанетычная асаблівасць, яна адзначаецца не толькі ў традыцыйнай, але і ў новай, запазычанай лексіцы.

6. Асіміляцыя зычных у спалучэнні [дн].

7. Захаванне элементаў цокання, г.зн. ужыванне зычнага гука [ц] на месцы [ч].

8. Наяўнасць формы назоўнікаў жаночага роду ў творным склоне адзіночнага ліку на -ой(-ай).

9. Ужыванне назоўніўкаў ніякага роду ў назоўным склоне множнага ліку з канчаткам -ы(-і).

10. Наяўнасць у прыметнікаў мужчынскага роду назоўнага склону

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

адзіночнага ліку канчаткаў -ый(-ій), -эй(-ей).

11. Супадзенне формаў дзеясловаў першага і другога спражэнняў у трэцяй асобе адзіночнага ліку і ўжыванне іх з канчаткам -ць.

12. Наяўнасць у першай асобе множнага ліку дзеясловаў загаднага ладу канчатка -ом(-ём).

13. Адсутнасць [л'] пасля губнога зычнага асновы ў асабовых формах дзеясловаў першага спражэння.

14. Дзеясловы другога спражэння ў трэцяй асобе множнага ліку не пад націскам маюць канчатак -уць(-юць).

15. Дзеясловы з нерухомым націскам на канчатку ў форме другой асобы множнага ліку маюць канчатак -о(-ё).

16. Часціца -ся ў зваротных дзеясловах.

17. Ужыванне скарочанага суфікса ў інфінітыўных формах дзеяслова.

18. Нетэматычныя дзеясловы даць і есці ў першай асобе множнага ліку абвеснага ладу ўжываюцца з канчаткам -ом(-ём).

19. У канструкцыях з вінавальным склонам, як і ў літаратурнай мове, формы неадушаўлёных назоўнікаў вінавальнага склону супадаюць з назоўным.

20. Асаблівасці ў месцы націску назоўнікаў.

21. Ужыванне спецыфічнай лексікі:

Тэма 4.3 Паўднёва-заходні дыялект (1 гадзіна)

Сучасны падзел беларускай дыялектнай мовы на паасобныя вялікія моўныя адзінкі (дыялекты, групы гаворак, дыялектныя зоны), як мы ўжо пісалі, мае досыць умоўны і прыблізны характар. Прычына, на наш погляд, – у недастатковай даследаванасці розных узроўняў дыялектнай мовы, пастаянным узаемадзеянні яе адзінак (асабліва ў XX ст.), інтэнсіўных міграцыйных працэсах і г.д. Таму пры правядзенні мяжы падзелу на два буйныя дыялекты ўмоўныя арыенціры лініі такога падзелу істотна вагаюцца, але па-ранейшаму традыцыйна сыходзяцца прыблізна на пунктах Ашмяны – Мінск – Бабруйск – Гомель. У межах паўднёва-заходняга дыялекту адны навукоўцы выдзяляюць дзве, другія – тры асобныя групы гаворак. Так, напрыклад, аўтары акадэмічнага дапаможніка па беларускай дыялекталогіі , а таксама Э.Блінава і Е.Мяцельская падзяляюць паўднёва-заходні дыялект на заходнюю (гродзенска-баранавіцкую) і ўсходнюю (слуцка-мазырскую) групы гаворак. А.Крывіцкі вылучае тры групы гаворак: слуцкую, гродзенска-баранавіцкую і мазырскую (усходнепалескую) . Не закранаючы досыць складаных тэарэтычных аспектаў пры разглядзе гэтай групоўкі гаворак, абмяжуемся толькі выкладам асноўных дыялектных рыс дыялекту без указання іх прыналежнасці да пэўнай групы (або групаў) ці, наадварот, усяго апісваемага дыялектнага масіву.

Паўднёва-заходняму дыялекту беларускай мовы ўласцівы наступныя рысы:

1. Недысімілятыўнае аканне ў першым пераднаціскным складзе пасля цвёрдых зычных. Сутнасць гэтай пазіцыйнай фанетычнай з'явы заключаецца ў вымаўленні аднолькавага па выразнасці галоснага гука [а] у ненаціскных складах пасля ўсіх цвёрдых зычных гукаў, а таксама ў пачатку слова і канцавым адкрытым складзе на месцы галосных няверхняга пад'ёму [а], [о], [ô], [е], [ê] (або [а], [о], [е]) незалежна ад якасціщ націскнога галоснага і суседніх зычных.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Такая фанетычная з'ява ў дыялекталагічнай навуцы атрымала назву поўнага недысімілятыўнага акання. Аднак у народных гаворках на паўднёвы захад ад умоўнай лініі Радунь – Ліда – р. Нёман – Капыль – Слуцк – Глуск – р. Пціч этымалагічныя галосныя няверхняга пад'ёму [а], [о], [е] у канцавым адкрытым ненаціскным складзе захоўваюцца. Гэтая з'ява атрымала назву няпоўнага недысімілятыўнага акання.

2. Недысімілятыўнае яканне, пры якім на месцы галосных няверхняга пад'ёму [а], [о], [е] незалежна ад якасці і характару націскнога гука пасля мяккіх зычных у першым складзе перад націскам заўсёды вымаўляецца гук [а]. Вядомы беларускі дыялектолаг А.Крывіцкі лічыць, што "недысімілятыўнае яканне, як і аналагічнае аканне ў дадзеным вымаўленні, з'яўляецца няпоўным. У канцавым адкрытым складзе выступаюць тут не пад націскам галосныя гукі няверхняга пад'ёму [а], [о] і [е].

3. Наяўнасць закрытых галосных гукаў [ê] і [ô]. Гук [ê] адначасова нагадвае галосны [е] і галосны [ы (і)] і нярэдка ўспрымаецца слухачом як паслядоўнае спалучэнне названых галосных гукаў, а ў транскрыпцыі перадаецца яшчэ знакамі [ие], [іе], [ые], якія ў навуковай літаратуры атрымалі назву дыфтонгаў (г.зн. двухгалосныя, складаныя, "здвоеныя" галосныя гукі): л'êс, (л'иес, л'іес), с'л'êд (с'л'иед, с'л'іед), хл'êб (хл'иеб, хл'іеб) і інш. Гук [ô] адначасова нагадвае галосныя гукі [о] і [у], а ў транскрыпцыі перадаецца знакам [уо]: нôс (нуос), м'ôд (м'уод), пôзно (пуозно) і інш.

4. Зацвярдзелая фанема [р].

5. Вымаўленне цвёрдых губных [б], [п], [м], [ў] у спалучэнні з наступным [j] перад [а], [о], [ô] пад націскам. Цвёрды губны [м] у спалучэнні з [j] вымаўляецца таксама і перад націскным [ê] у назоўніках мужчынскага роду: с'êмје, ц'êмје і інш.

6. Адсутнасць падаўжэння зычных. У гэтай пазцыі або вымаўляецца спалучэнне "мяккі ці зацвярдзелы зычны + j" або ўвогуле непадоўжаны зычны гук, што ўзнік у выніку сцяжэння падоўжанага.

7. Наяўнасць прыстаўнога [ɣ] перад пачатковымі націскнымі [о], [у] (нярэдка паралельна з [в]) і пачатковым ненаціскным [а].

8. Ужыванне пад націскам гука [у] у становішчы пасля цвёрдых губных зычных на месцы [ы].

9. Вымаўленне цвердага зычнага [с] у зваротным афіксе дзеясловаў перад галоснымі [а], а таксама [о].

Тэма 4.4 Сярэднебеларускія (пераходныя) і палескія гаворкі (2 гадзіны)

Як вядома, пры вывучэнні тэрытарыяльнага вар'іравання сістэмы дыялектнай мовы ў Беларусі навукоўцы вылучаюць асноўны масіў беларускай мовы і палескую (заходнепалескую, брэсцка-пінскую, загародскую) групу гаворак. Асноўны масіў гаворак уключае тры тыпы дыялектнага маўлення: паўночна-ўсходні (з дзвюма або трыма разнавіднасцямі), паўднёва-заходні (таксама з дзвюма або трыма разнавіднасцямі) і пераходны сярэднебеларускі. З асаблівасцямі першых двух тыпаў вы ўжо пазнаёміліся ў нашых папярэдніх публікацыях. Тут жа паспрабуем акрэсліць асноўны комплекс дыялектных з'яваў, на падставе якіх выдзяляюць палескую і сярэднебеларускую групу гаворак.

Заходнепалеская група гаворак, што досыць істотна адрозніваецца і супрацьпастаўляецца асноўнаму масіву беларускай дыялектнай мовы, цэлым шэрагам своеасаблівых фанетычных з'яваў падзяляецца ў сваю чаргу на асобныя разнавіднасці гэтага маўлення. Да прыкладу, Ф.Клімчук вылучае тут на фанетычным узроўні

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

чатыры тыпы: сярэднезагародскі, паўднёвазагародскі, паўночназагародскі і тараканскі, як1я адрозніваюцца паміж сабою рознай рэалізацыяй галосных [о] (у новых закрытых складах), ['а], [ę], [е], [ь] у націскной пазіцыі. Аднак мы разгледзім толькі асноўныя агульныя асаблівасці заходнепалескага дыялектнага маўлення, не дэталізуючы ягоных вышэйназваных разнавіднасцяў. Такім чынам, для гэтай групы гаворак характэрныя наступныя асаблівасці:

1. Агульнай яркай адметнасцю заходнепалескага маўлення з'яўляецца оканне, г.зн. захаванне ў вымаўленні этымалагічных [о], [э], [а] або, інакш, адсутнасць пераходу ў ненаціскным становішчы [о], [е] у [а]. Зычныя перад галоснымі пярэдняга рада ў гэтых гаворках вымаўляюцца цвёрда, а перад галосным [а] – мякка.

2. Істотна вылучаецца ў заходнепалескіх гаворках характар артыкуляцыі (вымаўлення) галоснага [ы (і)] (у транскрыпцыі традыцыйна прынята абазначаць [и]). У адрозненне ад аналагічнага яму гука [ы] у асноўным масіве беларускай дыялектнай мовы ў заходнепалескіх гаворках пасля цвёрдых зычных гук [и] больш пярэдняга ўтварэння і набліжаецца ў вымаўленні да аналагічнага галоснага пасля мяккіх зычных.

3. Вымаўленне пад націскам галоснага [і] на месцы этымалагічнага (“старога”) [h]: хл'іб, б'ілий, чолов'ік, п'іс'н'а, т'ілo, пойіхати, р'ізаги, на руц'і, на вод'і і інш.

4. Вымаўленне галоснага [і] на месцы этымалагічных [о], [е] у закрытых складах пры адначасовым вымаўленні [о] у гэтай пазіцыі ў адкрытых складах: к'ін' н'іс, п'іч, с'ім, хв'іст, м'іст, ж'інка, тх'ір, в'із, пор'іг.

Спецыфікай **сярэднебеларускага** маўлення з'яўляецца як бы раўнапраўнае суіснаванне ў ім рознадыялектных асаблівасцяў, абумоўленае іх прамежкавым тэрытарыяльным размяшчэннем паміж дзвюма асноўнымі адзінкамі беларускай дыялектнай мовы – паўночна-ўсходнім і паўднёва-заходнім дыялектамі. Яны характарызуюцца спалучэннем як рысаў, уласцівых таму ці іншаму дыялекту беларускай мовы, так і некаторых спецыфічных гібрыдных з'яваў. Паўночная мяжа сярэднебеларускіх гаворак умоўна праходзіць па лініі г. Свір – Бягомль – Магілёў – Касцюковічы – Сураж, а паўднёвая – каля Ліды – р. Нёман – Рэчыцы – Лоева. Для гэтай групы гаворак характэрны наступныя рысы:

1. Ужыванне галоснага [о] у становішчы перад [ў] на месцы галоснага [а]. Дарэчы, дадзеная яркая асаблівасць маўлення характэрна жыхарам заходняй і цэнтральнай частак тэрыторыі сярэднебеларускіх гаворак.

2.Поўнае (моцнае) недысімілятыўнае аканне.

3. Поўнае недысімілятыўнае яканне. Аднак у другім і наступных пераднаціскных складах, а таксама ў складах пасля націску для значнай часткі гаворак характэрна вымаўленне пасля мяккіх зычных гука, блізкага да галоснага [е] (у транскрыпцыі [ае], [еа], [ä] і інш.): б'аеган'іна, б'еаларус, хлоп'аец і інш. У некаторых лексіка-граматычных катэгорыях слоў не пад націскам пасля мяккіх зычных вымаўляецца [і].

4. Наяўнасць падаўжэння мяккіх зычных гукаў і няпарных цвёрдых [ж], [ч], [ш], але адзначаюцца выпадкі вымаўлення непадоўжанага зычнага або захаванне старажытнага спалучэння мяккага (няпарнага цвёрдага) зычнага з [j].

5. Адсутнасць асіміляцыі спалучэнняў гукаў [дн], [дн']

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Тэма 5.1 Адзінства беларускай дыялектнай мовы ў асноўных лексіка-граматычных катэгорыях. Фанетыка
(2 гадзіны)

Гаворкі вядучых дыялектных зон у нацыянальным беларускім моватворчым працэсе ў сувязі з набыццём адпаведнымі рэгіёнамі больш важнай або значнай ролі ў беларускім нацыянальным самавыяўленні і яднанні ўзвышаліся над іншымі гаворкамі беларускай нацыянальнай агульнасці, рабіліся як бы наддыялектнай пераходнай размоўнай ступенню да агульнанароднай літаратурнай мовы.

Апошнія дзесяцігоддзі мінулага стагоддзя і пачатак новага вызначаюцца ўзмацненнем уплыву на нормы беларускай літаратурнай мовы гаворак заходняй дыялектнай зоны беларускай мовы.

Дастаткова выразна выступае гэта ў практыцы яе пісьмовага і вуснага ўжывання як у слоўніку, так і ў граматыцы. І гэта з'яўляецца адным з асноўных кірункаў сучаснага беларускага літаратурнамоўнага развіцця.

Пра адзначаную заходнюю занальную дыялектную аснову сведчаць таксама і намаганні часткі беларускай грамадскасці і моўазнаўцаў па ўвядзенні і замацаванні характэрных асаблівасцей гаворак, мясцовага маўлення заходняй дыялектнай зоны беларускай мовы ў якасці літаратурных нормаў вымаўлення (і адпаведна арфаграфіі), а таксама формаўтварэння і словаўжывання.

Аднак найбольш поўна і шырока ў сучаснай беларускай літаратурнай мове прадстаўлены важнейшыя асаблівасці **паўднёва-заходняга і паўночна-ўсходняга дыялектаў**. З ліку шырока распаўсюджаных **фанетычных** асаблівасцяў **паўднёва-заходняга дыялекту** ў літаратурнай мове прадстаўлены наступныя:

1. Недысімілятыўнае аканне, г.зн. супадзенне гуку [а] галосных няверхняга пад'ёму [а], [о], [э] пасля цвердых і зацвярдзелых зычных у першым складзе перад націскам незалежна ад якасці націскнога галоснага і характару суседніх зычных або склада.

2. Недысімілятыўнае яканне, г.зн. вымаўленне галоснага гука [а] пасля мяккіх зычных у першым складзе перад націскам на месцы [а], [о], [е] незалежна ад якасці націскнога галоснага і характару суседніх зычных.

3. Цвёрдае вымаўленне р, уласцівае большасці беларускіх гаворак.

4. Наяўнасць канчатка -ы (-і) у назоўным склоне адзіночнага ліку прыметнікаў, неасабовых займеннікаў і парадкавых лічэбнікаў мужчынскага роду.

З ліку рэгіянальных **фанетычных** асаблівасцей **паўночна-ўсходняга дыялекту** літаратурная мова засвоіла наступныя:

1. Фанемны склад галосных гукаў а, о, у, ы, і, е (у супраць вагу гаворкам паўднёва-заходняга дыялекту ў літаратурнай мове адсутнічаюць дыфтонгі і закрытыя галосныя о, е).

2. Наяўнасць падоўжаных зычных на месцы старажытнага спалучэння "мяккі зычны + ьj" у пазіцыі перад галосным: зелле, калоссе, каменне, ружжо, сучча, суддзя, палоззе, куцця, зацішша.

3. Аглушэнне звонкіх зычных на канцы слова і ў сярэдзіне слова перад глухімі: [сат], [дз'ет], [ношка], [каска] і азванчэнне глухіх зычных у сярэдзіне

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

слова перад звонкімі: [каз’ба], [проз’ба]. Дарэчы, гэтая фанетычная асаблівасць характэрная таксама і для шэрагу гаворак паўднёва-заходняга дыялекту.

Такім чынам, сучасная беларуская літаратурная мова ў пачатковы перыяд свайго фармавання цалкам абапіралася на структуру тых народных гаворак, у якіх аб’ядналіся найбольш агульныя і пашыраныя рысы буйнейшых дыялектных адзінак – паўднёва-заходняга і паўночна-ўсходняга дыялектаў. Гэта, фактычна, абумовіла дваісты характар нормаў беларускай літаратурнай мовы і ў пэўнай ступені тлумачыць шматлікія ваганні пры выбары яе асобных нормаў.

З гэтага вынікае, што літаратурная мова ўспрыняла ў якасці нормаў тыя рэгіянальныя асаблівасці цэнтральных гаворак, якія характэрныя або для большасці астатніх беларускіх гаворак, або для аднаго з дыялектаў.

Тэма 5.2 Марфалогія. Сінтаксіс. Лексіка. Фразеалогія (2 гадзіны)

Дзякуючы сучасным дыялекталагічным даследаванням гаворак беларускай мовы на аснове іх лінгвагеаграфічнага вывучэння, было вызначана, што станаўленне нормаў беларускай літаратурнай мовы цесна звязана не з дыялектамі, як меркавалася раней, а з дыялектнымі зонамі беларускай мовы. Першапачаткова такой дыялектнай асновай нацыянальнай літаратурнай моватворчасці была паўночна-заходняя дыялектная зона беларускай мовы, гаворкі “ў зоне паміж Вільняй і Мінскам”, у паласе “па лініі Барысаў – Мінск – Маладзечна – Ашмяны”, і гэта занальнае маўленне ў цэлым. Даследчыкі заўважаюць, што ў вызначэнні паўночна-заходняй дыялектнай зоны ў якасці першапачатковай асновы сучаснай беларускай літаратурнай мовы “важным, а магчыма рашаючым, фактарам было тое, што як арганізатары “Нашай нівы” і выдавецтваў, так і першыя буйныя пісьменнікі былі родам з Мінска і яго ваколіц (Ашмяны, Вілейка, Валожын). Таму ўдзел гаворак, якія яны прадстаўлялі (“вілейшчына”, “барысаўшчына”), аказаўся рашаючым”. ”Рашаючы” ўдзел гэтых гаворак, а таксама “рашаючая” арганізацыйная і творчая актыўнасць іх прадстаўнікоў, прынамсі, у сцвярджэнні гаворак паўночна-заходняй дыялектнай зоны ў якасці адзінай асновы нормаў літаратурнай беларускай мовы была, вядома, не выпадковай. Якраз гэта дыялектная зона з’явілася арэнай найбольш вострай агульнаграмадскай польска-руска-беларускай моўнай канфрантацыі і станаўлення беларускай нацыянальнай самасвядомасці ў XIX – пачатку XX стст. Гаворкі адзначанай зоны былі тут як бы на “пярэднім краі” і ў якасці тыповага ўзору і асновы нормаў яе літаратурнай разнавіднасці. Гэтай першапачатковай дыялектнай асновай тлумачыцца адпаведна паўночна-заходняя занальная прырода некаторых яе асаблівасцей і зараз.

У нацыянальным самавыяўленні і з’яднанні беларускага народа ў 20-я гг. XX ст., на пачатку будаўніцтва самастойнай Беларусі, у якасці яе больш уплывовай і больш дзейснай часткі пачынае выступаць на чале з Мінскам як сталіцай яе цэнтральны рэгіён. У якасці асновы ў развіцці беларускай літаратурнай мовы і ў выпрацоўцы яе нормаў пачынае вызначацца адпаведна цэнтральная дыялектная зона беларускай мовы. Аднак гэта было не зменай яе першапачатковай паўночна-заходняй занальнай дыялектнай асновы, а яе значным разгортваннем і пашырэннем.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Гаворкі цэнтральнай часткі тэрыторыі Беларусі, як зазначала Н.Т. Вайтовіч, “ляглі ў аснову літаратурнай мовы невыпадкова”. Яна лічыла, што разам з Мінскам гэта быў адзін з найважнейшых гістарычных цэнтраў фарміравання беларускай нацыі, нацыянальна-вызваленчага руху. Асабліва важнае значэнне гэта частка Беларусі набыла ў савецкі час, калі “Мінск стаў сталіцай Рэспублікі”.

Аднак найбольш поўна і шырока ў сучаснай беларускай літаратурнай мове прадстаўлены важнейшыя **марфалагічныя** асаблівасці паўднёва-заходняга і паўночна-ўсходняга дыялектаў. З ліку шырока распаўсюджаных асаблівасцяў дыялекту ў літаратурнай мове прадстаўлены наступныя:

1. Наяўнасць канчатка -ы (-і) у назоўным склоне адзіночнага ліку прыметнікаў, неасабовых займеннікаў і парадкавых лічэбнікаў мужчынскага роду.

2. Ужыванне займеннікаў гэ́ты, гэ́такі.

3. Адсутнасць канчатка -ць у формах трэцяй асобы адзіночнага ліку дзеясловаў I спражэння і наяўнасць гэтага канчатка ў дзеясловах II спражэння.

4. Паслядоўнае і дакладнае размежаванне формаў трэцяй асобы множнага ліку дзеясловаў I спражэння на -уць (-юць): бяруць, чытаюць і II спражэння на -аць (-яць): косяць, глядзяць.

5. Ужыванне націскнога канчатка -це ў формах другой асобы множнага ліку дзеясловаў абвеснага ладу.

9. Форма дзеясловаў першай асобы множнага ліку загаднага ладу заканчваюцца на -ем, -ма.

10. Выкарыстанне дзеепрыслоўяў на -учы (-ючы), -ачы (-ячы), уласцівае, дарэчы, большасці беларускіх гавораК спяваючы, косячы, несучы.

11. Ужыванне сінтаксічных канструкцый з дзеясловам-выказнікам: Ён пайшоў.

Тэма 6.4 Дыялектная лексікаграфія (2 гадзіны)

У апошнія дзесяцігоддзі ў беларускім мовазнаўстве з’явілася значная колькасць прац, прысвечаных даследаванню разнастайных праблемаў і аспектаў дыялектнай лексікі. Аднак асабліва значныя поспехі шматлікіх навукоўцаў і аматараў роднай мовы звязаны з дыялектнай лексікаграфіяй. Гэтую галіну дыялекталагічнай навукі на сучасным этапе беларускія дыялектолагі прызнаюць асобнай самастойнай галіной, якая мае свае мэты, задачы, прынцыпы і прыёмы навуковага даследавання.

Неабходна адзначыць, што ў працэсе гістарычнага фармавання беларуская дыялектная лексікаграфія прайшла тры асноўныя этапы, якія ўмоўна названыя як этнаграфічны, этналінгвістычны і ўласна дыялектаграфічны. Пачатак этнаграфічнага этапу можна адносіць да першых дзесяцігоддзяў XIX ст., калі распачалася праца па выяўленні, рэгістрацыі і даследаванні беларускага фальклору, этнаграфічных помнікаў і багатай духоўнай культуры. Вывучаючы і занатоўваючы традыцыйны вясковы побыт, заняткі і ўяўленні людзей розных этнадыялектных рэгіёнаў Беларусі, этнографы і фальклярысты запісвалі і народную лексіку, якая называла гэтыя рэаліі і паняцці. Таму з поўным правам у ліку папярэднікаў беларускіх дыялектолагаў як прадстаўнікоў этнаграфічнага этапу называюць Зарыяна Даленгу-Хадакоўскага, Ігната Шыдлоўскага, Паўла

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Баброўскага, Адама Багдановіча, Яна Баршчэўскага, Пятра Бяссонава, Міхаіла Дзмітрыева, Мітрафана Доўнар-Запольскага, Рамуальда Зянькевіча, Адама Кіркора, Казімежа Машынскага, Мікалая Нікіфароўскага, Часлава Пяткевіча, Ісака Сербава, Аляксандра Сержпутоўскага, Міхала Федароўскага, Паўла Чубінскага, Паўла Шэйна, Мікалая Янчука і шэраг іншых. Для больш дакладнага і поўнага разумення этнаграфічных і асабліва фальклорных запісаў яны рыхтавалі спецыяльныя даведнікі да сваіх прац у выглядзе каментараў, індэксаў слоў, падрадковых заўваг і г.д., у якіх тлумачылася значэнне дыялектных слоў жывой беларускай мовы. Аднак у поўным сэнсе пачаткам дыялектнай лексікаграфіі гэта лічыць нельга, бо народнае слова ў працах названых даследчыкаў яшчэ не разглядалася як асобная моўная з'ява і не было аб'ектам спецыяльнага лексікаграфічнага даследавання. Тым не менш фальклорна-этнаграфічныя матэрыялы мінулага – важная, а ў некаторых выпадках і адзіная крыніца звестак па беларускай дыялектнай лексіцы.

Першыя спробы па збіранні дыялектнай лексікі і яе лексікаграфічнай апрацоўцы адносяцца да пачатку XIX ст. Ініцыятарам гэтай работы з'яўляліся вядомыя навуковыя цэнтры таго часу – Віленскі і Маскоўскі універсітэты сумесна з Расійскай Акадэміяй навук. У іх былі распрацаваныя досыць шырокія і змястоўныя праграмы для збірання матэрыялаў па гісторыі і этнаграфіі народаў. Пры гэтым асаблівая ўвага звярталася на неабходнасць фіксацыі мясцовых слоў і вывучэнне жывой народнай гаворкі. Сярод першых запісаў беларускай народнай лексікі неабходна назваць публікацыю Андрэя Меера "Описание Кричевского графства или бывшего староства", дзе побач з гісторыка-этнаграфічным нарысам Усходняй Магілёўшчыны зроблена спроба лінгвістычнай характарыстыкі мовы мясцовага насельніцтва, а таксама прыводзяцца тэматычныя падборкі лексікі агульным памерам больш за 600 слоў. У 1822 г. быў надрукаваны артыкул Канстанціна Калайдовіча "О белорусском наречии", у дадатак да якога прыкладзены "Краткий словарь белорусского наречия" на 67 слоў.

Адносна невялічкі слоўнік спецыфічных беларускіх слоў (каля 250) быў складзены вядомым паэтам і фалькларыстам, выхаванцам Віленскага універсітэта Янам Чачотам (1796 – 1847). Гэта ўжо, у пэўным сэнсе, спецыяльная лексікаграфічная праца, у якой словы апрацаваны больш дасканала і поўна, чым звычайныя лексічныя каментары да тэкстаў. Лексікаграфічная апрацоўка слова ў Я.Чачота была ўзорнай для многіх наступных беларускіх лексікографаў. Аднак найбольш значныя дасягненні беларускай дыялектнай лексікаграфіі на этнаграыічным этапе яе станаўлення звязаныя з дзейнасцю вучоных Маскоўскага універсітэта і Расійскай Акадэміі навук. Адным з першых актыўных збіральнікаў лексікі беларускіх народных гаворак былі Іван Насовіч, Станіслаў Мікуцкі, Павел Шпілеўскі і інш. Так, П.Шпілеўскі (1823 – 1861) за кароткі час многа зрабіў у галіне беларускай этнаграфіі, фальклярыстыкі і мовазнаўства. А яго рукапісны "Словарь белорусского наречия" – самая значная ў беларускім мовазнаўстве лексікаграфічная праца першай паловы XIX ст.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Тема 6.2 Дыялектная фразеаграфія
(2 гадзіны)

Па традыцыі большасць дыялектных слоўнікаў у той ці іншай меры

адлюстроўваюць поруч з лексічным матэрыялам і багатую народную фразеалогію.

Адныя аўтары выкарыстоўваюць яе ў якасці ілюстрацыйнага матэрыялу ў слоўнікавых артыкулах, другія змяшчаюць фразеалагізмы пры канцы працы ў выглядзе невялічкіх самастойных фразеалагічных слоўнічкаў.

Мэтанакіраванае спецыяльнае даследаванне дыялектнай фразеалогіі ў апошнія дзесяцігоддзі прывяло фактычна да выдзялення дыялектнай фразеалогіі ў самастойную галіну лінгвістычнай навукі.

Сёння беларуская дыялектная фразеалогія ўяўляе з сябе не толькі добра тэарэтычна распрацаваную галіну беларусістыкі, але і мае значную колькасць фразеалагічных слоўнікаў, як агульнабеларускіх, так і вузкарэгіянальных.

Не мае аналагаў па аб'ёме сабранага матэрыялу ў адной гаворцы не толькі ў беларускім, але і ў славянскім мовазнаўстве трохтомны збор фразеалогіі Мсціслаўшчыны Георгія Юрчанкі. У ім апісана і растлумачана 16150 устойлівых народных словазлучэнняў, што яскрава ілюструюць багацце экспрэсіўна-эмацыянальнага фонду беларускай мовы, яго значную вобразна-выяўленчую выразнасць, эмацыянальна-экспрэсіўную насычанасць, прастасць граматычнага афармлення.

Гэтаксама ў пэўнай ступені рэгіянальнымі можна лічыць і матэрыялы, сабраныя і апублікаваныя Міхалам Федароўскім у 4-м томе яго "Беларускага люду".

Шырока вядомыя беларускія фразеалагічныя слоўнікі Фёдара Янкоўскага, выкладчыкаў Белдзяржуніверсітэта Еўдакіі Мядельскай і Яўгена Камароўскага, Яўгена Рапановіча, Зміцера Санько і інш. Апошнім часам апублікаваны новыя цікавыя зборнікі беларускай народнай фразеалогіі Васіля Ліцвінкі і Леаніда Царанкова, Валянціна Рабкевіча, Івана Лепешава, а таксама слоўнік беларускіх прыказак і прымавак, ужытых у творах мастацкай літаратуры, Рыгора Шкрабы і Ірыны Шкрабы.

Другі выключна важны і прадуктыўны кірунак навуковых даследаванняў рэгіянальнай лексікі – устанаўленне геаграфіі слоў у іх структурных і семантычных варыянтах, а таксама іх узаемнага тэрытарыяльнага размяшчэння. Гэтая лінгвагеаграфічная дзейнасць не толькі мае магчымасць выяўляць нефіксаваную раней лексіку, вызначаць і ўдакладняць межы лексічных арэалаў, але і стварае спецыяльныя магчымасці для знаходжання і інтэрпрэтацыі беларуска-іншамоўных лексічных паралеляў, што мае выключна важнае значэнне для сучаснай беларускай лінгвістычнай навукі. Першымі лінгвагеаграфічнымі даследаваннямі, у якіх адлюстравана лексіка беларускіх гаворак, з'яўляецца праца Ё.Тарнацкага і дыялекталагічны атлас беларускай мовы. Аднак найбольш цесна і непасрэдна звязаны з асноўнымі задачамі і мэтамі сучаснай беларускай лінгвагеаграфіі (а гэта азначае і лексікаграфіі) Лексічны атлас беларускіх народных гаворак (ЛАБНГ). Ідэя стварэння атласа выспела яшчэ ў канцы 60-х гг. Цяпер завяршаецца выданне атласа, які з'яўляецца першай падобнай агульнанацыянальнай працай ва ўсходніх славянаў і змяшчае вялікую колькасць новага, дагэтуль невядомага лексічнага матэрыялу. Значныя і каштоўныя лексічныя скарбы назапашаныя ў архіве "Этналінгвістычнага атласа Палесся", працай над якім кіраваў акадэмік Мікіта Талстой (Масква). На жаль, пасля катастрофы на ЧАЭС завяршэнне збору матэрыялаў прыпынена, а сабраныя звесткі актыўна выкарыстоўваюцца ў розных лексікаграфічных і лексікалагічных даследаваннях. Вялікая колькасць рэгіянальнай лексікі назапашана і пачата яе

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

публікацыя ў “Атласе ўсходнеславянскіх гаворак Беласточчыны” і “Агульнаславянскім лінгвістычным атласе”. Значны і каштоўны лексічны матэрыял сабраў вядомы ўкраінскі даследчык Палесся Мікола Ніканчук. У яго серыі лінгвагеаграфічных працаў па палескай лексіцы змешчаны вялікі лексічны збор і з тэрыторыі Беларусі. Невялікая колькасць лексічных картаў уключана таксама ў рэгіянальны атлас гаворак ніжняй Прыпяці Таццяны Назаравай.

Зразумела, што збіранне і каталагізацыя беларускага дыялектнага лексічнага матэрыялу яшчэ не завершаны і будуць надалей інтэнсіўна прадаўжацца. Маецца шэраг ініцыятыўных збораў лексікі ў выглядзе рукапісных слоўнікаў паасобных мясцінаў Беларусі, распачатая праца над некаторымі рэгіянальнымі мікраатласамі.

Тема 7 Дыялектная аснова літаратурнай мовы (1 гадзіна)

Гісторыя фармавання пераважнай большасці нацыянальных літаратурных моваў пачыналася звычайна з ужывання жывой народнай мовы ў пісьмовых зносінах, з узнікнення на гэтай мове ў першую чаргу літаратурных твораў, а таксама іншых пісьмовых дакументаў, што сведчыла аб абуджэнні нацыянальнай самасвядомасці народа, аб яго моцным і шчырым імкненні да нацыянальнага адзінства і самастойнасці ў гістарычным развіцці. Як вядома, узнікненне пісьмовай мовы на глебе народнай мовы само па сабе не стварае моўнага адзінства. Але пачатак пісьмовых зносінаў найбольш востра ставіць пытанне аб неабходнасці такога адзінства, аб неабходнасці пошукаў шляхоў да моўнай агульнасці ў межах пісьменства.

Сучасныя нацыянальныя літаратурныя мовы, у тым ліку і сучасная беларуская літаратурная мова, – гэта досыць новыя па сваёй прыродзе і функцыях з’явы моўнай культуры народаў. І таму яны істотна адрозніваюцца не толькі ад гаворак, але і ад старажытных пісьмовых моваў. Дастаткова заўважыць, што ранейшыя пісьмовыя мовы ў многіх народаў былі чужымі, запазычанымі і не маглі задавальняць у поўнай меры патрэбы грамадства (да прыкладу, лаціна ў еўрапейскіх народаў або арабская мова ў многіх краінах Азіі).

У навуковай літаратуры прынята называць старажытныя пісьмовыя мовы, як і сучасныя, літаратурнымі мовамі. Пад тэрмінам ‘літаратурная’ маецца на ўвазе не толькі тое, што тая ці іншая моўная сістэма служыць сродкам пісьмовых зносін, абслугоўвае перш за ўсё патрэбы літаратуры, пісьменнасці, але і тое, што гэтая моўная сістэма з’яўляецца агульнай для ўсяго народа. Агульнай па сваёй ролі і функцыях. Таму старыя пісьмовыя мовы поўнасцю адпавядаюць назве літаратурныя і ў падобным разуменні нічым не адрозніваюцца ад сучасных літаратурных моваў.

Паняцце агульнанароднасці мовы па сваёй ролі непазбежна патрабуе таго, каб гэтая мова мела прызнаную ўсім народам аснову і сама выяўляла і замацоўвала ў сваіх нормах вынікі гістарычнага працэсу яе складвання. Але ў перыяд драбнення моўнага адзінства народаў па старых (этнічных, або племянных) і розных новых (гаспадарчых, палітычных і падобных да іх) межах пісьмовая мова не магла мець пад сабою цвёрдай, устойлівай глебы ў выглядзе агульнанароднай мовы, а таксама выразна акрэсленай перспектывы ў развіцці. Таму старажытныя пісьмовыя мовы з’яўляюцца, як правіла, выключна кансерватыўнымі і досыць далёкімі ад жывой народнай мовы. Звычайна іх моўная сістэма ўяўляе з сябе стракатую сумесь самых

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

разнастайных па паходжанні і прыналежнасці элементаў. У выніку старажытныя пісьмовыя мовы не маглі атрымаць і не атрымалі такога шырокага ўжытку, як сучасныя літаратурныя мовы. Старажытныя літаратурныя мовы забяспечвалі ў асноўным міждзяржаўныя зносіны і рэлігійныя патрэбы грамадства.

Пасля страты Вялікім Княствам Літоўскім сваёй незалежнасці і аб'яднання яго з Каралеўствам Польскім (1696 г.) паступова пачала губляць сваю агульнаграмадскую ролю і тагачасная старабеларуская літаратурная мова. Толькі частка уніяцкага духавенства прадаўжала ўжываць яе ў набажэнстве і часам друкавала на ёй рэлігійныя кнігі і асобныя лісты канфесійнага зместу на працягу XVIII – пачатку XIX ст., ажно да забароны царскім урадам самога уніяцтва. Падчас барацьбы з уніяцтвам па загадзе ўладаў былі сабраныя і спаленыя важнейшыя уніяцкія выданні. З гэтай прычыны сёння няма магчымасці скласці хоць нейкае ўяўленне аб кірунку развіцця гэтай старой літаратурнай мовы ў канфесійнай (уніяцкай) сферы. Аднак галоўнага становішча мовы гэта не змяніла: яна ў афіцыйных зносінах фактычна перастала існаваць. У гэты час беларускай мовай у яе дыялектнай форме карысталася толькі сялянства, блізкая да яго па сваім сацыяльным становішчы дробная шляхта, жыхары мястэчак і ніжэйшыя слаі насельніцтва буйных гарадоў. Працягваў развівацца на роднай мове фальклор.

Першыя мастацкія творы на сучаснай беларускай літаратурнай мове пачалі з'яўляцца на пачатку XIX ст. Аднак характэрнай асаблівасцю першапачатковага этапу фармавання сучаснай беларускай літаратурнай мовы з'яўлялася адсутнасць у яе адзінай дыялектнай асновы. Мастацкія творы гэтага перыяду мелі ў мове відавочныя прыкметы (асаблівасці) той гаворкі, якая была роднай для іх аўтараў. Каб пераканацца ў гэтым, дастаткова прыгадаць ананімныя творы XVIII – пачатку XIX ст., а таксама творы беларускіх пісьменнікаў таго часу Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча, Францішка Багушэвіча, Янкі Лучыны, Альгерда Абуховіча. Сведчаннем свядомага ўвядзення мясцовых дыялектызмаў у літаратурны ўжытак можа служыць адказ А.Абуховіча на папрок Ф.Багушэвіча за ўжыванне неўласцівых беларускай мове "акцэнтаў", г.зн. націскаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Тема 8 Дыялекталогія і выкладанне роднай мовы і літаратуры ў школе (1 гадзіна)

Гаворкі беларускай мовы, дыялекталагічныя зборы іх лексікі і фразеалагічных сродкаў, асабліва найбольш поўныя (буйныя рэгіянальныя слоўнікі, лексічныя атласы), з'яўляюцца крыніцай для таямніц матэрыяльнай і духоўнай культуры беларускага народа.

Напрыклад, вясёлка як абазначэнне вядомай з'явы прыроды – гэта вынік першапачатковага збліжэння яе з поясам, у прыватнасці з паравяслам у снапах, пра што сведчаць адзначаныя ў ДАБМ беларускія дыялектныя назвы перавясёлка, перавясло

Харомы – гэта калісьці, відаць, не раскошныя жылыя пабудовы, а проста часова ўзведзеныя сховы ад дажджу, ветру і інш. На гэта ўказвае тое, што ў гаворках Палесся адзначанае слова мае значэнне любой гаспадарчай пабудовы. Адрына – назва сведчыць пра тое, што першапачаткова падобны будынак быў неяк звязаны з адром, - паўднёвабеларускім найменнем памоста (пад стог сена або збажыны, пад вуллі на дрэве).

Вялікую каштоўнасць уяўляюць матэрыялы па дыялекталогіі беларускай мовы і для анамастыкі (ад грэч. onomastikē) – навукі аб разнастайных геаграфічных назвах, аб прозвішчах і мясцовых празваннях людзей і аб іншых так званых уласных назвах. Многія з такіх назваў складаліся, натуральна, на аснове агульных слоў гаворак адпаведнага рэгіёна, і іх паходжанне і ўнутраны сэнс могуць быць раскрыты толькі зыходзячы з гэтага.

На базе беларускіх дыялекталагічных матэрыялаў па слоўніку гаворак раскрываецца і даказваецца мясцовае паходжанне і першапачатковы сэнс тых слоў, якія былі, відаць, спачатку асабовымі імёнамі людзей, а потым і асновай такіх вядомых беларускіх прозвішчаў, як Гілевіч (гіль – назва птушкі снягір на паўночным захадзе Беларусі), Пруднікаў, Запруднік (пруд – стаў на рацэ і вадзяны млын і, адпаведна, прудник – млынар на ўсходзе Беларусі), Гарлачоў (гарлач – збанок для малака, таксама ўсход Беларусі), Лашко, Ляшко, Ляшкевіч (лашук, лашак, лоша, лашыца – дарослае жарабя, паўднёвы ўсход Беларусі), Вярэніч (вярэня – сплеценая з лыка кайстра, Палессе) і інш. Падобным чынам тлумачацца сотні адносна цёмных па паходжанні беларускіх прозвішчаў.

Без матэрыялаў дыялекталогіі беларускай мовы немагчыма было б растлумачыць належным чынам і паходжанне многіх геаграфічных назваў Беларусі.

Так, ад дыялектнай беларускай назвы мокрага балота бель паходзяць шматлікія назвы паселішчаў тыпу Беліца, Бель, Бялёў і інш. У мясцовых гаворках Беларусі адшукана тлумачэнне такіх назваў паселішчаў, як Альса (алёс, альса – забалочаны лісцёвы лес), Мерач, Морач (мярэча, морач – глухія зарасці ў лесе), Смуга, Засмужжа (смуга, смужавіна – нешырокая сточная далінка ў лесе), Языль, Язоўка, Езва, Язавінь (яз, ез – плот, якім перагароджваецца рэчка, з праходам у сярэдзіне для стаўных пастак на рыбу).

Узніклі на аснове дыялектных слоў і шматлікія мікратапанімічныя назвы. Мікратапанімія (ад грэч. mikros – малы, tópos – мясціна, ónyma – імя) – сукупнасць назваў дробных геаграфічных аб’ектаў і навука, якая вывучае мікратапанімію аб’ектаў: палёў, лясоў, сенажацяў, балот, лугоў, дарог, пашаў, урочышчаў і інш. Вось некаторыя сабраныя на Случчыне Я. М. Адамовічам і прыведзеныя ў яго працы “Мікратапанімічныя назвы” (1971 г.) назвы: Баброўня – сенажаць, ад бабро ўня ‘мясціна на рацэ, дзе вадзіліся бабры’, Жара – поле, ад жа ра ‘вапна’, Круховы – поле, ад кру ха ‘крушына’, Пель – азярцо, ад пель ‘нізіна сярод поля, звычайна круглая або авальная’; пе лька ‘палонка’, Плюсішча – лес, ад плюс ‘грыб, казляк’.

Такім чынам, сувязь тапаніміі і дыялекталогіі відавочная: шматлікія тапанімічныя назвы ўваходзяць у сістэму дыялектнай лексікі і бытуюць у жывой гаворцы. З аднаго боку, тапонімы, утвораныя ад дыялектных слоў, даюць багаты і надзейны матэрыял пры вывучэнні гістарычнай дыялекталогіі, з другога – дыялекталогія дапамагае выявіць крыніцу ўзнікнення таго або іншага тапоніма.

Як вядома, асноўная задача настаўніка-мовазнаўца – навучыць вучняў свабодна і правільна выкладаць свае думкі ў пісьмовай і вуснай форме, дапамагчы ім авалодаць багаццем літаратурнай мовы. З гэтай задачай цяжка справіцца, калі настаўнік не вызваліўся ад дыялектызмаў у сваёй мове, калі ён не ведае асноў дыялекталогіі, не можа заўважыць у мове вучняў дыялектных асаблівасцей, адрозніць іх ад недыялектных. Таму настаўніку неабходны звесткі па ўсіх раздзелах дыялекталогіі: лексіцы і фразеалогіі, фанетыцы і граматыцы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

II. ПРАКТЫЧНЫ РАЗДЗЕЛ

1. ТЭМАТЫКА СЕМІНАРСКІХ ЗАНЯТКАЎ

Тэма 1. Дыялекталогія як раздзел мовазнаўства

1. Дыялекталогія як лінгвістычная навука.
2. Сістэма навуковых паняццяў у дыялекталогіі.
3. Сістэма і структура дыялектнай мовы.
4. Тэрытарыяльныя і сацыяльныя дыялекты.
5. Раздзелы дыялекталогіі, аб'ект вывучэння кожнага раздзела.
6. Асноўныя перыяды гісторыі беларускай дыялекталогіі.
7. Крыніцы вывучэння беларускай дыялектнай мовы.
8. Метады і методыка збору дыялектнага матэрыялу.
9. Фанетычны алфавіт.
10. Навуковае і практычнае значэнне дыялекталогіі.
11. З гісторыі беларускай дыялекталогіі.

Літаратура

1. Крывіцкі, А.А. Дыялекталогія беларускай мовы / А.А. Крывіцкі // – Мінск: Вышэйшая школа, 2003. – С. 5 – 35.
2. Мяцельская, Е.С., Блінава, Э.Д. Беларуская дыялекталогія: Практыкум / Е.С. Мяцельская, Э.Д. Блінава // – Мінск: Вышэйшая школа, 1991. – С. 5 – 31.
3. Міхайлаў, П.А. Што сяльцо, то і слаўцо: Дыялекталогія як раздзел мовазнаўства // Роднае слова, 1995, N9, С.38-45.

Тэма 2. Лінгвістычная геаграфія

1. Лінгвагеаграфія як лінгвістычная навука.
2. Сістэма навуковых паняццяў у лінгвагеаграфіі.
3. Тыпы дыялектных адрозненняў.
4. Лінгвістычны (дыялекталагічны) атлас.
5. Узнікненне лінгвагеаграфіі. Першыя лінгвагеаграфічныя працы.
6. Станаўленне лінгвагеаграфіі ва ўсходніх славянаў.

Літаратура

1. Крывіцкі, А.А. Дыялекталогія беларускай мовы / А.А. Крывіцкі // – Мінск: Вышэйшая школа, 2003. – С. 135 – 157.
2. Мяцельская, Е.С., Блінава, Э.Д. Беларуская дыялекталогія: Практыкум / Е.С. Мяцельская, Э.Д. Блінава // – Мінск: Вышэйшая школа, 1991. – С. 32 – 47.
3. Міхайлаў, П.А. Панарама роднай мовы або Што такое лінгвагеаграфія // Роднае слова, 1995, N11, С.49-53; N12, С.72-75.

Тэма 3. Групоўка беларускіх гаворак

1. З гісторыі фарміравання беларускіх тэрытарыяльных дыялектаў.
2. Першыя спробы класіфікацыі беларускіх гаворак (Я. Чачот, І. Насовіч, А. Сабалеўскі, А. Шахматаў).

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

3. Групоўка беларускіх гаворак Я.Ф. Карскім і Маскоўскай дыялекталагічнай камісіяй (МДК, 1915).
4. Пытанні групоўкі беларускіх гаворак у працах М. Дурнаво.
5. Лінгвагеаграфічныя даследаванні П.А. Бузука і іх значэнне ў станаўленні і развіцці айчыннай лінгвагеаграфіі.
6. Сучасная групоўка беларускіх гаворак на падставе “Дыялекталагічнага атласа беларускай мовы” (ДАБМ, 1963).
7. Асноўныя прынцыпы групоўкі беларускіх гаворак у сучаснай лінгвагеаграфіі.

Літаратура

1. Крывіцкі, А.А. Дыялекталогія беларускай мовы / А.А. Крывіцкі // – Мінск: Вышэйшая школа, 2003. – С. 36 – 135.
2. Мяцельская, Е.С., Блінава, Э.Д. Беларуская дыялекталогія: Практыкум / Е.С. Мяцельская, Э.Д. Блінава // – Мінск: Вышэйшая школа, 1991. – С. 187 – 220.

Тэма 4. Паўночна-ўсходні дыялект

1. Тэрыторыя пашырэння паўночна-ўсходняга дыялекту.
2. Асноўныя фанетычныя рысы гаворак.
3. Марфалагічныя асаблівасці мясцовага маўлення.
4. Сінтаксічныя і лексічныя адметнасці гаворак паўночна-ўсходняга дыялекту.
5. Розныя падыходы навукоўцаў да групоўкі гаворак паўночна-ўсходняга дыялекту.
6. Групы гаворак у складзе паўночна-ўсходняга дыялекту.

Літаратура

1. Крывіцкі, А.А. Дыялекталогія беларускай мовы / А.А. Крывіцкі // – Мінск: Вышэйшая школа, 2003. – С. 160 – 197.
2. Мяцельская, Е.С., Блінава, Э.Д. Беларуская дыялекталогія: Практыкум / Е.С. Мяцельская, Э.Д. Блінава // – Мінск: Вышэйшая школа, 1991. – С. 191 – 196.
3. Міхайлаў, П.А. Якеў бальшэй маліц вырас і такі агура…: Асаблівасці паўночна-ўсходняга дыялекту беларускай мовы // Роднае слова, 1996, N3, С.61-67.

Тэма 5. Паўднёва-заходні дыялект

1. Тэрыторыя пашырэння паўднёва-заходняга дыялекту.
2. Асноўныя фанетычныя рысы гаворак.
3. Марфалагічныя асаблівасці мясцовага маўлення.
4. Сінтаксічныя і лексічныя адметнасці гаворак паўднёва-заходняга дыялекту.
5. Розныя падыходы навукоўцаў да групоўкі гаворак паўднёва-заходняга дыялекту.
6. Групы гаворак у складзе паўднёва-заходняга дыялекту.
7. Месца палескай групы гаворак у складзе паўднёва-заходняга дыялекту.

Літаратура

1. Крывіцкі, А.А. Дыялекталогія беларускай мовы / А.А. Крывіцкі // – Мінск: Вышэйшая школа, 2003. – С. 160 – 180.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

2. Мяцельская, Е.С., Блінава, Э.Д. Беларуская дыялекталогія: Практыкум / Е.С. Мяцельская, Э.Д. Блінава // – Мінск: Вышэйшая школа, 1991. – С. 191 – 196.
3. Міхайлаў, П.А. Рабі пільня, та й тут будзя Вільня: Асаблівасці паўднёва-заходняга дыялекту беларускай мовы // Роднае слова, 1996, N4, С.87-95.

Тэма 6. Сярэднебеларускія (пераходныя) гаворкі.

1. Тэрыторыя пашырэння сярэднебеларускіх гаворак.
2. Моўныя рысы розных узроўняў паўднёва-заходняга дыялекту ў складзе сярэднебеларускіх гаворак.
3. Моўныя рысы розных узроўняў паўночна-ўсходняга дыялекту ў складзе сярэднебеларускіх гаворак.
4. Спецыфічныя моўныя рысы сярэднебеларускіх гаворак.

Літаратура

1. Крывіцкі, А.А. Дыялекталогія беларускай мовы / А.А. Крывіцкі // – Мінск: Вышэйшая школа, 2003. – С. 197 – 230.
2. Мяцельская, Е.С., Блінава, Э.Д. Беларуская дыялекталогія: Практыкум / Е.С. Мяцельская, Э.Д. Блінава // – Мінск: Вышэйшая школа, 1991. – С. 193 – 197.
3. Міхайлаў, П.А. Ні капоўшы студні вады ні піць…: Асаблівасці сярэднебеларускіх і заходнепалескіх гаворак // Роднае слова, 1996, N8, С.38-49.

Тэма 7. Беларуская дыялектная мова

1. Адзінства беларускай дыялектнай мовы ў асноўных лексіка-граматычных катэгорыях.
2. Агульнасць асноўных асаблівасцей фанетычнай сістэмы беларускіх гаворак.
3. Тры тыпы тэрытарыяльных адрозненняў на фанетычным узроўні.
4. Дзве вакалічныя сістэмы беларускай дыялектнай мовы.
5. Супрацьпастаўленне зычных у беларускіх гаворках.
6. Рэгулярныя фанетычныя змены ў беларускай дыялектнай мове.
7. Колькасная і якасная рэдукцыя галосных у беларускіх гаворках.

Літаратура

1. Мяцельская, Е.С., Блінава, Э.Д. Беларуская дыялекталогія: Практыкум / Е.С. Мяцельская, Э.Д. Блінава // – Мінск: Вышэйшая школа, 1991. – С. 48 – 180.

Тэма 8. Дыялектная лексікаграфія і фразеаграфія

1. Дыялектаграфія як самастойны раздзел беларускай апісальнай дыялекталогіі, яе мэты, задачы, прынцыпы і прыёмы навуковага даследавання.
2. Тры асноўныя этапы ў гісторыі беларускай дыялектнай лексікаграфіі.
3. Этнаграфічны этап, яго храналагічныя межы і асаблівасці.
4. Этналінгвістычны этап у гісторыі беларускай дыялектаграфіі.
5. Адметнасці дыялектаграфічнага этапу ў беларускай дыялектнай лексікаграфіі.
6. Лексікаграфічная праграма Інстытута беларускай культуры (Інбелкульта) і вынікі яе рэалізацыі.

Літаратура

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

1. Крывіцкі, А.А. Дыялекталогія беларускай мовы / А.А. Крывіцкі // – Мінск: Вышэйшая школа, 2003. – С. 230 – 236.
2. Мяцельская, Е.С., Блінава, Э.Д. Беларуская дыялекталогія: Практыкум / Е.С. Мяцельская, Э.Д. Блінава // – Мінск: Вышэйшая школа, 1991. – С. 181 – 186.
3. Міхайлаў, П.А. Васільковая спадчына прадзедаў: Беларуская дыялектная лексікаграфія // Роднае слова, 1996, N11, С.72-76; N12, С.94-105.

Тэма 9. Дыялектная аснова літаратурнай мовы

1. Роля беларускіх гаворак у фарміраванні сучаснай беларускай літаратурнай мовы.
2. Агульнабеларускія моўныя асаблівасці, што замацаваліся ў літаратурнай мове.
3. Фанетычныя і граматычныя рысы паўднёва-заходняга дыялекту, якія сталі нормай літаратурнай мовы.
4. Фанетычныя і граматычныя рысы паўночна-ўсходняга дыялекту, што замацаваліся ў якасці нормы літаратурнай мовы.
5. Значэнне сярэднебеларускіх гаворак у станаўленні літаратурнай мовы і яе нормаў.

Літаратура

1. Крывіцкі, А.А. Дыялекталогія беларускай мовы / А.А. Крывіцкі // – Мінск: Вышэйшая школа, 2003. – С. 275 – 281.
2. Міхайлаў, П.А. Роднай мовы кашуля хрэсьбяная… Дыялектная аснова літаратурнай мовы // Роднае слова, 1996, N12, С.42-49.

Тэма 10. Метады даследавання дыялектнай мовы

1. Непасрэднае назіранне як асноўны метад вывучэння дыялектнага маўлення.
2. Анкетны метад.
3. Экспедыцыйны метад.
4. Выкарыстанне тэхнічных сродкаў для запісу дыялектных матэрыялаў.
5. Апрацоўка сабранага дыялектнага матэрыялу, яго пашпартызацыя, каталагізацыя і захоўванне.
6. Праграмы (інструкцыі) для збірання дыялектнага матэрыялу і іх тыпы.

Літаратура

1. Крывіцкі, А.А. Дыялекталогія беларускай мовы / А.А. Крывіцкі // – Мінск: Вышэйшая школа, 2003. – С. 29 – 34.

Тэма 11. Дыялекталогія і выкладанне роднай мовы і літаратуры ў школе

1. Дыялектная аснова мовы вучняў і засваенне нормаў літаратурнай мовы.
2. Дыферэнцыяльны падыход да выкладання роднай мовы ў дыялектных умовах.
3. Назіранні вучняў за дыялектнымі асаблівасцямі мясцовай гаворкі.
4. Дыялектызмы ў творах беларускіх пісьменнікаў.
5. Арганізацыя ў кабінеце беларускай мовы кутка “Родная гаворка”.

Літаратура

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

1. Крывіцкі, А.А. Дыялекталогія беларускай мовы / А.А. Крывіцкі // – Мінск: Вышэйшая школа, 2003. – С. 281 – 284.

Тэма 12. З гісторыі беларускай дыялекталогіі

1. Станаўленне і развіццё беларускай дыялекталогіі ў 19 – пачатку 20 стст.
2. Адлюстраванне асаблівасцей беларускіх гаворак у фальклорных і этнаграфічных працах першай паловы 19 ст.
3. Адметнасці беларускіх гаворак у працах этнографаў і фальклярыстаў другой паловы 19 – пачатку 20 стст.
4. Апісанне беларускай дыялектнай мовы ў працах Я.Ф. Карскага.
5. Развіццё беларускай дыялекталогіі ў паслякастрычніцкі перыяд (20 – 40 гады 20 ст.).
6. Дыялекталагічныя даследаванні ў другой палове 20 – пачатку 21 стст.
7. Вывучэнне беларускай дыялектнай мовы замежнымі навукоўцамі.

Літаратура

1. Крывіцкі, А.А. Дыялекталогія беларускай мовы / А.А. Крывіцкі // – Мінск: Вышэйшая школа, 2003. – С. 36 – 135.
2. Мяцельская, Е.С., Блінава, Э.Д. Беларуская дыялекталогія: Практыкум / Е.С. Мяцельская, Э.Д. Блінава // – Мінск: Вышэйшая школа, 1991. – С. 221 – 256.

2. САМАСТОЙНАЯ КІРУЕМАЯ РАБОТА СТУДЭНТАЎ

Для павышэння якасці прафесійнай падрыхтоўкі будучых настаўнікаў-філолагаў мэтазгодна на працягу ўсяго тэрміну навучання ў ВНУ прыцягваць кожнага студэнта да сістэматычнай самастойнай работы. Змест і формы самастойнай работы студэнтаў распрацоўваюцца супрацоўнікамі кафедры ў адпаведнасці з мэтамі і задачамі адукацыйнага стандарту.

Матэрыял, рэкамендаваны для самастойнага вывучэння, студэнты павінны атрымліваць ад выкладчыка з першых тыдняў семестра. Матэрыял для самастойнай працы распрацаваны выкладчыкамі кафедры, можа ўключаць комплексы індывідуальных заданняў па пэўных тэмах, сістэму індывідуальных дамашніх кантрольных работ па тэмах і раздзелах дысцыпліны.

Эфектыўнасць самастойнай працы студэнтаў залежыць ад многіх фактараў. Тут і аптымальны выбраная форма працы, і дакладныя, канкрэтныя ўказанні і рэкамендацыі выкладчыка з наступнай аб’ектыўнай ацэнкай яе вынікаў і, самае важнае, сістэматычнасць і паслядоўнасць у правядзенні такой працы.

Тэксты для самастойнага чытання і вывучэння, канспектавання і рэферыравання, метадычныя ўказанні па напісанні рэферата, кантрольныя тэсты і заданні для самастойнай працы студэнтаў прадстаўлены ў кнізе: Мяцельская, Е. С. Беларуская дыялекталогія: Практыкум / Е. С. Мяцельская, Э. Д. Блінава. - Мінск, 1991. - 287 с.

Модуль	Тэксты для самаст. чытання і	Кантрольныя тэксты	Заданні для самаст. работы

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

	вывучэння		
Модуль 1. Прадмет і задачы дыялекталогіі	Стр. 11-31, 36-50	Стр. 51-57	Стр. 58-60
Модуль 2. Групоўка гаворак на тэрыторыі Беларусі	Стр. 72-88, 97-112, 125-145, 157-172	Стр. 173-188	Стр. 189-192
Модуль 3. Заходнепалескія гаворкі як асобны структурны тып	Стр. 196-208, 212-230	Стр. 231-236	Стр. 237-238

У дапаможніку прадстаўлены тэмы рэфератаў да кожнага практычнага занятку, а таксама падаюцца тэксты для канспектавання і рэфірыравання:

1) І.Я.Яшкін. Узаемадзеянне рознадыялектных сістэм. Мн., 1976, с.28-62;

2) Вайтовіч Н.Т. Ненаціскны вакалізм народных гаворак Беларусі. Мн., 1968, с. 10-55;

3) М.А.Жыдовіч. Назоўнік у беларускай мове. Мн., 1969, с. 15-44.

ПРЫКЛАДНЫ ПЕРАЛІК ЗАДАННЯЎ КІРУЕМАЙ САМАСТОЙНАЙ РАБОТЫ СТУДЭНТАЎ

Тэма 7 Дыялектная аснова літаратурнай мовы – 4 гадзіны (практычныя)

Заданне:

1 модуль складанасці – на аснове падручніка (Мяцельская, Е. С. Беларуская дыялекталогія: Практыкум / Е. С. Мяцельская, Э. Д. Блінава. - Мінск, 1991. - 287 с.) складзіце план адказаў на пытанні.

1. Ці ёсць адрозненні ў сістэме зычных гаворкі і літаратурнай мовы?.
2. Як перадаюцца ў гаворках пярэднеязычныя санорныя [р] і [р']? Як называюцца такія гаворкі?
3. Як перадаюцца пярэднеязычныя афрыкаты [дз'] — [ц'] і змычныя [д(д')| і [т(т')]?
4. Як перадаюцца пярэднеязычныя шыпячыя [ж], [ч], [ш] і афрыкаты [дж], [ц]?
5. Як перадаюцца губныя фанемы [б] — [б'], [в] — [в'], [м] - [м'], [п] - [п']?
6. Ці ўласцівы фанемы [ф] — [ф'] сістэме кансанантызму беларускай мовы?

2 модуль складанасці – выканайце заданні 7-12 з практыкума (Мяцельская, Е. С. Беларуская дыялекталогія: Практыкум / Е. С. Мяцельская, Э. Д. Блінава. - Мінск, 1991. - 287 с.): складзіце апорныя схемы «Асаблівасці гаворак у склоне», «Асаблівасці гаворак у склоне», «Дыялектныя канчаткі назоўнікаў адзіночнага і множнага ліку ўсіх тыпаў скланення», запоўніце табліцы «Несупадзенне назоўнікаў у родзе»,«Скланенне рознаскланяльных назоўнікаў».

3 модуль складанасці – падрыхтуйце праект «Фанетыка і марфалогія дыялектнай мовы» і абараніце яго.

Тема 8. Дыялекталогія і выкладанне роднай мовы і літаратуры ў школе – 2 гадзіны (лекцыйныя)

Заданне:

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

1 модуль складанасці – на аснове падручніка (Мяцельская, Е. С. Беларуская дыялекталогія: Практыкум / Е. С. Мяцельская, Э. Д. Блінава. - Мінск, 1991. - 287 с.) складзіце кароткі канспект па пытаннях

1. Дыялектная аснова мовы вучняў і засваенне нормаў літаратурнай мовы.
2. Патрабаванні школьных праграм да культуры вуснай і пісьмовай мовы вучняў.

2 модуль складанасці – падрыхтуйце рэферат па адной з прапанаваных тэмаў.

1. Выяўленне і класіфікацыя дыялектных адхіленняў у вуснай і пісьмовай мове.
2. Аналіз памылак, звязаных з уплывам роднай гаворкі.
3. Супастаўленне дыялектных з'яў з адпаведнымі з'явамі літаратурнай мовы.
4. Папярэджанне дыялектных памылак.

3 модуль складанасці – падрыхтуйце праект «Арганізацыя ў кабінеце беларускай мовы кутка "Родная гаворка"» і абараніце яго.

3. СУПРАВАДЖАЛЬНЫЯ МАТЭРЫЯЛЫ

ТЭКСТЫ ГАВОРАК
УЗОРЫ ДЫЯЛЕКТНАГА МАЎЛЕННЯ)

Кап вывісці дзічы усякія, нада на захадзі сонца ісці на могілкі піражыгнацца і пацёрці дзічы зямлёй з магілкі. Толькі адной нъ магілкі ісці. Тады прыйсці дамоў, лехчы ў пасцель і ні с кім ні гъварыць. Праз нядзелю можна апяць так зрабіць. І ўвідзіця, што праз нядзелю ніякіх дзічоў ня будзіць.

(Запісала ў 1992 г. С.Малей
у в. Дунілавічы Пастаўскага р-на Віцебскай вобл,
ад Л.Кейзік, 70 гадоў)

Даўней як субота, то і чуці шаргуны. Гэта да дзевак сваты едуць. Хай дзеўка няпекная, а як бъгатая, то й кожную суботу сваты едуць. А ў мяне дзе тое бъгацце, чатыры дачкі ў бацькі, ды і мълъдая яшчэ была. А сватаючы можыць быць так, што хлопіц дзеўку і ў вочы ня відзіў.

(Запісала ў 1992 г. С.Малей
у в. Пераслега Пастаўскага р-на Віцебскай вобл,
ад С.Машнич, 67 гадоў)

Нада ўзяць ніткі простую зь лёну, як раней льняныя ніткі рабілі. І мерыіш. Ат пальца левъй нагі дъ пальцаў правай рукі. Руку нада пъдняць. Тры разы мерыіш і зъвязваіш вузялкі. Калі трэці вузялок будзе дальшэ, то значыць чълавек спужаўшысь Гэтыя ніткі нада спаліць. Чълавека пъставіць на што-небудзь высокае і акурыць яго. Абнясці кругом яго ніткі, калі яны дъмяцца, тры разы акурыць.

(Запісала ў 1993 г. А.Чапулёнак
у в. Шыці Шаркоўшчынскага р-на Віцебскай вобл,
ад Е.Буйка, 63 гады)

Дохтъраў даўней мала было, усё травъмі лечълісі. А калі дужа надъб'е, дык пяхотъм да доктъраў хадзілі. Пры Польшчы добра лечылі. Сястры трэба было глазы лячыць, бо мъгла саслепнуць. Зъ пяць кіламетраў хадзілі пяхотъм праз дзень. Два злоты плацілі толькі каб дохтар пъглядзеў. І вылечылі. Але ш дзяцей умірала къпца ні было.

(Запісала ў 1993 г. А.Пугаўка
ў в. Дворнае Сяло Мёрскага р-на Віцебскай вобл,
ад С.Захарава, 72 гады)

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Даўно ўжо гаварылі, што сон-тръва – гэта быццам сляды кръвяныі ад нейкъй птушкі. І гъварылі, хто первый увідзіць сон-траву вясной, будзіць шчаслівым чълавекъм. А еслі ішчо гэта дзеўка ўвідзіць, то значыцца замуж выйдзіць скора.

(Запісала ў 1993 г. Г.Кавецкая
ў в. Ларынаўка Аршанскага р-на Віцебскай вобл,
ад Г.Анашкавай, 83 гады)

Ёсць такі цвет, смолка завецца. Гэта высочанькі цвецік. Лісты на ім доўжанькіі, а лісточкі бурачковъга цвету. Лёхка смолку найці пъ яе ліпкасці: калі ўзяцца зъ сцябліну, то пальцы прыліпаюць як к смале. Дзеўкі за гэта смолку стыралісі паткінуць мальцам і абізацільна ў пъўналунні. Тады той маліц должын быў прыліпнуць да дзеўкі, што паткідывъла, як дъ смалы.

(Запісала ў 1993 г. Г.Кавецкая
ў в. Ларынаўка Аршанскага р-на Віцебскай вобл,
ад Г.Клыкоўскай, 69 гадоў)

Раней у купальскую ноч мушчыны, якія ні мірылісі съ сваімі брътамі і сестрамі, шукалі ў ръвах цвяты брат і сістра. І калі шукалі, прыгъваръвалі:

А што ж гэта зъ травіца,
Што і брат, і сястріца?

Еслі нъхадзілі такіі цвяты, то схадзілісі съ сваімі ротъвіннікамі. А калі не, то нічога ні міняласі.

Ат спугу раней лячылі чаборъм, бруснічнікъм, палынню, спарыжам. Гэта ўсё сушылі, патома цёрлі, клалі на скъвароду і зъпальвалі. Зъпальліць нада было так, кап толькі дым пашоў. Тады накрывалі спужънъга адзіялам, баба-шаптуха съ скъвародъй тожа накрывалъся і зъстъўляла доўга кашляць ад дыму. Нейкія прыўда, гъварыла пры гэтым словы.

(Запісала ў 1993 г. Г.Кавецкая
ў в. Ларынаўка Аршанскага р-на Віцебскай вобл,
ад Т.Кавецкай, 84 гады)

Там такоя балоцца было, сасънічык рос. Гъктараў дваццаць балоцца было. Сярот яго – вялікі-вялікі камінь. Хто ідзець пъны міма, дык чэрці ў балоцца зъцягнуць, і той чълавек да каміня даходзіць. Дайдзіць, садзіцца на камінь і трэць шапкай па ім, пакуль гэту шапку ні сатрэць. Калі німа шапкі, дык руку да крыві здзіраіць. І адысціся ня можыць усю ноч, куды ні кідаіцца, усё да каміня ідзець. А як шапкай трэць ці рукамі, то здаецца яму, што на жорнах меліць. А тады, як конъчыць ужо малоць, дык ляжыць і спіць, як на печы.

Кажды пъяны туды захадзіўся. Цяперъка німа таго каміня. Балоцца асушылі і нівядома, куды ён дзеўся. А ўрочышча тое так і засталося звацца Съснъватка.

(Запісала ў 1993 г. А.Мацюшонак
у в. Порплішчскі Двор Докшыцкага р-на Віцебскай вобл,
ад В.Глухоўскага, 65 гадоў)

Мыладою была — ні тое было. Устану ранінька, печ зытаплю, хызяйства дыгляджу. А цяперя ў гарот пышла за бурікамі зычапілыся ды зыбарілыся. А работы ж ні прыдахнуць. Сянні бульбу рыць паышла, дык анну шаньку нарыла і больш ні змыгла. Ну што ж, буду ждаць, пакуля дзеці ні папріедуць. Іх жа ў міне пяціра, але ўсе далёка. У саміх сем'і, работы ўсякый хвытаіць. Малыя былі, дык цэлыя чырыда ў хаці была. А дзяцей раней ва ўсіх памногу было. Пяціра, шэсціра, а то ў анных дзвінаццыць было. А ў дзяреўне недзе дзвесці двароў. Бывала на вуліцу выдзеш – гудзіць ад людзей. А цяперя дзеці павырыслі, пырызбрялісі.

(Запісала ў 1994 г. А.Рашчынская
ў в. Бароўка Касцюковіцкага р-на Магілёўскай вобл,
ад Г.Ціцянковай, 70 гадоў)

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

У Дуброві (ета лес ыд нас нідалёка) ёсць тыкая пылянка. На тэй пылянкі бяльшая лашчына і йіна з даўніх вякоў называіцца святым калодзіжым. А пычаму ён называіцца святы калодзіж? Старыя-прістарыя людзі гавораць, што тама стыяла цэрьква і йна прівалілася. І цяперь, кыгда прікладзеш туды вуха к зямлі кыля етыга калодзіжа, то чутны звон званоў, званы звіняць. Еты калодзіж хацелі змеріць. Дзіяметр змерілі, толькі я ня помню колькі яно, а глубіну ніяк. На вярёўку ці ны кынат прівізалі цяжолый камінь і апусцілі яго туды. І колькі ні апускалі – ня стукыла аб дно. І вот ім аттуль аткызалі: “Ні мерійце вяроўкый, а памерійце галоўкый!” І так ніікыгда ні маглі яго глубіну змеріць. А выда там усё ўремя чыстая-чыстая, і йна ніколі ціныю ні зыцягіваіцца. Тама на духа устраівыюць гульні, мыладзёш танцуіць. Етай вадой жанчыны стыраюцца памыць ліцо сваіх дзіцей і ношкі, таму што іна лічэбныя, світая выда.

(Запісаў у 1994 г. С.Гуркоў
у в. Міхеевічы Крычаўскага р-на Магілёўскай вобл,
ад Д.Карпавай, 77 гадоў)

ЗАМОВА АД ЗМЯ1

На чыстым полі, на сінім моры стаіць змяінае гняздо. У тым гняздзе трі змяі: адна Гапея, другая Шкурапея, трэція Праскахвея. Старшъя змія, учімай сваіх змей і жалы з іх, з рабабожжай (імя). Вынімай дъмавых, гнъявых, міжавых, мъхавых, балотных, калодных. Маць прячыстъя на сінім морі, тонка плацце пряла, за белы праннік закідала, старым змеім жалы вынімала. Кап тваё жала ў рабабожжай (імя) звяла.

(Запісала ў 1993 г. Г.Селіванава
ў в. Будачка Хоцімскага р-на Магілёўскай вобл,
ад К.Катляровай, 74 гады)

РЕПОЗИТОРИЙ ВГПУ

III. РАЗДЗЕЛ КАНТРОЛЮ ВЕДАЎ

1. ТЭСТАВЫЯ ЗАДАННІ

Выканаць па варыянтах праверачныя заданні па тэме *«Уводзіны і групоўка беларускіх гаворак»*:

Варыянт 1

Заданне 1. Указаць, якія з пералічаных характарыстык не адпавядае дыялектнай мове.
1. Тэрытарыяльна неаднастайная і абмежаваная ў пашырэнні.
2. Ужываецца як адзіная па ўсёй тэрыторыі краіны.
3. Унармаваная, кадыфікаваная.
4. Характарызуецца слабой стылістычнай дыферэнцыяцыяй.

Заданне 2. Выпісаць назвы прац па лінгвагеаграфіі.
1. Матэрыялы да слоўніка мінска-маладзечанскіх гаворак.
2. Агульнаславянскі лінгвістычны атлас.
3. Матэрыялы да абласнога слоўніка Магілёўшчыны.
4. Слоўнік гаворак цэнтральных раёнаў Беларусі.
5. Лексічны атлас беларускіх народных гаворак.

Заданне 3. Выбраць правільнае азначэнне паняцця «дыялект».
1. Сукупнасць агульнапрынятых гукавых і лексіка-граматычных сродкаў для выказвання думак і наладжвання сувязі паміж людзьмі.
2. Сродак зносін паміж жыхарамі адзінага ці некалькіх населеных пунктаў, аднатыповых у моўных адносінах.
3. Група аднатыповых гаворак, пашыраных на пэўнай тэрыторыі.
4. Некалькі асобных гаворак з блізкімі або аднолькавымі моўнымі асаблівасцямі.

Заданне 4. Выпісаць апублікаваную працу І. Насовіча.
1. Программа для собирания говоров белорусского наречия.
2. Белорусы-сакуны.
3. Смоленский областной словарь.
4. Словарь белорусского наречия.
5. Материалы для изучения белорусских говоров.

Заданне 5. Выбраць правільнае азначэнне паняцця «лінгвістычны арэал».
1. Картаграфічна зафіксаванае прасторавае ўзаемаразмяшчэнне моўных адрозненняў.
2. Тэрыторыя, аднатыповая ў моўных адносінах.
3. Вобласць распаўсюджання тых ці іншых фанетычных, граматычных, лексічных з'яў.

Заданне 6. Выкрасліць групы гаворак, якія не ўваходзяць у паўночна-ўсходні дыялект.
1. Полацка-мінская.
2. Сярэднебеларуская.
3. Віцебская.
4. Слуцкая.

Заданне 7. Дапісаць фармуліроўку.
Асноўны масіў беларускіх гаворак складаюць …

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Заданне 8. Вызначыць, у якіх гаворках (сярэднебеларускіх ці палескіх) распаўсюджаны наступныя фанетычныя рысы.
Хліеб, бэ□рэг, молодо□го, мы□ска, н'іс, го□стры, мн'а□са, голова□, к'ін', стуол.
Заданне 9. Вызначыць, якія з пералічаных дыялектных рыс з'яўляюцца характэрнымі для сярэднебеларускіх гаворак.
1. Дысімілятыўнае аканне.
2. Пераход націскнога [а] ў [о] ў выніку лабіялізацыі ў становішчы перад [у] нескладовым.
3. Захаванне форм парнага ліку назоўнікаў жаночага і ніякага роду.
4. Зацвярдзенне губных з выдзяленнем эпентэтычнага [н] перад галоснымі [а], [о].

Заданне 10. Вызначыць, да якога дыялекту (паўднёва-заходняга ці паўночна-ўсходняга) належыць гаворка, прадстаўленая ва ўрыўку.
Н'асо̂м п'атна□ццац' гу□бак. Чаты□ры палатн'е□ па чаты□ры гу□бк'і. С'адз'і□ш на рэццы цэлы дз'ен'. Н'ас'е□ш у рэ□чку, мо□чыш, таўч'е□ш. Тады□ зно̂ў пра□н'ікам бйеш. По□с'л'е лух ро□б'ац'. Цэ□бар ста□в'ац', к'іп'ато□к л'йуц'. Кам'е□н'е ў п'ê чы нагрэ□юц', к'і□нуц', ды йано□ і к'іп'і□ц'.

Варыянт 2
Заданне 1. Выбраць правільнае азначэнне паняцця «лінгвагеаграфія».
1. Раздзел мовазнаўства, які займаецца вывучэннем мясцовых, тэрытарыяльных моўных разнавіднасцей.
2. Навука, якая вывучае народы, этнасы, іх'я супольнасці, іх побыт, культурна-гістарычныя сувязі.
3. Раздзел мовазнаўства, які вывучае тэрытарыяльнае пашырэнне тых моўных з'яў, якімі адрозніваюцца дыялекты.
4. Раздзел мовазнаўства, які вывучае любыя ўласныя імёны, іх паходжанне, асноўныя заканамернасці развіцця і функцыянавання ў сістэме мовы.
5. Асобная галіна дыялектналогіі, якая распрацоўвае тэарэтычныя і практычныя пытанні збірання, сістэматызацыі, апісання дыялектнай лексікі і ўкладання дыялектных слоўнікаў розных тыпаў.

Заданне 2. Выпісаць правільнае азначэнне ізаглосы.
1. Лінія, што звычайна крайнія пункты распаўсюджання асобнай моўнай з'явы на карце.
2. Тэрыторыя, на якой пашырана тая ці іншая моўная з'ява.
3. Вусная характарыстыка асобнай моўнай з'явы.

Заданне 3. Выбраць правільнае азначэнне паняцця "гаворка".
1. Разнавіднасць мовы, якая характарызуецца адносным адзінствам сістэмы і выкарыстоўваецца як сродак непасрэдных зносін паміж людзьмі пэўнага рэгіёна.
2. Тэрытарыяльна абмежаваная мова жыхароў аднаго або некалькіх населеных пунктаў, аднатыповых у моўных адносінах.
3. Тэрытарыяльная разнавіднасць нацыянальнай мовы.

Заданне 4. Выбраць з прадстаўленага спіса прозвішча аўтара першага пасляваеннага дыялектнага слоўніка.
Т. Янкова, Т. Сцяшковіч, П. Сцяцко, М. Шатэрнік, Ф. Янкоўскі, І. Бялькевіч, Г. Юрчанка, Л. Шаталава.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Заданне 5. Указаць, на якім з пералічаных моўных узроўняў выяўляецца спецыфіка сацыяльных дыялектаў.

1. У граматычным ладзе.
2. У сінтаксічнай будове.
3. У лексічным складзе
4. У фанетычнай сістэме.

Заданне 6. Выпісаць групы гаворак, якія ўваходзяць у паўднёва-заходні дыялект.

1. Мазырская.
2. Усходне-магілёўская.
3. Слуцкая.
4. Гродзенска-баранавіцкая.

Заданне 7. Дапісаць фармуліроўку.

Паўднёвая мяжа паўночна-ўсходняга дыялекту праходзіць прыкладна па лініі …

Заданне 8. Назваць, у якіх гаворках (сярэднебеларускіх ці палескіх) распаўсюджаны наступныя рысы.

Забро□ў, тро□ўка, гаво□ра, но□с’а, акул’а□рамы, рука□мы, йаны ка□жац’, йаны шы□йац’.

Заданне 9. Вызначыць, якія з пералічаных дыялектных рыс з’яўляюцца характэрнымі для палескіх гаворак.

1. Недысімілятыўнае поўнае яканне.
2. Оканне.
3. Наяўнасць мяккай фанемы [р’].
4. Падаўжэнне зычных у інтэрвакальным становішчы.

Заданне 10. Вызначыць, да якога дыялекту (паўднёва-заходняга ці паўночна-ўсходняга) належыць гаворка, прадстаўленая ва ўрыўку.

Ц’іп’е□р’ жыс’ нам□о□а лу□ччы, чым была□ ра□н’шы. С’іча□с ус’о йос’: і ра□дз’івы, і л’іса□п’е□ты, і мытацы□клы, і пла□ц’ц’і ра□зныйі мо□дныйі. Пыгл’а□дз’іш друг□е□й рас на ц’іп’е□р’ішн’ійу мыладз’о□ш і ду□мыйіш: «Вам н’і пр’ішло□с’а ачы□ ус’о тойа, што п’ір’іц’ір’п’е□л’і кал’і-та мы».

Варыянт 1

Заданне 1. Выпісаць уласналексічныя супрацьстаўленыя дыялектныя адрозненні.

По□куцце, пу□ня, ву□тка, гарла□ч, кураня□ты, папру□га, збано□к, по□куць, дзя□га, збан, аспада□р, ма□ліц, раме□нь, Хвядо□с, хазя□ін, папру□жка, гаспада□р.

Заданне 2. Выпісаць нумары прыказак, прымавак, фразеалагізмаў з дыялектнымі словамі. Вызначыць тып дыялектызмаў.

1. У во□рыве гарэ□хі – у кішэ□ні прарэ□хі.
2. Абы ўмеў та□нчыць, а гавары□ць і го□ра наву□чыць.
3. Сядзі□ць, як блашы□на ў шчы□ліне.
4. Ма□рац адмаро□зіць па□лец.
5. Пы□льным во□ркам сту□кнуты.
6. У каршэ□ль ‘моцна (даць каму-небудзь)’.
7. Як дурні□цаў з’е□ўшы ‘нелагічна, неразумна (гаварыць)’.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Заданне 3. **Выпісаць лексіка-словаўтваральныя тыпы лексічных адрозненняў.**

Красня□к – падасі□навік; від – твар; руда□ – гразь; кура□ – ку□рыца; вадзе□нь – авадзе□нь, пе□шкам – на□пеша; бру□ква – бру□чка; лапі□на – ла□піна; жні□ва – жніво□; агаро□жыны – загаро□джын; хало□нны – хало□дны.

Заданне 4. **Падкрэсліць лексіка-марфалагічныя варыянты слоў.**

Сівы□, піса□ці, мала□ння, грыбэ□, карша□к, карамы□сел, байня□, вавю□рка, бульбо□ўнік, гуркэ□м, рабі□цьмуць, се□стра, спімо□, (па) грыбо□х, глядзём, Хве□дар.

Заданне 5. З наступных прыкладаў выбраць абсалютныя сінонімы.

Хо□днік – падно□жнік ‘палавік’

Маро□з – пяку□н – траску□н – маразюга□н

Галава□ – ку□мпал – кацяло□к – башка□

Мазо□ль – муля□к

Ліцо□ – твар – мурло□ – мо□рда

Заданне 6. Выпісаць сінонімы і абазначыць, якія з членаў сінанімічнага рада дыялектныя (Д).

Ад яго□ нічо□га не ўто□ім, усё вы□ведае.

Цэ□лы год хадзі□ў і нарэ□шце такі вы□віжаваў.

Яму хоць у зямлю□ закапа□й, то ён усё ро□ўна вы□нюхае.

Я ні пріслядзі□ў, дык слядзі□ ты□ мо□ка айдзе□ ўві□дзіш.

Я ўжо хырашо□ ізучы□ла, дык гляджу□, вачэ□й ні спуска□ю.

Заданне 7. Выпісаць дыялектныя матывацыйныя словы, вызначыць іх невытворныя асновы.

Дзевяціра□нка жо□ўтым цвіце□. Дзевяціра□нка – ад дзевяці□ ран, у яе лісто□чкі, як мо□рква. Дзівасі□л – ляка□рства харо□шае, яго ад жывата□ п’юць, пры плато□х расце□. Раза□к – трава□ ў во□зеры, калю□чая, зупкі□ ёсць. Як шарпне□ш руко□й, так раза□к і парэ□жа. Аплаву□шка расце□, дзевада□, ба□гна, у бало□це.

Заданне 8. Выпісаць лексемы, якія ўваходзяць у тэматычную групу «Пчалярства».

Буза□, гвозд, жак, рой, лётка, кры□га, ву□да, па□сека, брадні□к, шчупа□к, вашчы□на, язю□к, нас□раст, зяме□ц, пшчала□, ло□дка, вуль, грузі□ло, вудаўё, калёсы, капані□ца, джа□ло, вазьмо□, тыту□нь, прапо□ліс, мэд, дрыгва□.

Заданне 9. Якія з прыведзеных лексем з’яўляюцца полісемантамі?

Галу□за – 1. Галавешка; 2. Голая косць; 3. Галіна; 4. Бесталковая кабета.

Бурно□с – 1. Доўгая вопратка з шырокімі рукавамі з даматканага сукна; 2. Верхняя жаночая вопратка з даматканага сукна; 3. Плашч.

Красу□ля – 1. Прыгажуня; 2. Клічка каровы.

Заданне 10. Якое значэнне маюць у гаворках падкрэсленыя словы? Назавіце асноўную прымету дыялектнага слова.

1. Як я **абуры□лася** з ла□ўкі, то адра□зу ў клу□бе бале□ла, а цяпе□р лы□тка балі□ць.
2. Мы сяго□ння **начу□** на торф пае□халі, то так здо□рава, шкадава□лі, што лёхко апра□нуты.

Варыянт 2

Заданне 1. Выпісаць пары слоў, якія ў гаворках гучаць па-рознаму, але называюць адзін і той жа прадмет. Назваць тып такіх дыялектных адрозненняў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Сы□пка, па□церы, пра□ля, сцяклі□на, кара□лі, по□плаў, ва□ленкі, дзяру□га, на□сыпка, хада□к, спо□днікі, кудзе□льніца, пацёры, чо□санкі, по□сцілка, напе□рнік, пра□лля.

Заданне 2. **Выпісаць нумары прыказак, прымавак, фразеалагізмаў з дыялектнымі словамі. Вызначыць тып дыялектызмаў.**

1. Палічы□ць ска□бкі ‘пабіць каго-небудзь’.
2. Мы□ла бру□днае, а бе□лае ху□сце мы□е.
3. Ба□йбусам вы□рас, ды ро□зуму не вы□нес.
4. До□бры касе□ц не шкаду□е, што шыро□кі сагане□ц.
5. Як рак у пролу□бцы ‘без толку (таўчыся дзе-небудзь)’.
6. Які е□хаў, такі ўстрэў.
7. У камузэ□льку ты□кацца ‘скардзіцца на свой лёс’.

Заданне 3. **Выпісаць лексіка-словаўтваральныя тыпы лексічных адрозненняў.**

Іздо□р – здор; жураўлі□ны – жураві□ны; запамо□га – дапамо□га; ара□тай – ара□ты; капялю□ш – ве□рхні сноп; жэ□ба – жа□ба; дружба□нт – ка□цер; на□глы – ве□льмі высо□кі; бліскаві□ца – бліскавіца; халадні□к – захало□д ‘халадзец’; шво – шва; но□жніцы – но□жыцы; чараві□кі – чэрэві□кі.

Заданне 4. **Выпісаць лексіка-марфалагічныя варыянты слоў.**

Вы□старак ‘стары чалавек’, ро□бя, (у) садо□х, санато□рыя, ко□хта, гуля□іць, дзве назе□, нае□ўса, пе□цка (ад печы), ле□чуць, карта□цкі, вісна□, мня□со, пагуля□йма, (у) про□шлум, галу□б, узя□лісі, капта□н, до□брэ (насенне).

Заданне 5. З наступных прыкладаў выпісаць адносныя або семантычныя сінонімы.

Адзе□нне – шмо□ткі – нара□дны – тра□нты – тра□пкі – стар’ё.
Радня□ – свае□ – пле□мя – куто□ – ко□дла.
Зэ□даль – сто□лак.
Вясну□шкі – рабаці□нне.
Сянні□к – цюфля□к – сало□меннік – мытра□с.
Ла□стаўка – яску□лка.

Заданне 6. Выпісаць сінонімы і абазначыць, якія з членаў сінанімічнага рада дыялектныя (Д).

Дубэ□льты нічо□га не памага□юць, паўсцяны□ вы□гніла.
На зіму□ падво□йнікі ўста□вім.
Каго-каго, а цябе□ зможч я яшчэ□ зду□жаю.
Ні глядзі□, што ста□рый, маладо□га судо□ліў.
Глядзі□-ка ты, ка□жыцца, шкет, а асі□ліў тако□га бульшуна□.

Заданне 7. Выпісаць дыялектныя матываваныя словы, вызначыць іх невытворныя асновы.

Смуро□дзіну п’юць ад даўле□ння. Падарэ□шнік расце□ пад арэ□шнікам, шо□рсткая трава□. Пазе□мкі мале□нькія. Яны ў нас расту□ць у ле□се, кра□сненькія. Вію□ха спляла□ ўсю бу□льбу.

Заданне 8. Выпісаць лексемы, якія ўваходзяць у тэматычную групу «Ежа і пітво».

О□лій, галюфэ□, швэ□дра, кру□пнік, ясёнка, камузэ□лька, сква□рка, ала□дка, падо□лак, ю□шка, пы□во, по□двязка, масля□нка, заце□рка, капелю□х, капту□р,

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

вантрабя□нка, папру□жка, сырадо□й, панчо□хі, напа□рстак, саладу□ха, спра□жка, спо□дні, жур, хварту□х.

Заданне 9. Якія з прыведзеных лексем з’яўляюцца амонімамі?

Пазу□р – 1. Пазногаць; 2. Кіпцюр.

Бягу□н – 1. Прыстасаванне, з дапамогай якога дзіця вучыцца хадзіць; 2. Верхні камень у жорнах.

Ві□тка – 1. Цюк; 2. Лубка, плецены кораб; 3. Нізка пацерак.

Заданне 10. Якое значэнне маюць у гаворках падкрэсленыя словы? Назавіце асноўную прымету дыялектнага слова.

Патсалі□ гно□ем, то расці□ме.

Ня зна□ю, як вы□вясці **луску□**: чым ні мы□ю галаву□, усё адно□ ёсць.

2. ПЫТАННІ ДЛЯ САМАПРАВЕРКІ

1. Дыялекталогія і яе задачы, значэнне, сувязі з іншымі навукамі.
2. Асноўныя паняцці дыялекталогіі. Важнейшыя адрозненні літаратурнай мовы ад дыялектнай.
3. Разнавіднасці агульнанароднай мовы.
4. Лінгвістычная геаграфія, яе задачы і метады; значэнне; асноўныя лінгвагеаграфічныя працы.
5. Дыялекты і гаворкі на тэрыторыі Беларусі.
6. Слоўнікавы склад гаворак.
7. Асноўныя прыметы дыялектнага слова.
8. Гістарычныя пласты ў лексіцы гаворак.
9. Тэматычнае чляненне дыялектнай лексікі.
10. Варыянтнасць і сінанімія ў гаворках.
11. Матываванасць дыялектнай лексікі.
12. Супрацьстаўленыя і несупрацьстаўленыя лексічныя адрозненні.
13. Лексічная неадназначнасць у гаворках (полісемія і аманімія).
14. Фразеалагічны склад гаворак, варыянтнасць і сінанімічнасць фразеалагізмаў.
15. Фарміраванне практычных навыкаў размежавання дыялектных з’яў у галіне дыялектнага вакалізму.
16. Фарміраванне практычных навыкаў размежавання дыялектных з’яў у галіне дыялектнага кансанантызму.
17. Фарміраванне практычных навыкаў лінгвістычнага аналізу гаворкі па тэкстах.

3. ПЫТАННІ ДА ЗАЛІКУ

1. Дыялекталогія. Раздзелы дыялекталогіі, прадмет вывучэння кожнага раздзела.
2. Сувязь дыялекталогіі і сучаснай беларускай літаратурнай мовы.
3. Гаворка, група гаворак. Групы гаворак на беларускамоўнай тэрыторыі.
4. Дыялект. Дыялекты ў беларускай мове.
5. Дыялектная мова, дыялектнае маўленне.
6. Асноўныя этапы развіцця беларускай дыялекталогіі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

7. Лінгвагеаграфія як раздзел мовазнаўства, яго прадмет і задачы.
8. Сетка апорных населеных пунктаў. Праграма даследавання.
9. Ізаглоса, пучкі ізаглос, арэал.
10.Дыялектная зона. Дыялектныя зоны на лінгвістычнай прасторы беларускай мовы.
11.Лінгвістычны атлас, яго тыпы ў залежнасці ад моўных узроўняў і тэрыторыі даследавання.
12.“Дыялекталагічны атлас беларускай мовы” (1963) і яго значэнне ў беларускай дыялекталогіі.
13.“Лексічны атлас беларускіх народных гаворак” (1993 – 1998) як новы этап у айчыннай лінгвагеаграфіі.
14.Чатыры пакаленні лінгвістычных атласаў.
15.Фанетычныя асаблівасці паўночна-ўсходняга дыялекту.
16.Сутнасць дысімілятыўнага акання і якання і іх падтыпы. Тэрыторыя пашырэння гэтых фанетычных асаблівасцяў.
17.Цоканне, якім гаворкам яно ўласціва.
18.Фанетычныя асаблівасці паўднёва-заходняга дыялекту.
19.Сутнасць недысімілятыўнага акання і якання, іх падтыпы. Тэрыторыя пашырэння гэтых фанетычных працэсаў.
20.Асаблівасці ўжывання прыстаўных зычных у беларускіх гаворках. Тэрыторыя пашырэння гэтых фанетычных працэсаў.
21.Адрозненні ў складзе галосных фанем у беларускіх гаворках.
22.Асноўныя фанетычныя і марфалагічныя рысы сярэднебеларускіх гаворак.
23.Асноўныя фанетычныя і марфалагічныя рысы заходнепалескіх гаворак.
24.Оканне, тэрыторыя пашырэння гэтай фанетычнага працэсу.
25.Еканне, тэрыторыя пашырэння гэтай фанетычнай з’явы.
26.Марфалагічныя рысы паўночна-ўсходняга дыялекту.
27.Марфалагічныя рысы паўднёва-заходняга дыялекту.
28.Адрозненні па склонавых формах назоўнікаў 1 скланення, тэрыторыя іх пашырэння.
29.Адрозненні па склонавых формах назоўнікаў 2 скланення, тэрыторыя іх пашырэння.
30.Адрозненні па склонавых формах назоўнікаў 3 скланення, тэрыторыя іх пашырэння.
31.Дыялектныя адрозненні ў інфінітыве, тэрыторыя іх пашырэння.
32.Варыянты постфікса зваротных дзеясловаў у гаворках.
33.Канчаткі дзеясловаў цяперашняга (будучага простага) часу адзіночнага і множнага ліку ў беларускіх гаворках.
34.Злітная форма будучага часу, тэрыторыя яе пашырэння.
35.Асноўныя прыметы дыялектнага слова. Варыянтнасць слоў, прыклады.
36.Тыпы дыялектных лексічных адрозненняў.
37.Дыялектная лексікаграфія, асноўныя этапы яе развіцця.
38.Этнаграфічны этап у гісторыі беларускай дыялектнай лексікаграфіі.
39.Этналінгвістычны этап у гісторыі дыялектнай лексікаграфіі.
40.Дыялектаграфічны этап у гісторыі дыялектнай лексікаграфіі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

41.“Тураўскі слоўнік” (1982 – 1987) як збор лексікі адной гаворкі.

42.“Слоўнік беларускіх гаворак паўночна-заходняй Беларусі і яе пагранічча” (1979 – 1986) – новы тып лексікаграфічнага даведніка ў айчыннай рэгіянальнай лексікаграфіі.

43.Дыялектная фразеаграфія. Дыялектныя фразеалагічныя слоўнікі па гаворках розных рэгіёнаў Беларусі.

44.Лексікаграфічныя працы па гаворках Магілёўшчыны і Віцебшчыны.

45.Лексікаграфічныя працы па гаворках Міншчыны і Гродзеншчыны.

46.Лексікаграфічныя працы па гаворках Гомельшчыны і Брэстчыны.

.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

IV. ДАПАМОЖНЫ РАЗДЕЛ
1. ВУЧЭБНАЯ ПРАГРАМА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ

Установа вышэйшай адукацыі
"Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт
імя Максіма Танка"

ЗАЦВЯРДЖАЮ
Прарэктар па вучэбнай рабоце
_____ А.В.Макоўчык
"__" _____ 2019 г.

Рэгістрацыйны № УД 31-1-22 / вуч.

БЕЛАРУСКАЯ ДЫЯЛЕКТАЛОГІЯ

Вучэбная праграма ўстановы вышэйшай адукацыі
па вучэбнай дысцыпліне для спецыяльнасцей:

1-02 03 01 Беларуская мова і літаратура;
1-02 03 03 Беларуская мова і літаратура. Замежная мова

2019 г.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Вучэбная праграма складзена на аснове тыпавой праграмы "Беларуская дыялекталогія", 20.10.2014 г. Рэгістрацыйны нумар № ТД – А. 514 / тып. і вучэбных планаў для спецыяльнасцей 1 – 02 03 01 Беларуская мова і літаратура; 1 – 02 03 03 Беларуская мова і літаратура. Замежная мова.

СКЛАДАЛЬНІК:

Ю.В. Чарнякевіч, старшы выкладчык кафедры мовазнаўства і лінгвадыдактыкі ўстановы адукацыі "Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка", кандыдат філалагічных навук.

РЭЦЭНЗЕНТЫ:

Прыгодзіч М.Р., загадчык кафедры гісторыі беларускай мовы Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, доктар філалагічных навук, прафесар;

Шклярык В. А., навуковы супрацоўнік аддзела дыялекталогіі і лінгвагеаграфіі Інстытута мовазнаўства імя Якуба Коласа НАН Беларусі, кандыдат філалагічных навук

РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ:

Кафедрай мовазнаўства і лінгвадыдактыкі ўстановы адукацыі "Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка"

(пратакол № 9 ад 19.04.2019 г.)

Загадчык кафедры _____ Д.В.Дзятко

Навукова-метадычным саветам ўстановы вышэйшай адукацыі "Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка"

(пратакол № 6 ад 18.06.2019)

Афармленне вучэбнай праграмы і суправаджальных матэрыялаў дзеючым патрабаванням Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь адпавядае.

Метадыст вучэбна-метадычнага

аддзела БДПУ _____ С.А.Старадуб

Зьмен. дир. О-ка

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

“Беларуская дыялекталогія” – вучэбная дысцыпліна, якая знаёміць з вынікамі даследавання дыялектнай мовы і раскрывае асноўныя заканамернасці яе функцыянавання, паказвае найважнейшыя асаблівасці беларускай дыялектнай мовы на ўсіх ўзроўнях моўнай сістэмы ў структурна-тэрытарыяльных разнавіднасцях, тлумачыць сувязь і агульныя рысы з сістэмай літаратурнай мовы, прадстаўляе сістэму навуковых паняццяў гэтай лінгвістычнай галіны і асноўныя дасягненні ў даследаванні народных гаворак.

Праграма “Беларуская дыялекталогія” дапаможа студэнтам сістэматызаваць набытыя веды пры вывучэнні іншых лінгвістычных дысцыплін, навучыць будучых настаўнікаў заўважаць, кваліфікаваць і выпраўляць памылкі вучняў, у тым ліку абумоўленыя ўплывам дыялектнага маўлення і праблемамі білінгвізму ў краіне.

Асноўныя мэты выкладання вучэбнай дысцыпліны:

– сфарміраваць у будучых настаўнікаў уяўленне пра беларускую нацыянальную мову ва ўсёй разнастайнасці формаў яе існавання;

– развіць практычныя навыкі выяўляць і назіраць дыялектныя асаблівасці ў мове жыхароў пэўнай мясцовасці, запісваць і аналізаваць канкрэтны дыялектны матэрыял;

– пазнаёміць студэнтаў з гісторыяй станаўлення і этапамі развіцця беларускай дыялекталогіі і яе асноўнымі дасягненнямі;

– выхаваць любоў і павагу да духоўнай і інтэлектуальнай спадчыны беларускага народа, пачуццё нацыянальнай самапавагі і самаідэнтыфікацыі.

Задачы вывучэння вучэбнай дысцыпліны:

– пазнаёміць студэнтаў з сістэмай навуковых паняццяў, прынятай у беларускай дыялекталагічнай навуцы, і метадамі дыялекталагічных даследаванняў;

– выпрацаваць навыкі апрацоўкі і аналізу асаблівасцей дыялектнай мовы;

– навучыць методыцы палявых даследаванняў і запісу асаблівасцей дыялектнай мовы, у тым ліку і з выкарыстаннем сучасных тэхнічных сродкаў;

– паказаць сувязь дыялекталогіі з рознымі раздзеламі беларускага мовазнаўства і іншымі гуманітарнымі навукамі;

– падрыхтаваць будучага настаўніка роднай мовы да самастойнай працы ва ўмовах мясцовага дыялекту.

Вывучэнне вучэбнай дысцыпліны “Беларуская дыялекталогія” павінна забяспечыць фарміраванне ў студэнтаў *агульнаакадэмічных, сацыяльна-асобасных і прафесійных кампетэнцый*.

Патрабаванні да акадэмічных кампетэнцый

Студэнт павінен:

АК-7. Быць здольным ствараць новыя ідэі (валодаць крэатыўнасцю).

Патрабаванні да сацыяльна-асобасных кампетэнцый спецыяліста

Студэнт павінен:

САК-7. Быць здольным ажыццяўляць самаадукацыю і ўдасканальваць прафесійную дзейнасць.

Патрабаванні да прафесійных кампетэнцый

Студэнт павінен быць здольным:

ПК-1. Кіраваць вучэбна-пазнавальнай і вучэбна-даследчыцкай дзейнасцю навучэнцаў.

ПК-2. Выкарыстоўваць аптымальныя метады, формы і сродкі навучання.

ПК-3. Арганізоўваць і праводзіць вучэбныя заняткі разнастайных відаў і форм.

ПК-4. Арганізоўваць самастойную працу навучэнцаў.

ПК-8. Фарміраваць базавыя кампаненты культуры асобы навучэнца.

ПК-12. Развіваць навыкі самастойнай працы навучэнцаў з вучэбнай, даведачнай, навуковай літаратурай і іншымі крыніцамі інфармацыі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

ПК-16 – ацэньваць вучэбныя дасягненні навучэнцаў, а таксама ўзроўні іх выхаванасці і развіцця.

ПК-17. Ажыццяўляць прафесійную самаадукацыю і самавыхаванне з мэтай удасканалення прафесійнай дзейнасці.

У выніку вывучэння дысцыпліны студэнт павінен **ведаць:**

– сувязь дыялекталогіі з рознымі раздзеламі беларускага мовазнаўства і іншымі гуманітарнымі навукамі;

– гісторыю станаўлення і этапы развіцця беларускай дыялекталогіі;

– асноўныя дасягненні айчынных навукоўцаў у галіне беларускай дыялектнай лексікаграфіі, фразеаграфіі і лінгвагеаграфіі;

– групоўку беларускіх гаворак, асноўныя асаблівасці асобных дыялектаў і груп гаворак на ўсіх узроўнях мовы;

– асаблівасці фарміравання сучаснай беларускай літаратурнай мовы на аснове народных гаворак;

– навуковую, вучэбную і даведачную літаратуру па дадзенай галіне мовазнаўчай навукі.

У выніку вывучэння дысцыпліны студэнт павінен **умець:**

– збіраць, апрацоўваць, класіфікаваць і аналізаваць дыялектны матэрыял;

– параўноўваць моўную сістэму гаворкі з сістэмай літаратурнай мовы на ўсіх узроўнях;

– выкарыстоўваць тэхнічныя сродкі для збірання, апрацоўкі і аналізу моўных фактаў;

– складаць дыялектны слоўнік і лінгвістычную карту;

– выкарыстоўваць метады, прыёмы, сродкі і формы навучання роднай мове ў дыялектным асяроддзі;

– карыстацца навуковай, вучэбна-метадычнай і даведачнай літаратурай па беларускай дыялекталогіі.

У выніку вывучэння дысцыпліны студэнт павінен **валодаць:**

– сістэмай навуковых паняццяў беларускай дыялекталогіі;

– метадамі дыялекталагічных даследаванняў і методыкай збіральніцкай працы;

– методыкай выкладання роднай мовы ў дыялектных умовах;

– навыкамі арганізацыі навуковай дыялекталагічнай працы вучняў і кіравання дыялекталагічным гуртком.

Месца вучэбнай дысцыпліны ў шэрагу іншых дысцыплін.

У сістэме лінгвістычных дысцыплін “Беларуская дыялекталогія” на філалагічных факультэтах са спецыяльнасцю “беларуская мова” займае важнае месца. Вучэбны курс працягвае цыкл лінгвістычных дысцыплін і мае цесную сувязь з курсамі “Сучасная беларуская літаратурная мова”, “Беларуская анамастыка”, “Беларуская лінгвакультуралогія”, “Гісторыя беларускай літаратурнай мовы”.

Сувязь вучэбнай дысцыпліны з іншымі дысцыплінамі.

Вучэбная дысцыпліны “Беларуская дыялекталогія” звязана з такімі вучэбнымі дысцыплінамі, як “Сучасная беларуская літаратурная мова”, “Беларуская анамастыка”, “Беларуская лінгвакультуралогія”, “Гісторыя беларускай літаратурнай мовы”, “Уводзіны ў мовазнаўства”, а таксама са школьным курсам беларускай мовы. Лекцыйныя і практычныя заняткі накіраваны на выяўленне лінгвістычных і культуралагічных аспектаў беларускай мовы, што з’яўляецца надзвычай важным ва ўмовах білінгвізму.

Вучэбная дысцыпліна чытаецца на 1 курсе ў 2-м семестре. На вывучэнне вучэбнай дысцыпліны для спецыяльнасці 1-02 03 01 Беларуская мова і літаратура ўсяго адводзіцца 72 гадзіны. Аўдыторных 42 гадзіны, з іх 20 – лекцыйных і 22 – практычных, самастойная

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

работа 30 гадзін. На вывучэнне вучэбнай дысцыпліны для спецыяльнасці 1-02 03 03 Беларуская мова і літаратура. Замежная мова ўсяго адводзіцца 84 гадзіны. Аўдыторных 42 гадзіны, з іх 20 – лекцыйных і 22 – практычных, самастойная работа 42 гадзіны.

Форма атрымання вышэйшай адукацыі – дзённая.

Размеркаванне гадзін на дзённым аддзяленні:

на 1 курсе: 2 семестр:

Усяго: 84 гадзін, аўдыторных – 42 гадзіны.

Лекцыі – 20 гадзін (з іх 2 гадзіны КСР).

Практычныя заняткі – 22 гадзіны (з іх 4 гадзіны КСР).

Самастойная праца – 42 гадзіны. Вылучыць на: тэму 2.1 – 2 г., тэму 2.2 – 2 г., тэму 3 – 8 г., тэму 4.1. – 4 г., тэму 4.2. – 4 г., тэму 4.3 – 4 г.*, тэму 4.4 – 4 г.*, тэму 5.1 – 2 г., тэму 5. 2 – 2 г., тэму 6.1.– 8 г., 6.2 – 4 г.* .

* Темы прызначаны для навучэнцаў спецыяльнасці 1 – 02 03 01 Беларуская мова і літаратура.

Форма атэстацыі па вучэбнай дысцыпліне (2 семестр) – **залік.**

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛУ

1. Уводзіны. Прадмет, змест і задачы курса "Беларуская дыялекталогія", яе месца ў сістэме філалагічнай адукацыі. Навукова-тэарэтычнае значэнне дыялекталогіі. Сувязь дыялекталогіі з іншымі навукамі: лінгвістычнымі – гісторыяй мовы, сучаснай беларускай літаратурнай мовай, анамастыкай; нелінгвістычнымі – гісторыяй, этнаграфіяй, археалогіяй, фальклярыстыкай, літаратуразнаўствам, краязнаўствам.

Практычнае значэнне вывучэння дыялекталогіі пры авалоданні нормамі беларускай літаратурнай мовы. Выкарыстанне фактаў дыялекталогіі ў выкладанні курса беларускай мовы ў школе.

Выхаваўчае значэнне дыялекталогіі ў фарміраванні маўленчай культуры асобы.

2. Дыялекталогія як раздзел мовазнаўства.

2.1. Дыялектная мова і літаратурная мова – дзве формы існавання нацыянальнай мовы. Апісальная (сінхранічная, статычная) і гістарычная (дыяхранічная) дыялекталогія.

Сістэма навуковых паняццяў у дыялекталогіі: гаворка, група гаворак (дыялектная група), дыялект, дыялектная мова, дыялектнае маўленне, сістэма дыялектнай мовы, структура дыялектнай мовы і інш.

Тэрытарыяльныя (мясцовыя) дыялекты. Сацыяльныя дыялекты (прафесійныя дыялекты і жаргоны – тайныя жаргоны, жаргоны дваранскіх салонаў, групавыя або карпаратыўныя жаргоны, шляхецкі жаргон і інш.), сферы іх выкарыстання.

Асноўныя раздзелы дыялекталогіі: фаналогія, граматыка, лексікалогія, лексікаграфія, лінгвагеаграфія, аб’екты іх даследаванняў.

Крыніцы вывучэння беларускай дыялектнай мовы. Запісы фальклярыстаў, этнографаў XIX – XXI стст., мастацкія творы пачатку фарміравання сучаснай беларускай літаратурнай мовы, матэрыялы дыялектолагаў XIX – XXI стст. (друкаваныя, рукапісныя, магнітафонныя, лічбавыя), дыялектныя слоўнікі, хрэстаматыі вуснага маўлення, лінгвістычныя атласы і інш.

Метады даследавання дыялектнай мовы. Непасрэднае назіранне – асноўны метад вывучэння дыялектнай мовы. Анкетны метад. Экспедыцыйны метад. Умовы і формы арганізацыі дыялекталагічных экспедыцый. Экспедыцыйны метад як асноўны і найбольш надзейны пры збіранні дыялектных матэрыялаў. Выкарыстанне тэхнічных сродкаў. Асаблівасці запісу матэрыялаў па лексіцы, фанетыцы, марфалогіі і сінтаксісе. Апрацоўка сабранага дыялектнага матэрыялу, пашпартызацыя, каталагізацыя і захоўванне.

Праграмы і інструкцыі для збірання дыялектнага матэрыялу, іх тыпы ў залежнасці ад мэт і задач даследаванняў.

2.2. З гісторыі беларускай дыялекталогіі. Станаўленне і развіццё беларускай дыялекталогіі (XIX – пачатак XX ст.).

Адлюстраванне асаблівасцей беларускіх гаворак на розных моўных узроўнях у фальклорных і этнаграфічных працах першай паловы XIX ст. П.Шафарыка, З.Даленгі-Хадакоўскага, Я.Чачота, П.Шпілеўскага, І.Шыдлоўскага, П.Кушына, М.Дзмітрыева і інш. Першыя спробы вызначэння межаў беларускай дыялектнай мовы, характарыстыкі і класіфікацыі гаворак у іх працах.

Апісанне характэрных фанетычных і марфалагічных асаблівасцей беларускіх гаворак, публікацыі асобных мясцовых слоў, падборак фразеалагізмаў і невялікіх слоўнікаў у працах этнографаў і фальклярыстаў другой паловы XIX – пачатку XX ст.: паўночна-ўсходніх – П.Шэйна, Віцебшчыны – Н.Анімеле, Магілёўшчыны – Е.Раманава, Міншчыны – М.Янчука, Случчыны – С.Малевіча і А.Сержпутоўскага, Піншчыны – М.Доўнар-Запольскага, заходніх рэгіёнаў Беларусі – М.Федароўскага, Смаленшчыны – П.Шастакова.

Лінгвістычнае даследаванне гаворак беларускай мовы. Першыя спробы сінтэзу дыялектнага матэрыялу ў працах М.Коласава, К.Апеля, І.Нядзёшава, А.Сабалеўскага, А.Шахматава і інш. Грунтоўнае навуковае апісанне беларускай дыялектнай мовы ў працах

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Я.Карскага: "Обзор звуков и форм беларусской речи" (1885), "Белорусы" (т.1, 1903; т.2, 1908-1912), "Русская диалектология" (1924), складзеная ім "Программа для собирания особенностей белорусского наречия" (1897). "Этнографическая карта белорусского племени" (1903) – першая карта пашырэння беларускай мовы. Значэнне даследаванняў Я.Карскага ў распрацоўцы разнастайных праблем беларускай дыялекталогіі.

Развіццё беларускай дыялекталогіі ў паслякастрычніцкі перыяд. Камісія Інбелкульта (1925) па ўкладанні слоўніка жывой беларускай мовы, вынікі яе дзейнасці.

Працы І.Ваўка-Левановіча, П.Растаргуева, П.Бузука, С.Некрашэвіча па розных пытаннях беларускай дыялектнай мовы.

Дыялекталагічныя даследаванні беларускіх гаворак у пасляваенны перыяд. Манаграфічнае апісанне розных узроўняў беларускай дыялектнай мовы ў працах Ю.Мацкевіч, Н.Вайтовіч, Ф.Янкоўскага, І.Гайдукевіча, С.Грыгор'ева, І.Зянько, Я.Рамановіч, Т.Сцяшковіч, Д.Целянцюка, Б.Яфімава, Ф.Клімчука, І.Яшкіна, А.Чабярук, П.Сцяцко, М.Бірылы, А.Крывіцкага, К.Панюціч, Э.Блінавай, А.Станкевіч, Г.Вештарт, І.Лучыца-Федарца, Л.Выгоннай, А.Сакалоўскай і інш.

Вывучэнне беларускай дыялектнай мовы замежнымі навукоўцамі (Л.Асоўскі, Э.Смулкова, М.Лесеў, Ф.Чыжэўскі, М.Саевіч, С.Глінка, М.Кандрацюк, В.Курашкевіч (Польшча), А.Грынавецкене (Літва), М.Талстой, С.Талстая (Расія), М.Ніканчук, А.Залескі, П.Грыцэнка, Я.Закрэўская, Й.Дзендзялеўскі (Украіна) і інш.).

Праграмы, вучэбныя дапаможнікі, хрэстаматыі па беларускай дыялекталогіі.

3. Лінгвістычная геаграфія. Прадмет, змест і задачы лінгвістычнай геаграфіі. Сістэма навуковых паняццяў: праграма (апытальнік), сетка апорных населеных пунктаў, лінгвістычная карта, лінгвістычны атлас, ізаглоса, пучок ізаглосаў, арэал, дыялектная зона. Дыялектныя адрозненні як аб'ект картаграфавання. Тыпы лінгвістычных карт (карта асобных моўных з'яў і некалькіх моўных з'яў або зводная). Тыпы лінгвістычных атласаў у залежнасці ад моўных узроўняў: а) універсальны ("Дыялекталагічны атлас беларускай мовы"), б) тэматычны ("Лексічны атлас беларускіх народных гаворак"); у залежнасці ад тэрыторыі даследавання:
а) агульнанацыянальны ("Лінгвістычная геаграфія і групоўка беларускіх гаворак"), б) рэгіянальны ("Атлас гаворак паўночна-ўсходняй Брэстчыны", "Атлас усходнеславянскіх гаворак Беласточчыны"), в) атласы груп моў ("Агульнаславянскі лінгвістычны атлас"), г) сем'яў моў ці кантынентаў ("Лінгвістычны атлас Еўропы"). Беларускія дыялектныя асаблівасці на картах гэтых атласаў.

З гісторыі лінгвагеаграфіі (Г.Венкер, Ж.Жыльерон, Я.Карскі, Маскоўская дыялекталагічная камісія, П.Бузук). Пасляваенны этап у развіцці беларускай лінгвагеаграфіі.

4. Групоўка беларускіх гаворак.

4.1. Звесткі з гісторыі фарміравання беларускіх тэрытарыяльных дыялектаў. Першыя спробы падзелу гаворак беларускай мовы на групы (П.Шафарык, Я.Чачот, І.Насовіч, А.Сабалеўскі, А.Шахматаў). Падзел Я.Карскім беларускай мовы на паўночна-ўсходні і паўднёва-заходні дыялекты – значнае дасягненне беларускай дыялекталогіі. Групоўка беларускіх гаворак, зробленая Маскоўскай дыялекталагічнай камісіяй (1915). Пытанні групоўкі гаворак беларускай мовы ў працах М.Дурнаво і П.Бузука. Выдзяленне групы пераходных гаворак паміж дыялектамі беларускай мовы.

Сучасная групоўка беларускіх гаворак на аснове матэрыялаў "Дыялекталагічнага атласа беларускай мовы" (1963). Асноўныя прынцыпы, на якіх заснавана групоўка (этнагенетычны і культурна-гістарычны).

4.2. Паўночна-ўсходні дыялект. Тэрыторыя пашырэння, асноўныя фанетычныя, марфалагічныя, сінтаксічныя і лексічныя рысы. Групы гаворак паўночна-ўсходняга дыялекту: заходняя (полацкая) і ўсходняя (віцебска-магілёўская).

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

4.3. Паўднёва-заходні дыялект. Тэрыторыя яго пашырэння, асноўныя фанетычныя, марфалагічныя, сінтаксічныя і лексічныя рысы. Групы гаворак паўднёва-заходняга дыялекту: заходняя (гродзенска-баранавіцкая), усходняя (слуцка-бабруйская) і паўднёвая (палеская). Месца палескай групы гаворак у паўднёва-заходнім дыялекце.

Іншы погляд на вывучэнне груп гаворак у складзе дыялектаў: полацка-мінская (полацкая), віцебская і ўсходнемагілёўская групы ў паўночна-ўсходнім дыялекце; гродзенска-баранавіцкая, слуцкая, мазырская, палеская групы ў паўднёва-заходнім дыялекце (А.Крывіцкі).

4.4. Сярэднебеларускія (пераходныя) гаворкі. Тэрыторыя пашырэння. Спалучэнне ў іх моўных рыс паўднёва-заходняга і паўночна-ўсходняга дыялектаў. Спецыфічныя моўныя рысы сярэднебеларускіх гаворак.

Дыялектныя зоны як вынік культурна-гістарычнай еднасці беларускай дыялектнай мовы: паўночна-заходняя, паўднёва-ўсходняя, заходняя, усходняя і цэнтральная. Тыповыя моўныя рысы кожнай дыялектнай зоны.

5. Беларуская дыялектная мова.

5.1. Адзінства беларускай дыялектнай мовы ў асноўных лексіка-граматычных катэгорыях. Фанетыка. Адзінства беларускай дыялектнай мовы ў асноўных лексіка-граматычных катэгорыях: колькасць часцін мовы, тыпы сказаў, род, лік, склон, скланенне, спражэнне, час, асоба і інш. Сувязь паміж рознымі ўзроўнямі дыялектнай мовы і іх узаемная абумоўленасць.

Фанетыка. Адзінства асноўных асаблівасцей фанетычнай сістэмы беларускай дыялектнай мовы: аканне, яканне, дзеканне, цеканне, цвёрдыя шыпячыя і р, фрыкатыўны г і інш.

Тры тыпы тэрытарыяльных адрозненняў на фанетычным узроўні: а) па інвентары (колькасці) фанем, б) па якасці фанем, в) па характары пазіцыйных змен.

Шасціфанемная і васьміфанемная вакалічныя сістэмы беларускай дыялектнай мовы. Тэрытарыяльна абмежаваныя ў гаворках фанемы /ô/ (закрытая) і /ê/ (закрытая), фанетычныя ўмовы іх узнікнення.

Супрацьпастаўленне санорных /р/ і /р’/, афрыкат /дз’/, /ц’/ і змычных /д(д’)/, /т(т’)/, шыпячых /ж/ і /ж’/, /ч/ і /ч’/, /ш/ і /ш’/, /дж/ і /дж’/, свісцячых /ц/ і /ц’/ у беларускіх гаворках.

Рэгулярныя фанетычныя змены ў беларускай дыялектнай мове. Лабіялізацыя – змяненне этымалагічнага (ы) на (у) пасля губных (*буў, вурасло, му*); змяненне (а) на (о) перад [ў] (*броў, гулёў, зоўтра*). Чаргаванне галосных /е/ – /о/ (*цешча і цёшча, далеко і далёка*) і інш.

Асаблівасці вымаўлення ненаціскных галосных у залежнасці ад фанетычнай пазіцыі. Колькасная і якасная рэдукцыя. Пазіцыйныя змяненні ненаціскных галосных пад уздзеяннем зычных (*бузар, кувaль, пубраў*) і галосных суседніх складоў (*балы, дукумент, патанне*).

Тыпы ненаціскнога вакалізму беларускіх гаворак у пазіцыі пасля цвёрдых і зацвярдзелых зычных – аканне і оканне. Дысімілятыўнае і недысімілятыўнае аканне. Дысімілятыўнае аканне з элементамі асіміляцыі. Поўнае і няпоўнае недысімілятыўнае аканне. Поўнае недысімілятыўнае аканне – арфаэпічная норма беларускай літаратурнай мовы.

Оканне. Гіпероканне – вымаўленне [о] на месцы этымалагічнага [а] у асобных гаворках (*довай, трова*). Вымаўленне на месцы этымалагічнага [о] гука [у] (*вуда, снупы*).

Вакалізм пераходнага (змешанага) тыпу. Дысімілятыўна-недысімілятыўнае аканне. Змешаны вакалізм з оканнем і аканнем.

Галосныя ў пачатку слова. Адпадзенне галосных і яго прычыны (*на гню, хто'ткул*). З'яўленне галосных у пачатку слова (*аралля, апалонка*).

Тыпы ненаціскнога вакалізму беларускіх гаворак у пазіцыі пасля мяккіх зычных – яканне і еканне. Дысімілятыўнае яканне, віцебскае яканне як яго разнавіднасць.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Недысімілятыўнае яканне, поўнае і няпоўнае. Недысімілятыўнае няпоўнае яканне – арфаэпічная норма сучаснай беларускай літаратурнай мовы.

Еканне. Асаблівасці яго праяўлення ў заходнепалескіх гавораках (*вэсна, сэстра, зымля, гныздо*).

Рэшткі цокання ў асобных гаворках паўночнага ўсходу Беларусі.

Прыстаўныя зычныя /в/, /г/, асаблівасці іх ужывання ў дыялектнай мове (*вуха, возяра, гарэх, гануча, гуліца, вакно*). Адсутнасць прыстаўных /в/, /г/ у некаторых гаворках (*озеро, око, ухо*).

Нерэгулярныя фанетычныя змены ў беларускай дыялектнай мове. Варыянтнасць зычных на аснове якасных прыкмет: варыянтнасць губных (*каблук – камлук, помніць – поўніць, бульба – бульва, фортка – хвортка* і інш.); варыянтнасць пярэднеязычных (*серы – шэры, цапля – чапля, лядашчы – лядашты, супонь – цупонь, багуннік – багуднік* і інш.); варыянтнасць заднеязычных (*закутаць – захутаць, рэшта – рэхта* і інш.); варыянтнасць шумных, аднолькавых паводле спосабу ўтварэння (*тырса – кірса, вырай – гырэй*); варыянтнасць санорных (*неріт – мерет, грузд – глузд, вымя – лымя*); варыянтнасць звонкіх і глухіх зычных (*плуска – блуска, мыза – мыса, цвік – дзвік*); варыянтнасць цвёрдых і мяккіх (*бадзяк – бадзяк, мянтуз – мантуз*).

Варыянтнасць галосных на аснове якасных прыкмет (*плюшнік – плішнік, дзірка – дзюрка, ажымкі – ажэмкі, занудзіць – заныдзіць, курган – кургон, дзюжыць – дзяжыць*).

Нерэгулярныя фанетычныя з'вы квалітатыўна-дыстрыбутыўнага характару. Пратэза галосных (*корак – акорак, кмен – укмен, змрок – ізмрок*).

Пратэза зычных (*Андрэй – Яндрэй, іней – віней, іншы – гіншы, ячая – лячая, ажыны – важыны, аранне – гаранне, ануча – гануча, адуванчык – надуванчык, рапуха – хропуха, цень – сцень, асны – дзясны*).

Адпадзенне пачатковых фанем (*алешнік – лешнік, асіна – сіна, ікра – кра, галялёд – алялёд, зверабой – верабой, якраз – акраз, смаршчок – маршчок, красуе – расуе*).

Эпентэза галосных (*клоп – калоп, чэрпаць – чарэпаць*) і зычных фанем (*шуга – шурга, ажавіннік – аржавіннік, цяміць – цямніць, ахотнік – ахвотнік, кролік – кроглік, баня – байня*).

Дыярэза галосных (*баранавацъ – барнаваць, спарыня – спарня, пагібаць – пагбаць*), зычных (*агрэх – арэх, гвоздзь – гоздь, выскваркі – вускаркі*) і складоў (*калаваротка – каваротка, галамутыць – гамутыць*).

Метатэза фанем: метатэза галоснай і зычнай (*кракавінне – каркавінне, громада – гормада, глыток – гылток, гарабіна – аграбіна*), зычных фанем (*жаўранак – жарванак, бондар – боднар, набгом – нагбом, рудлёўка – людроўка, серадольшы – селядоршы, дзяруга – радзюга*) і складовая (*лупаваты – валупаты*).

Прыпадабненне (асіміляцыя) звонкіх да глухіх (*галупка, сцешка, ніска*), адсутнасць асіміляцыі звонкіх да глухіх у частцы гаворак (*цяжка, бабка, лодка*). Аглушэнне звонкіх зычных на канцы слова (*дуп, стох, нош*), адсутнасць аглушэння ў частцы гаворак (*зуб, рог, вуж*). Асіміляцыя шыпячых да свісцячых (*вучысся, смяйесся*).

5.2. Марфалогія. Сінтаксіс. Лексіка. Фразеалогія.

Назоўнік. Адрозненні ў формах роду (*вялікая стада – вялікае стадо, мой метр – мая метра*). Адрозненні ў катэгорыі ліку (*плоскані – плоскунь, казлы – казёл* 'сажань', *калапні – калапня* 'каноплі'). Рэшткі формаў парнага ліку назоўнікаў у паўднёва-заходніх гаворках (*дзвê назê, дзвê хацê, дзвê вядрэ, ушыма, вачыма, у вушшу, у ваччу*).

Скланенне назоўнікаў у адзіночным ліку. Дыялектныя адрозненні назоўнікаў мужчынскага і ніякага роду: больш шырокае ўжыванне формы роднага склону з канчаткам -у (*моста, саветy, каля Слуцку*); формы назоўнікаў давальнага і меснага склонаў на -ові (-овы) (*хлопцаві (хлопцёвы), чоловекові (чоловіковы), пры братові (братовы), в кожухові (в кожуховы)*); варыянтнасць канчаткаў меснага склону ў беларускіх гаворках (*у кажуху, у*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

кажусе, у лесі, у цабрэ, у роця і інш.) Форма клічнага склону (*тато! дзядзько! голубе! сынку! Сцяпане*).

Дыялектныя адрозненні назоўнікаў жаночага роду: родны склон (*была ў сястрэ, да дачке, да зямлі, з ліпу, ад галаву*), давальны склон (*вадзе, воді, мамы, хаця, бабі*), месны склон (*па назе̂, на горэ, на голові, на вайны, на спіны, на дарозя, пры фермі*).

Асаблівасці скланення назоўнікаў жаночага роду з нулявым канчаткам тыпу *мыш, гусь* і пад.

Дыялектныя адрозненні назоўнікаў з суфіксам -онак (-ёнак), якія абазначаюць маладых істот. Скланенне назоўнікаў на -мя, а таксама назоўнікаў *маці, свякроў* у розных гаворках. Асаблівасці скланення назоўнікаў мужчынскага роду на -а (-я) (*дзядзька (дзядзько), тата (тато*).

Скланенне назоўнікаў у множным ліку. Агульнаўжывальныя і дыялектныя канчаткі назоўнікаў (*дубэ, кашэ; дзяўке, сарачке; сёла, вокна; братом, па лугох; дубамі, людзьмі, граблямы, з рукам*).

Займеннік. Дыялектныя адрозненні ў скланенні займеннікаў: формы асабовых і асабова-ўказальных займеннікаў *я*, *ты*, *мы* (*му*), *вы* (*ву*, *вітэ*), *ён* (*вон*, *він*, *вôн*), *яна* (*вона*), *яно* (*воно*), *яны* (*воны*). Семантычныя адрозненні і скланенне ўказальных займеннікаў *той*, *гэты*, *гэны*. Склонавыя формы прыналежных займеннікаў *мой*, *твой*, *свой*. Прыналежныя займеннікі *ягоны*, *ейны*, *іхны* (*іхні*), *усіхны*. Няпэўныя займеннікі з постфіксамі -сці, -ль, -та, -небудзь і прыстаўкай абы-.

Прыметнік. Поўныя і кароткія формы прыметнікаў у беларускіх гаворках. Дыялектныя адрозненні скланення прыметнікаў у адзіночным ліку. Скланенне прыметнікаў у множным ліку. Злітыя (сцягнутыя) канчаткі ў формах прыметнікаў. Утварэнне формаў ступеней параўнання прыметнікаў у беларускай дыялектнай мове.

Лічэбнік. Дыялектныя формы ўласна колькасных, зборных і дробавых лічэбнікаў. Асаблівасці скланення колькасных і парадкавых лічэбнікаў у гаворках. Злітыя (сцягнутыя) канчаткі ў парадкавых лічэбніках.

Дзеяслоў. Формы інфінітыва на -ць, -ці (-ты) пасля асновы на галосны (*рабіць, хадзіць, рабіці, хадзіці, робыты, ходыты*); на -ці (-ць) пасля асновы на зычны (*прасці, несці, прасць, несць*); на -чы (-ці, -ц) пасля асновы на заднеязычныя [г], [к] (*бегчы, таўчы, бегці, таўкці, бегч, тоўч).*

Варыянты постфікса -ся ў зваротных дзеясловах: -ся, -сі, -се, -сь -сё, -са, -со, -сэ, -с.

Дыялектныя асаблівасці ў асновах дзеясловаў. Адсутнасць – наяўнасць чаргавання ў аснове на заднеязычны (*сяку, сякеш (сячэш), сякець (сячэць*). Наяўнасць – адсутнасць шыпячага ў асабовых формах дзеясловаў з асновай на заднеязычны (*сцеражу (сцерагу), сцеражэш, сцеражэ*). Зацвярдзенне зычнага асновы ў форме першай асобы множнага ліку (*ідом, пойдам*). Асаблівасці чаргавання ў дзеясловах з асновай на губны зычны (*любіць, люблю, любліш*).

Дыялектныя адрозненні ў спражэнні дзеясловаў. Формы трэцяй асобы адзіночнага ліку першага і другога спражэння з -ць і без -ць (*ідзець, ідзе; просіць, носіць, прося, кося*). Формы першай асобы множнага ліку (*нясём, нясем, нясемо, нысэмо*). Канчаткі другой асобы множнага ліку (*бераце, берацё, бярэце, бырытэ*). Формы трэцяй асобы множнага ліку першага і другога спражэнняў (*ходзяць, ходзюць, кажаць, кажуць*).

Формы будучага складанага часу. Сінтэтычная (злітная) форма (*гаварыцьму, гаварыцьмеш, гаварыцьме, гаварыцьмем, гаварыцьмеце, гаварыцьмуць*). Складаная форма прошлага часу ў гаворках (*яна была пайшоўшы*).

Дыялектныя адрозненні ў формах загаднага ладу дзеясловаў (*кладзі, кладзіка (кладзітка), кладзіце, кладзеце (кладзеця), ляшча, намашча, нясем, касем, сядзьма, кіньма, жнімо, ідзімо* і інш.).

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Прыслоўе. Дыялектныя асаблівасці ў спосабах утварэння прыслоўяў: ад назоўнікаў (*духном* 'хутка', *сілом, далавах* 'унізе', *пазагораю*); ад прыметнікаў (*горно, дзіўне*); ад займеннікаў (*кадзе*); ад лічэбнікаў (*удзвейгу, паперва*); ад дзеясловаў (*прыскакам, прыхваткам, бегма*); ад прыслоўяў (*замала, задужо*). Дыялектныя асаблівасці ўтварэння ступеней параўнання прыслоўяў.

Дыялектныя асаблівасці ў складзе і спосабах утварэння прыназоўнікаў, злучнікаў, часціц.

Акцэнтныя асаблівасці розных часцін мовы ў беларускіх гаворках.

Сінтаксіс. Дыялектныя асаблівасці ў структуры словазлучэнняў. Беспрыназоўнікавыя словазлучэнні (*купіў гармоніка, прывезлі гасцінца; пасвіў каровы, пагадаваў дзеці; гэтым годам, гэтай парой; ад работы не атхлынесса яму на хазяйсцве жывучы*).

Прыназоўнікавыя словазлучэнні (*паехаў у дровы, паехаў па дровы, паехаў за дравамі; пчала ляціць паўз нос (каля носу)* і інш.).

Дыялектныя адрозненні ў структуры простага сказа. Асаблівасці выражэння дзейніка ў двухсастаўных сказах (*трох прыйшло, двох хлопчыкаў бегаіць, коню ляціць*). Выражэнне выказніка ў простым сказе (*яны буракі пасадзіўшы, маці паехаўшы; была букет сабраўшы, была ўчадзеўшы* і інш.).

Дыялектныя адрозненні ў структуры складанага сказа.

Лексіка. Дыялектныя адрозненні ў лексіцы.

Агульнанародныя і дыялектныя словы ў лексіцы беларускіх гаворак. Асноўныя прыкметы дыялектнага слова. Дыялектныя словы ў розных семантычных групах традыцыйнай лексікі: назвы прадметаў хатняга ўжытку, сельскагаспадарчых прылад працы і іх частак, палявых культур, вопраткі, пабудоў, іх дэталей, раслін, жывых істот і інш.

Гістарычныя пласты ў лексіцы сучасных беларускіх гаворак.

Запазычаныя словы ў складзе дыялектнай лексікі (літуанізмы, паланізмы, германізмы, лацінізмы і інш.), іх адаптацыя ў беларускай дыялектнай мове.

Асноўныя тыпы дыялектных адрозненняў у лексіцы. Несупрацьстаўленыя лексічныя адрозненні. Супрацьстаўленыя лексічныя адрозненні: уласналексічныя (*плоская – плаўная – ложная – адхоная – пахілая – хілая – слосная – простая – спаховістая – нястромкая – плыткая* 'пакатая (страха)'; этнаграфічныя *(цурка – кныбель* 'прылада для вязання снапоў'); лексіка-словаўтваральныя *(пагалоскі – адгалоскі – пагалос – водгаласкі* 'рэха'); лексіка-семантычныя *(жычка* 'тырвоная стужка' – *жычка* 'крапіва з дробным лісцем'); лексіка-фанематычныя *(журавіны* – 'журавіны', *папераць* – 'папараць'); лексіка-граматычныя (*танка* ж.р. – 'танк'); акцэнталагічныя (*таўсты́* – 'тоўсты').

Лексіка-семантычныя сувязі ў сістэме гаворак. Полісемія. Аманімія. Сінанімія. Матываванасць дыялектных слоў.

Змены ў дыялектнай лексіцы, звязаныя з сучаснымі працэсамі развіцця тэрытарыяльных гаворак.

Фразеалогія. Дыялектныя адрозненні ў фразеалогіі. Агульнапашыраныя і тэрытарыяльна абмежаваныя фразеалагізмы. Прыкметы дыялектных фразеалагізмаў: адсутнасць у літаратурнай мове (*кідацца да рук* 'вельмі моцна прасіць', *сівая жызня* 'цяжкае бязрадаснае жыццё'), семантычная адметнасць (*як мыш пад мятлой* 'ізалявана, адзінока'), наяўнасць у структуры фразеалагізма дыялектнага кампанента (*лье як у фарыну* 'п'е без меры', *борухі вадзіць* 'спаць седзячы').

Сінанімічнасць фразеалагізмаў (*качка стопча, кату па пяту, свінні па каўнер* 'вельмі малы'). Полісемія фразеалагізмаў (*да галавы браць* 'моцна хвалявацца, турбавацца, непакоіцца за што', 'запамінаць што, цікавіцца чым'). Сувязь дыялектнай фразеалогіі з фразеалогіяй літаратурнай мовы.

6. Дыялектная лексікаграфія і фразеаграфія.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

6.1. Дыялектная лексікаграфія. Дыялектная лексікаграфія (дыялектаграфія) як самастойны раздзел сучаснай беларускай апісальнай дыялекталогіі.

Мэты, задачы, прынцыпы і прыёмы навуковага даследавання ў дыялектаграфіі.

Тыпы дыялектных слоўнікаў і прынцыпы іх укладання. Дыялектныя слоўнікі поўныя і дыферэнцыйныя. Слоўнікі дыялектызмаў з твораў пісьменнікаў.

Тры асноўныя этапы ў гісторыі беларускай дыялектнай лексікаграфіі.

Этнаграфічны этап, яго храналагічныя межы і асаблівасці. Першыя спробы збірання дыялектнай лексікі і іх навуковае значэнне (А.Меер, К.Калайдовіч, Я.Чачот, П.Шпілеўскі, І.Грыгаровіч, С.Мікуцкі і інш.).

Этналінгвістычны этап як састаўная частка агульнага апісання беларускай мовы. "Словарь белорусского наречия" (1870) І.Насовіча – першы грунтоўны слоўнік беларускай мовы. Лексікаграфічныя здабыткі З.Радчанкі, С.Малевіча, М.Нікіфароўскага, Е.Раманава і інш. Лексікаграфічная спадчына Я.Карскага.

Дыялектаграфічны этап у гісторыі беларускай дыялектнай лексікаграфіі. "Смоленский областной словарь" (1914) У.Дабравольскага – першая праца гэтага тыпу. Праграма па складанні слоўнікаў беларускай мовы Інстытута беларускай культуры (Інбелкульта). Краёвыя слоўнікі М.Каспяровіча, М.Шатэрніка, І.Бялькевіча, А.Крукоўскага.

Развіццё беларускай дыялектнай лексікаграфіі ў другой палове XX ст. – пачатку XXI ст. Асаблівасці лексікаграфічнай праграмы Інстытута мовазнаўства Акадэміі навук Беларусі і вынікі яе рэалізацыі.

Вывучэнне лексікі беларускіх гаворак па асобных раёнах.

Лексікаграфічнае даследаванне гаворак Магілёўшчыны. Лексіка Глушчыны ў "Дыялектным слоўніку" Ф.Янкоўскага (1959, 1960, 1970), першым пасляваенным рэгіянальным слоўніку, прынцыпы адбору і падачы матэрыялу ў ім. Лексіка Мсціслаўшчыны ў працах Г.Юрчанкі "Дыялектны слоўнік" (1966), "Народная сінаніміка" (1969), "Народнае вытворнае слова" (1981, 1983, 1985), "Сучаснае народнае слова" (1988), "Сучасная народная лексіка" (1993, 1996, 1998), “Народная мудраслоўе” (2002). Гаворкі Бялыніцкага раёна ў слоўніку Р.Яўсеева "Маці казала так…" (1978). "Матэрыялы да абласнога слоўніка Магілёўшчыны" (1981; вып. 2 2005). Аматарскі слоўнік В.Арцем’ева “Слоўцы-адмыслоўцы: эсэ, абразкі і слоўнік дыялектаў з Оршаці і Радзішына” (2010).

Лексікаграфічнае даследаванне гаворак Віцебшчыны: “Дыялектны тэматычны слоўнік найменняў іхтыя- і герпетафауны Беларускага Паазер’я” Т.Грачыхі (2006), “Рэгіянальны слоўнік Віцебшчыны” (2012), “Мова Сенненшчыны”, т. 1, 2 (2015).

Лексікаграфічнае даследаванне гаворак Гродзеншчыны. Лексіка Зэльвеншчыны ў "Дыялектным слоўніку" (1970), “Слоўніку народнай мовы Зэльвеншчыны” (2005), "Народнай лексіцы" (1970), "Народнай лексіцы і словаўтварэнні" (1972) П.Сцяцко. Працы Т.Сцяшковіч "Матэрыялы да слоўніка Гродзенскай вобласці" (1972) і "Слоўнік гаворак Гродзенскай вобласці" (1983). Гаворкі Гродзенскага раёна ў слоўніку А.Цыхуна "Скарбы народнай мовы" (1993). "Слоўнік рэгіянальнай лексікі Гродзеншчыны" (1999).

Лексікаграфічнае даследаванне гаворак Гомельшчыны. "Дыялектны слоўнік Лоеўшчыны" (1982) Т.Янковай. “Палескі слоўнік” І.Кучука, А.Малюка (2000). Пяцітомны "Тураўскі слоўнік" (1982-1987) – найбольш буйное дасягненне палескай лексікаграфіі. "Матэрыялы для дыялектнага слоўніка Гомельшчыны" (1975-1982). Лексіка перыферыйных беларускіх гаворак у "Словаре народных говоров западной Брянщины" (1973) П.Растаргуева.

Лексікаграфічнае даследаванне гаворак Міншчыны. "Слоўнік гаворак цэнтральных раёнаў Беларусі" (т.1, 1990) і "Матэрыялы да слоўніка мінска-маладзечанскіх гаворак" (1970, 1974, 1977). Лексіка Лагойшчыны ў слоўніку А.Варлыгі (1970).

Лексікаграфічнае даследаванне гаворак Брэстчыны. "Дыялектны слоўнік Брэстчыны" (1989), “Слова да слова – будзе мова: Дыялектны слоўнік в. Фядоры” (2010) С.Клундук, “Дыялектны слоўнік Косаўшчыны” (2011) А.Зайкі, “Сказана – звязана” (2013) В.Касцючык,

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

“Альпенскі дыялектны слоўнік” (2004) І.Ляшкевіча, “Мова прадзедаў, мова дзядоў: Дыялектычны слоўнік лабарскай гаворкі” (2006) Я.Шэмет і Г.Валавень, “Палескі архіў” В.Вярэніча (2009).

Пяцітомны "Слоўнік беларускіх гаворак паўночна-заходняй Беларусі і яго пагранічча" (1979-1986) як новы тып слоўніка ў беларускай дыялектнай лексікаграфіі, што адлюстроўвае слоўнае багацце паўночна-заходняй дыялектнай зоны і беларускіх гаворак за межамі Беларусі (на тэрыторыі Латвіі, Літвы, Польшчы).

Збор рэгіянальнай лексікі з розных месцаў Беларусі Л.Шаталавай "Беларускае дыялектнае слова" (1975), Н.Гілевіч “Дыялектны слоўнік”(2005), В.Мілкоўскага “Матчына слова” (выд. 2-е, 2011) і інш.

Зборнікі дыялектнай лексікі з розных рэгіёнаў Беларусі: "Матэрыялы для слоўніка народна-дыялектнай мовы" (1960), "Полесье" (1968), "Лексика Полесья" (1968), "З народнага слоўніка" (1975), "Народнае слова" (1976), "Народная лексіка" (1977), "Жывое слова" (1978), "Народная словатворчасць" (1979), "Жывое народнае слова" (1992), "Гавораць Чарнобыльцы" (1994), “Жывое наша слова” (2001), “Скарбы народнай мовы” (2005), “Народныя скарбы” (2008), “Беларуская дыялекталогія: Матэрыялы і даследаванні”, вып. 1 (2010); вып. 2 (2012), вып. 3 (2014), вып. 4 (2016), вып. 5 (2018); асобныя публікацыі слоўнічкаў у шматлікіх навуковых, навукова-папулярных, літаратурна-мастацкіх і іншых выданнях.

Тэматычныя дыялектныя слоўнікі па беларускай дыялектнай мове “Жывёльны свет” (1999), “Раслінны свет” (2001), “Чалавек” (2006), “Сельская гаспадарка” (2010), “Вопыт літаратурна-дыялектнага слоўніка беларускай мовы” (1999) У.Анічэнкі, “Слоўнік народных промыслаў і рамёстваў Беларусі” (2010) М.Макарэвіча і інш. як падрыхтоўчы этап для стварэння “зводнага” слоўніка беларускіх гаворак.

Слоўнік-даведнік М.Абабуркі "Дыялектызмы ў творах беларускіх савецкіх пісьменнікаў" (1979).

6.2. Дыялектная фразеаграфія. Слоўнікі беларускай дыялектнай фразеалогіі, прынцыпы іх складання. "Беларуская фразеалогія" (1968) Ф.Янкоўскага – першы беларускі слоўнік дыялектнай фразеалогіі. "Слоўнік беларускай народнай фразеалогіі" (1972) Е.Мяцельскай і Я.Камароўскага. Тры выпускі фразеалагічнага слоўніка Г.Юрчанкі "І коціцца і валіцца" (1972), "І сячэ і калоць" (1974), "Слова за слова" (1977) – унікальны ў славянскай фразеаграфіі збор устойлівых словазлучэнняў з адной гаворкі Мсціслаўшчыны. "З народнай фразеалогіі: Дыферэнцыяльны слоўнік" І.Лепешава (1991). “Слоўнік дыялектнай фразеалогіі Гродзеншчыны” М.Данілавіча (2000). “Прыказкі і прымаўкі” А.Аксамітава (2002) – публікацыя фразеалогіі з архіўных крыніц, рэдкіх выданняў і кафедральных збораў. “Слоўнік беларускіх народных параўнанняў” (2011) як вопыт збору вобразных канструкцый.

7. Дыялектная аснова літаратурнай мовы. З гісторыі фарміравання нацыянальных літаратурных моў. Значэнне тэрміна “літаратурная мова” ў сучасным мовазнаўстве. Асаблівасці фарміравання беларускай літаратурнай мовы ў 17 – пачатку 20 стст. Агульнабеларускія моўныя рысы і іх роля ў стварэнні сучаснай літаратурнай мовы. Важнейшыя асаблівасці паўднёва-заходняга і паўночна-ўсходняга дыялектаў у складзе літаратурнай мовы. Значэнне сярэднебеларускіх гаворак у станаўленні літаратурнай мовы і яе нормаў. Дваісты характар нормаў сучаснай беларускай літаратурнай мовы.

8. Дыялекталогія і выкладанне роднай мовы і літаратуры ў школе. Дыялектная аснова мовы вучняў і засваенне нормаў літаратурнай мовы. Патрабаванні школьных праграм да культуры вуснай і пісьмовай мовы вучняў.

Дыферэнцыяльны падыход да выкладання роднай мовы ў дыялектных умовах – асноўнае патрабаванне да працы настаўніка. Сістэматычнае назіранне над мовай вучняў. Выяўленне і класіфікацыя дыялектных адхіленняў у вуснай і пісьмовай мове. Аналіз

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

памылак, звязаных з уплывам роднай гаворкі. Супастаўленне дыялектных з'яў з адпаведнымі з'явамі літаратурнай мовы. Папярэджанне дыялектных памылак.

Назіранні вучняў за дыялектнымі асаблівасцямі мясцовай гаворкі, збор лексічнага матэрыялу і складанне дыялектных мікраслоўнікаў. Назіранні за ўжываннем дыялектызмаў у творах беларускай мастацкай літаратуры. Дыялектызмы ў творах пісьменнікаў, якія нарадзіліся ў гэтым раёне, вобласці. Запіс і аналіз вучнямі фальклорных твораў, у якіх адлюстроўваюцца дыялектныя з'явы роднай гаворкі.

Назіранні школьнікаў за вуснай мовай аднакласнікаў і ўласнай мовай.

Арганізацыя ў кабінеце беларускай мовы кутка "Родная гаворка".

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНАЯ КАРТА
(дзённая форма атрымання адукацыі)

Нумар раздзела, тэмы, заняткаў	Назва раздзела, тэмы, заняткаў; пералік вывучаемых пытанняў	Колькасць аўдыторных гадзін					Матэрыяльнае забеспячэнне заняткаў (наглядныя, метадычныя дапаможнікі і інш.)	Літаратура	Форма контролю ведаў
		Лекцыі	практычныя заняткі	КСР		самастойная работа студэнтаў			
				лекцыі	практычныя				
БЕЛАРУСКАЯ ДЫЯЛЕКТАЛОГІЯ (44 гадзіны)		**18**	**18**	**2**	**4**	**42**			
1.	**УВОДЗІНЫ (1 г.)**	**1**							
	1. Прадмет, змест і задачы курса "Беларуская дыялекталогія", яе месца ў сістэме філалагічнай адукацыі. 2. Навукова-тэарэтычнае значэнне дыялекталогіі. Сувязь дыялекталогіі з іншымі навукамі: лінгвістычнымі; нелінгвістычнымі. 3. Практычнае значэнне вывучэння дыялекталогіі пры авалоданні нормамі беларускай літаратурнай мовы. Выкарыстанне фактаў дыялекталогіі ў выкладанні курса беларускай мовы ў школе. 4. Выхаваўчае значэнне дыялекталогіі ў фарміраванні маўленчай культуры асобы.	1						[1], [2], [5]	
2.	**ДЫЯЛЕКТАЛОГІЯ ЯК РАЗДЗЕЛ МОВАЗНАЎСТВА (5 г.)**	**1**	**4**			**4**			
2.1.	*Дыялектная мова і літаратурная мова – асобныя формы існавання нацыянальнай мовы.* 1. Апісальная і гістарычная дыялекталогія. 2. Сістэма навуковых паняццяў у дыялекталогіі. 3. Тэрытарыяльныя дыялекты. Сацыяльныя дыялекты, сфера іх выкарыстання. 4. Асноўныя раздзелы дыялекталогіі, аб'екты іх даследаванняў. 5. Крыніцы вывучэння беларускай дыялектнай мовы. Запісы фальклярыстаў, этнографаў XIX – XXI стст., мастацкія творы пачатку фарміравання сучаснай беларускай літаратурнай мовы, матэрыялы дыялектолагаў XIX – XXI стст., дыялектныя слоўнікі, хрэстаматыі вуснага маўлення, лінгвістычныя атласы і інш. 6. Метады даследавання дыялектнай мовы. Асаблівасці запісу матэрыялаў па лексіцы, фанетыцы,	1						[2], [3], [4], [5]	

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

	марфалогіі і сінтаксісе. Апрацоўка сабранага дыялектнага матэрыялу, пашпартызацыя, каталагізацыя і захоўванне. 7. Праграмы і інструкцыі для збірання дыялектнага матэрыялу, іх тыпы ў залежнасці ад мэт і задач даследаванняў.								
	Дыялектная мова і літаратурная мова – дзве формы існавання нацыянальнай мовы. 1. Тэрытарыяльныя дыялекты. Сацыяльныя дыялекты, сфера іх выкарыстання. 2. Асноўныя раздзелы дыялекталогіі, аб'екты іх даследаванняў. 3. Крыніцы вывучэння беларускай дыялектнай мовы. Запісы фальклярыстаў, этнографаў XIX – XXI стст., мастацкія творы пачатку фарміравання сучаснай беларускай літаратурнай мовы, матэрыялы дыялектолагаў XIX – XXI стст., дыялектныя слоўнікі, хрэстаматыі вуснага маўлення, лінгвістычныя атласы і інш. 4. Метады даследавання дыялектнай мовы. Асаблівасці запісу матэрыялаў па лексіцы, фанетыцы, марфалогіі і сінтаксісе. Апрацоўка сабранага дыялектнага матэрыялу, пашпартызацыя, каталагізацыя і захоўванне. 5. Праграмы і інструкцыі для збірання дыялектнага матэрыялу, іх тыпы ў залежнасці ад мэт і задач даследаванняў.		2			2		[2], [3], [4], [5]	Апытванне, вусныя паведамленні
2.2.	*З гісторыі беларускай дыялекталогіі.* 1. Станаўленне і развіццё беларускай дыялекталогіі (XIX – пачатак XX ст.). 2. Адлюстраванне асаблівасцей беларускіх гаворак на розных моўных узроўнях у фальклорных і этнаграфічных працах першай паловы XIX ст. Першыя спробы вызначэння межаў беларускай дыялектнай мовы, характарыстыкі і класіфікацыі гаворак у іх працах. 3. Апісанне характэрных фанетычных і марфалагічных асаблівасцей беларускіх гаворак, публікацыі асобных мясцовых слоў, падборак фразеалагізмаў і невялікіх слоўнікаў у працах этнографаў і фальклярыстаў другой паловы XIX – пачатку XX ст. 4. Лінгвістычнае даследаванне гаворак беларускай мовы. Значэнне даследаванняў Я.Карскага ў распрацоўцы разнастайных праблем беларускай дыялекталогіі. 5. Развіццё беларускай дыялекталогіі ў паслякастрычніцкі перыяд. Камісія Інбелкульта (1925) па ўкладанні слоўніка жывой беларускай мовы, вынікі яе дзейнасці. 6. Дыялекталагічныя даследаванні беларускіх гаворак у пасляваенны перыяд. 7. Вывучэнне беларускай дыялектнай мовы замежнымі навукоўцамі. 8. Праграмы, вучэбныя дапаможнікі, хрэстаматыі па беларускай дыялекталогіі.		2			2		[2], [3], [4], [5]	Рэфераты
3.	**ЛІНГВІСТЫЧНАЯ ГЕАГРАФІЯ (4 г.)**	**2**	**2**			**8**			
	1. Прадмет, змест і задачы лінгвістычнай геаграфіі. Сістэма навуковых паняццяў: праграма (апытальнік), сетка апорных населеных пунктаў, лінгвістычная карта, лінгвістычны атлас, ізаглоса, пучок ізаглосаў, арэал, дыялектная зона. Дыялектныя адрозненні як аб'ект картаграфавання. Тыпы лінгвістычных карт. Тыпы лінгвістычных атласаў у залежнасці ад моўных узроўняў: а) універсальны, б) тэматычны; у залежнасці ад тэрыторыі даследавання: а) агульнанацыянальны, б) рэгіянальны, в) атласы груп моў, г) сем'яў моў ці кантынентаў. Беларускія дыялектныя асаблівасці на картах гэтых атласаў.	2					карты, атласы	[2], [3]	

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

	2. З гісторыі лінгвагеаграфіі (Г.Венкер, Ж.Жыльерон, Я.Карскі, Маскоўская дыялекталагічная камісія, П.Бузук). Пасляваенны этап у развіцці беларускай лінгвагеаграфіі.								
	1. Прадмет, змест і задачы лінгвістычнай геаграфіі. Сістэма навуковых паняццяў: праграма (апытальнік), сетка апорных населеных пунктаў, лінгвістычная карта, лінгвістычны атлас, ізаглоса, пучок ізаглосаў, арэал, дыялектная зона. Дыялектныя адрозненні як аб'ект картаграфавання. Тыпы лінгвістычных карт. Тыпы лінгвістычных атласаў у залежнасці ад моўных узроўняў: а) універсальны, б) тэматычны; у залежнасці ад тэрыторыі даследавання: а) агульнанацыянальны, б) рэгіянальны, в) атласы груп моў, г) сем'яў моў ці кантынентаў. Беларускія дыялектныя асаблівасці на картах гэтых атласаў. 2. З гісторыі лінгвагеаграфіі (Г.Венкер, Ж.Жыльерон, Я.Карскі, Маскоўская дыялекталагічная камісія, П.Бузук). Пасляваенны этап у развіцці беларускай лінгвагеаграфіі.		2			2 2 2 2	карты, атласы	[2], [3]	Апытанне, рэфераты
4.	**ГРУПОЎКА БЕЛАРУСКІХ ГАВОРАК (14 г.)**	**6**	**6**			**16**			
4.1.	*Звесткі з гісторыі фарміравання беларускіх тэрытарыяльных дыялектаў.* 1. Першая спроба падзелу гаворак беларускай мовы на групы. Падзел Я.Карскім беларускай мовы на паўночна-ўсходні і паўднёва-заходні дыялекты. Групоўка беларускіх гаворак, зробленая Маскоўскай дыялекталагічнай камісіяй. Пытанні групоўкі гаворак беларускай мовы ў працах М.Дурнаво і П.Бузука. Выдзяленне групы пераходных гаворак паміж дыялектамі беларускай мовы. 2. Сучасная групоўка беларускіх гаворак на аснове матэрыялаў "Дыялекталагічнага атласа беларускай мовы". Асноўныя прынцыпы, на якіх заснавана групоўка (этнагенетычны і культурна-гістарычны).	2						[1], [2], [3], [5]	
	Звесткі з гісторыі фарміравання беларускіх тэрытарыяльных дыялектаў. 1. Першая спроба падзелу гаворак беларускай мовы на групы. Падзел Я.Карскім беларускай мовы на паўночна-ўсходні і паўднёва-заходні дыялекты. Групоўка беларускіх гаворак, зробленая Маскоўскай дыялекталагічнай камісіяй. Пытанні групоўкі гаворак беларускай мовы ў працах М.Дурнаво і П.Бузука. Выдзяленне групы пераходных гаворак паміж дыялектамі беларускай мовы. 2. Сучасная групоўка беларускіх гаворак на аснове матэрыялаў "Дыялекталагічнага атласа беларускай мовы". Асноўныя прынцыпы, на якіх заснавана групоўка (этнагенетычны і культурна-гістарычны).		1			2 2		[1], [2], [3], [5]	Апытванне, пісьмовыя і вусныя практыкаванні, аналіз дыялектных тэкстаў
4.2.	*Паўночна-ўсходні дыялект.* 1. Тэрыторыя пашырэння, асноўныя фанетычныя, марфалагічныя, сінтаксічныя і лексічныя рысы. 2. Групы гаворак паўночна-ўсходняга дыялекту: заходняя (полацкая) і ўсходняя (віцебска-магілёўская).	1					магнітафонныя запісы	[2], [3], [4]	

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

	Паўночна-ўсходні дыялект. 1. Тэрыторыя пашырэння, асноўныя фанетычныя, марфалагічныя, сінтаксічныя і лексічныя рысы. 2. Групы гаворак паўночна-ўсходняга дыялекту: заходняя (полацкая) і ўсходняя (віцебска-магілёўская).		1			4	магнітафонныя запісы	[2], [3], [4]	Апытванне, пісьмовыя і вусныя практыкаванні, аналіз дыялектных тэкстаў
4.3.	*Паўднёва-заходні дыялект.* 1. Тэрыторыя яго пашырэння, асноўныя фанетычныя, марфалагічныя, сінтаксічныя і лексічныя рысы. 2. Групы гаворак паўднёва-заходняга дыялекту: заходняя (гродзенска-баранавіцкая), усходняя (слуцка-бабруйская) і паўднёвая (палеская). Месца палескай групы гаворак у паўднёва-заходнім дыялекце. 3. Іншы погляд на вывучэнне груп гаворак у складзе дыялектаў: полацка-мінская (полацкая), віцебская і ўсходнемагілёўская групы ў паўночна-ўсходнім дыялекце; гродзенска-баранавіцкая, слуцкая, мазырская, палеская групы ў паўднёва-заходнім дыялекце (А.Крывіцкі).	1					відэазапіс	[2], [3], [4]	
	Паўднёва-заходні дыялект. 1. Тэрыторыя яго пашырэння, асноўныя фанетычныя, марфалагічныя, сінтаксічныя і лексічныя рысы. 2. Групы гаворак паўднёва-заходняга дыялекту: заходняя (гродзенска-баранавіцкая), усходняя (слуцка-бабруйская) і паўднёвая (палеская). Месца палескай групы гаворак у паўднёва-заходнім дыялекце. 3. Іншы погляд на вывучэнне груп гаворак у складзе дыялектаў: полацка-мінская (полацкая), віцебская і ўсходнемагілёўская групы ў паўночна-ўсходнім дыялекце; гродзенска-баранавіцкая, слуцкая, мазырская, палеская групы ў паўднёва-заходнім дыялекце (А.Крывіцкі).		2			4*	відэазапіс	[2], [3], [4]	Апытванне, пісьмовыя і вусныя практыкаванні, аналіз дыялектных тэкстаў
4.4.	*Сярэднебеларускія (пераходныя) гаворкі.* 1. Тэрыторыя пашырэння. Спалучэнне ў іх моўных рыс паўднёва-заходняга і паўночна-ўсходняга дыялектаў. Спецыфічныя моўныя рысы сярэднебеларускіх гаворак. 2. Дыялектныя зоны як вынік культурна-гістарычнай еднасці беларускай дыялектнай мовы: паўночна-заходняя, паўднёва-ўсходняя, заходняя, усходняя і цэнтральная. Тыповыя моўныя рысы кожнай дыялектнай зоны.	2					відэазапіс	[2], [3], [4]	
	Сярэднебеларускія (пераходныя) гаворкі. 1. Тэрыторыя пашырэння. Спалучэнне ў іх моўных рыс паўднёва-заходняга і паўночна-ўсходняга дыялектаў. Спецыфічныя моўныя рысы сярэднебеларускіх гаворак. 2. Дыялектныя зоны як вынік культурна-гістарычнай еднасці беларускай дыялектнай мовы: паўночна-заходняя, паўднёва-ўсходняя, заходняя, усходняя і цэнтральная. Тыповыя моўныя рысы кожнай дыялектнай зоны.		2			4*	відэазапіс	[2], [3], [4]	Апытванне, пісьмовыя і вусныя практыкаванні, аналіз дыялектных тэкстаў

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

5.	**БЕЛАРУСКАЯ ДЫЯЛЕКТНАЯ МОВА (6 г.)**	**4**	**2**			**4**			
5.1.	*Адзінства беларускай дыялектнай мовы ў асноўных лексіка-граматычных катэгорыях. Фанетыка.* 1. Адзінства беларускай дыялектнай мовы ў асноўных лексіка-граматычных катэгорыях. Сувязь паміж рознымі ўзроўнямі дыялектнай мовы і іх узаемная абумоўленасць. 2. Фанетыка. Адзінства асноўных асаблівасцей фанетычнай сістэмы беларускай дыялектнай мовы. 3. Шасціфанемная і васьміфанемная вакалічныя сістэмы беларускай дыялектнай мовы. Тэрытарыяльна абмежаваныя ў гаворках фанемы /ô/ (закрытая) і /ê/ (закрытая), фанетычныя ўмовы іх узнікнення. 4. Супрацьпастаўленне санорных /р/ і /р’/, афрыкат /дз’/, /ц’/ і змычных /д(д’)/, /т(т’)/, шыпячых /ж/ і /ж’/, /ч/ і /ч’/, /ш/ і /ш’/, /дж/ і /дж’/, свісцячых /ц/ і /ц’/ у беларускіх гаворках. 5. Рэгулярныя фанетычныя змены ў беларускай дыялектнай мове. Лабіялізацыя. Чаргаванне галосных і інш. Асаблівасці вымаўлення ненаціскных галосных у залежнасці ад фанетычнай пазіцыі. Колькасная і якасная рэдукцыя. Пазіцыйныя змяненні ненаціскных галосных пад уздзеяннем зычных і галосных суседніх складоў. Тыпы ненаціскнога вакалізму беларускіх гаворак у пазіцыі пасля цвёрдых і зацвярдзелых зычных. Дысімілятыўнае і недысімілятыўнае аканне. Дысімілятыўнае аканне з элементамі асіміляцыі. Поўнае і няпоўнае недысімілятыўнае аканне. Поўнае недысімілятыўнае аканне – арфаэпічная норма беларускай літаратурнай мовы. Оканне. Гіпероканне. Вымаўленне на месцы этымалагічнага [о] гука [у]. Вакалізм пераходнага тыпу. Дысімілятыўна-недысімілятыўнае аканне. Змешаны вакалізм з оканнем і аканнем. Галосныя ў пачатку слова. Адпадзенне галосных і яго прычыны. З'яўленне галосных у пачатку слова. Тыпы ненаціскнога вакалізму беларускіх гаворак у пазіцыі пасля мяккіх зычных. Дысімілятыўнае яканне, віцебскае яканне як яго разнавіднасць. Недысімілятыўнае яканне, поўнае і няпоўнае. Недысімілятыўнае няпоўнае яканне – арфаэпічная норма сучаснай беларускай літаратурнай мовы. Еканне. Асаблівасці яго праяўлення ў заходнепалескіх гавораках. Рэшткі цокання ў асобных гаворках паўночнага ўсходу Беларусі. Прыстаўныя зычныя /в/, /г/, асаблівасці іх ужывання ў дыялектнай мове. Адсутнасць прыстаўных у некаторых гаворках. 6. Нерэгулярныя фанетычныя змены ў беларускай дыялектнай мове. Варыянтнасць зычных на аснове якасных прыкмет: варыянтнасць губных; варыянтнасць пярэднеязычных; варыянтнасць заднеязычных; варыянтнасць шумных, аднолькавых паводле спосабу ўтварэння; варыянтнасць санорных; варыянтнасць звонкіх і глухіх зычных; варыянтнасць цвёрдых і мяккіх. Варыянтнасць галосных на аснове якасных прыкмет. Нерэгулярныя фанетычныя з’вы квалітатыўна-дыстрыбутыўнага характару. Пратэза галосных. Пратэза зычных. Адпадзенне пачатковых фанем. Эпентэза галосных і зычных фанем. Дыярэза галосных, зычных і складоў. Метатэза фанем: метатэза галоснай і зычнай, зычных фанем і складовая. Прыпадабненне звонкіх да глухіх, адсутнасць асіміляцыі звонкіх да глухіх у частцы гаворак. Аглушэнне звонкіх зычных на канцы слова, адсутнасць аглушэння ў частцы гаворак. Асіміляцыя шыпячых да свісцячых.	2						[2], [5]	

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

	Адзінства беларускай дыялектнай мовы ў асноўных лексіка-граматычных катэгорыях. Фанетыка. 1. Адзінства беларускай дыялектнай мовы ў асноўных лексіка-граматычных катэгорыях. Сувязь паміж рознымі ўзроўнямі дыялектнай мовы і іх узаемная абумоўленасць. 2. Фанетыка. Адзінства асноўных асаблівасцей фанетычнай сістэмы беларускай дыялектнай мовы. 3. Рэгулярныя фанетычныя змены ў беларускай дыялектнай мове. Лабіялізацыя. Чаргаванне галосных і інш. Асаблівасці вымаўлення ненаціскных галосных у залежнасці ад фанетычнай пазіцыі. Колькасная і якасная рэдукцыя. Тыпы ненаціскнога вакалізму беларускіх гаворак. Дысімілятыўнае і недысімілятыўнае аканне. Оканне. Гіпераканне. Вакалізм пераходнага тыпу. Змешаны вакалізм з оканнем і аканнем. 4. Нерэгулярныя фанетычныя змены ў беларускай дыялектнай мове. Варыянтнасць зычных на аснове якасных прыкмет. Варыянтнасць галосных на аснове якасных прыкмет. Нерэгулярныя фанетычны[illegible] з'вы квалітатыўна-дыстрыбутыўнага характару. Пратэза. Эпентэза. Дыярэза. Метатэза. Прыпадабненне.		2			2		[2], [5]	Апытванне, пісьмовыя і вусныя практыкаванні, аналіз дыялектных тэкстаў
5.2.	*Марфалогія. Сінтаксіс. Лексіка. Фразеалогія.* 1. Назоўнік. Адрозненні ў формах роду. Адрозненні ў катэгорыі ліку. Рэшткі формаў парнага ліку назоўнікаў у паўднёва-заходніх гаворках. Скланенне назоўнікаў у адзіночным ліку. Дыялектныя адрозненні назоўнікаў мужчынскага і ніякага роду. Форма клічнага склону. Дыялектныя адрозненні назоўнікаў жаночага роду. Дыялектныя адрозненні назоўнікаў з суфіксам -онак (-ёнак), якія абазначаюць маладых істот. Скланенне назоўнікаў на -мя, а таксама назоўнікаў *маці, свякроў* у розных гаворках. Асаблівасці скланення назоўнікаў мужчынскага роду на -а (-я). Скланенне назоўнікаў у множным ліку. Агульнаўжывальныя і дыялектныя канчаткі назоўнікаў. 2. Займеннік. Дыялектныя адрозненні ў скланенні займеннікаў. Семантычныя адрозненні і скланенне ўказальных займеннікаў. Склонавыя формы прыналежных займеннікаў. Няпэўныя займеннікі з постфіксамі -сці, -ль, -та, -небудзь і прыстаўкай абы-. 3. Прыметнік. Поўныя і кароткія формы прыметнікаў у беларускіх гаворках. Дыялектныя адрозненні скланення прыметнікаў у адзіночным ліку. Скланенне прыметнікаў у множным ліку. Злітыя канчаткі ў формах прыметнікаў. Утварэнне формаў ступеней параўнання прыметнікаў у беларускай дыялектнай мове. 4. Лічэбнік. Дыялектныя формы ўласна колькасных, зборных і дробавых лічэбнікаў. Асаблівасці скланення колькасных і парадкавых лічэбнікаў у гаворках. Злітыя канчаткі ў парадкавых лічэбніках. 5. Дзеяслоў. Формы інфінітыва. Варыянты постфікса -ся ў зваротных дзеясловах: -ся, -сі, -се, -сь -сё, -са, -со, -сэ, -с. Дыялектныя асаблівасці ў асновах дзеясловаў. Дыялектныя адрозненні ў спражэнні дзеясловаў. Формы будучага складанага часу. Сінтэтычная форма. Складаная форма прошлага часу ў гаворках. Дыялектныя адрозненні ў формах загаднага ладу дзеясловаў. 6. Прыслоўе. Дыялектныя асаблівасці ў спосабах утварэння прыслоўяў. Дыялектныя асаблівасці ўтварэння ступеней параўнання прыслоўяў. 7. Дыялектныя асаблівасці ў складзе і спосабах утварэння прыназоўнікаў, злучнікаў, часціц. 8. Акцэнтныя асаблівасці розных часцін мовы ў беларускіх гаворках. 9. Сінтаксіс. Дыялектныя асаблівасці ў структуры словазлучэнняў. Дыялектныя адрозненні ў структуры простага сказа. Дыялектныя адрозненні ў структуры складанага сказа.	2						[2], [5]	

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

	10. Лексіка. Дыялектныя адрозненні ў лексіцы. Агульнанародныя і дыялектныя словы ў лексіцы беларускіх гаворак. Асноўныя прыкметы дыялектнага слова. Дыялектныя словы ў розных семантычных групах традыцыйнай лексікі. Гістарычныя пласты ў лексіцы сучасных беларускіх гаворак. Запазычаныя словы ў складзе дыялектнай лексікі, іх адаптацыя ў беларускай дыялектнай мове. Асноўныя тыпы дыялектных адрозненняў у лексіцы. Лексіка-семантычныя сувязі ў сістэме гаворак. Полісемія. Аманімія. Сінанімія. Матываванасць дыялектных слоў. Змены ў дыялектнай лексіцы, звязаныя з сучаснымі працэсамі развіцця тэрытарыяльных гаворак. 11. Фразеалогія. Дыялектныя адрозненні ў фразеалогіі. Агульнапашыраныя і тэрытарыяльна абмежаваныя фразеалагізмы. Прыкметы дыялектных фразеалагізмаў. Сінанімічнасць фразеалагізмаў. Полісемія фразеалагізмаў. Сувязь дыялектнай фразеалогіі з фразеалогіяй літаратурнай мовы.					2			
6.	**ДЫЯЛЕКТНАЯ ЛЕКСІКАГРАФІЯ І ФРАЗЕАГРАФІЯ (6 г)**	**4**	**2**			**12**			
6.1.	*Дыялектная лексікаграфія.* 1. Дыялектная лексікаграфія (дыялектаграфія) як самастойны раздзел сучаснай беларускай апісальнай дыялекталогіі. Мэты, задачы, прынцыпы і прыёмы навуковага даследавання ў дыялектаграфіі. 2. Тыпы дыялектных слоўнікаў і прынцыпы іх укладання. Дыялектныя слоўнікі поўныя і дыферэнцыйныя. Слоўнікі дыялектызмаў з твораў пісьменнікаў. 3. Тры асноўныя этапы ў гісторыі беларускай дыялектнай лексікаграфіі. Этнаграфічны этап, яго храналагічныя межы і асаблівасці. Этналінгвістычны этап як састаўная частка агульнага апісання беларускай мовы. Дыялектаграфічны этап у гісторыі беларускай дыялектнай лексікаграфіі. 4. Развіццё беларускай дыялектнай лексікаграфіі ў другой палове XX ст. – пачатку XXI ст. Асаблівасці лексікаграфічнай праграмы Інстытута мовазнаўства Акадэміі навук Беларусі і вынікі яе рэалізацыі. 5. Вывучэнне лексікі беларускіх гаворак па асобных рэгіёнах. Лексікаграфічнае даследаванне гаворак Магілёўшчыны. Лексікагрфічнае даследаванне гаворак Віцебшчыны. Лексікагрфічнае даследаванне гаворак Гродзеншчыны. Лексікаграфічнае даследаванне гаворак Гомельшчыны. Лексікаграфічнае даследаванне гаворак Міншчыны. Лексікаграфічнае даследаванне гаворак Брэстшчыны. Пяцітомны "Слоўнік беларускіх гаворак паўночна-заходняй Беларусі і яго пагранічча" (1979-1986) як новы тып слоўніка ў беларускай дыялектнай лексікаграфіі, што адлюстроўвае слоўнае багацце паўночна-заходняй дыялектнай зоны і беларускіх гаворак за межамі Беларусі (на тэрыторыі Латвіі, Літвы, Польшчы). Зборнікі дыялектнай лексікі з розных рэгіёнаў Беларусі. Тэматычныя дыялектныя слоўнікі па беларускай дыялектнай мове.	2				2 2 2 2		[2], [3], [4]	
6.2.	*Дыялектная фразеаграфія.* 1. Слоўнікі беларускай дыялектнай фразеалогіі, прынцыпы іх складання. 2. "Беларуская фразеалогія" (1968) Ф.Янкоўскага – першы беларускі слоўнік дыялектнай фразеалогіі.	2						[2], [3], [4]	

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

	3. "Слоўнік беларускай народнай фразеалогіі" (1972) Е.Мяцельскай і Я.Камароўскага. Тры выпускі фразеалагічнага слоўніка Г.Юрчанкі "І коціцца і валіцца" (1972), "І сячэ і паліць" (1974), "Слова за слова" (1977) – унікальны ў славянскай фразеаграфіі збор устойлівых словазлучэнняў з адной гаворкі Мсціслаўшчыны. "З народнай фразеалогіі: Дыферэнцыяльны слоўнік" І.Лепешава (1991). “Слоўнік дыялектнай фразеалогіі Гродзеншчыны” М.Даніловіча (2000). 4. “Прыказкі і прымаўкі” А.Аксамітава (2002) – публікацыя фразеалогіі з архіўных крыніц, рэдкіх выданняў і кафедральных збораў. “Слоўнік беларускіх народных параўнанняў” (2011) як вопыт найбольш поўнага збору вобразных канструкцый.								
	Дыялектная фразеаграфія. 1. Слоўнікі беларускай дыялектнай фразеалогіі, прынцыпы іх складання. 2. "Беларуская фразеалогія" (1968) Ф.Янкоўскага – першы беларускі слоўнік дыялектнай фразеалогіі. 3. "Слоўнік беларускай народнай фразеалогіі" (1972) Е.Мяцельскай і Я.Камароўскага. Тры выпускі фразеалагічнага слоўніка Г.Юрчанкі "І коціцца і валіцца" (1972), "І сячэ і паліць" (1974), "Слова за слова" (1977) – унікальны ў славянскай фразеаграфіі збор устойлівых словазлучэнняў з адной гаворкі Мсціслаўшчыны. "З народнай фразеалогіі: Дыферэнцыяльны слоўнік" І.Лепешава (1991). “Слоўнік дыялектнай фразеалогіі Гродзеншчыны” М.Даніловіча (2000). 4. “Прыказкі і прымаўкі” А.Аксамітава (2002) – публікацыя фразеалогіі з архіўных крыніц, рэдкіх выданняў і кафедральных збораў. “Слоўнік беларускіх народных параўнанняў” (2011) як вопыт найбольш поўнага збору вобразных канструкцый		2			2* 2*		[2], [3], [4]	Апытванне, рэфераты
7.	**ДЫЯЛЕКТНАЯ АСНОВА ЛІТАРАТУРНАЙ МОВЫ (3 Т)**		**2**	**1**	**2**				
	1. З гісторыі фарміравання нацыянальных літаратурных моў. Значэнне тэрміна “літаратурная мова” ў сучасным мовазнаўстве. 2. Асаблівасці фарміравання беларускай літаратурнай мовы ў 17 – пачатку 20 стст. 3. Агульнабеларускія моўныя рысы і іх роля ў стварэнні сучаснай літаратурнай мовы. Важнейшыя асаблівасці паўднёва-заходняга і паўночна-ўсходняга дыялектаў у складзе літаратурнай мовы. Значэнне сярэднебеларускіх гаворак у станаўленні літаратурнай мовы і яе нормаў. Дваісты характар нормаў сучаснай беларускай літаратурнай мовы.		2					[3], [5]	Апытванне, рэфераты
	1. З гісторыі фарміравання нацыянальных літаратурных моў. Значэнне тэрміна “літаратурная мова” ў сучасным мовазнаўстве. 2. Асаблівасці фарміравання беларускай літаратурнай мовы ў 17 – пачатку 20 стст. 3. Агульнабеларускія моўныя рысы і іх роля ў стварэнні сучаснай літаратурнай мовы. Важнейшыя асаблівасці паўднёва-заходняга і паўночна-ўсходняга дыялектаў у складзе			1	2			[3], [5]	Вусныя паведамленні па тэме, рэфераты

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

	літаратурнай мовы. Значэнне сярэднебеларускіх гаворак у станаўленні літаратурнай мовы і яе нормаў. Дваісты характар нормаў сучаснай беларускай літаратурнай мовы.								
8.	**ДЫЯЛЕКТАЛОГІЯ І ВЫКЛАДАННЕ РОДНАЙ МОВЫ І ЛІТАРАТУРЫ Ў ШКОЛЕ (3 г)**			**1**	**2**				
	1. Дыялектная аснова мовы вучняў і засваенне нормаў літаратурнай мовы. Патрабаванні школьных праграм да культуры вуснай і пісьмовай мовы вучняў. 2. Дыферэнцыяльны падыход да выкладання роднай мовы ў дыялектных умовах – асноўнае патрабаванне да працы настаўніка. Сістэматычнае назіранне над мовай вучняў. Выяўленне і класіфікацыя дыялектных адхіленняў у вуснай і пісьмовай мове. Аналіз памылак, звязаных з уплывам роднай гаворкі. Супастаўленне дыялектных з'яў з адпаведнымі з'явамі літаратурнай мовы. Папярэджанне дыялектных памылак. 3. Назіранні вучняў за дыялектнымі асаблівасцямі мясцовай гаворкі, збор лексічнага матэрыялу і складанне дыялектных мікраслоўнікаў. Назіранні за ўжываннем дыялектызмаў у творах беларускай мастацкай літаратуры. Дыялектызмы ў творах пісьменнікаў, якія нарадзіліся ў гэтым раёне, вобласці. Запіс і аналіз вучнямі фальклорных твораў, у якіх адлюстроўваюцца дыялектныя з'явы роднай гаворкі. 4. Назіранні школьнікаў за вуснай мовай аднакласнікаў і ўласнай мовай. 5. Арганізацыя ў кабінеце беларускай мовы кутка "Родная гаворка".			1				[1], [4], [5]	Вусныя паведамленні па тэме, рэфераты
	1. Дыялектная аснова мовы вучняў і засваенне нормаў літаратурнай мовы. Патрабаванні школьных праграм да культуры вуснай і пісьмовай мовы вучняў. 2. Дыферэнцыяльны падыход да выкладання роднай мовы ў дыялектных умовах – асноўнае патрабаванне да працы настаўніка. Сістэматычнае назіранне над мовай вучняў. Выяўленне і класіфікацыя дыялектных адхіленняў у вуснай і пісьмовай мове. Аналіз памылак, звязаных з уплывам роднай гаворкі. Супастаўленне дыялектных з'яў з адпаведнымі з'явамі літаратурнай мовы. Папярэджанне дыялектных памылак. 3. Назіранні вучняў за дыялектнымі асаблівасцямі мясцовай гаворкі, збор лексічнага матэрыялу і складанне дыялектных мікраслоўнікаў. Назіранні за ўжываннем дыялектызмаў у творах беларускай мастацкай літаратуры. Дыялектызмы ў творах пісьменнікаў, якія нарадзіліся ў гэтым раёне, вобласці. Запіс і аналіз вучнямі фальклорных твораў, у якіх адлюстроўваюцца дыялектныя з'явы роднай гаворкі. 4. Назіранні школьнікаў за вуснай мовай аднакласнікаў і ўласнай мовай. 5. Арганізацыя ў кабінеце беларускай мовы кутка "Родная гаворка".				2			[1], [4], [5]	Вусныя паведамленні па тэме, рэфераты
	Усяго:	**18**	**18**	**2**	**4**	**42**			

* Темы прызначаны для навучэнцаў спецыяльнасці 1 – 02 03 01 Беларуская мова і літаратура.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЯ ЧАСТКА

ЛІТАРАТУРА

Асноўная літаратура

1. Леванцэвіч, Л. В. Беларуская дыялекталогія : вучэб.-метад. комплекс / Л. В. Леванцэвіч. – Брэст : Брэсц. дзярж. ун-т, 2014. – 156 с.

Дадатковая літаратура

1. Бірыла, А. В. Выбраныя працы / А. В. Бірыла. – Мінск : Беларус. навука, 2015. – 542 с.
2. Блінава, Э. Д. Беларуская дыялекталогія : вучэб. дапам. / Э. Д. Блінава, Е. С. Мяцельская. – 2-е выд., перапрац. і дап. – Мінск : Выш. шк., 1991. – 304 с.
3. Вайтовіч, Н. Т. Ненаціскны вакалізм народных гаворак Беларусі / Н. Т. Вайтовіч. – Мінск : Навука і тэхніка, 1968. – 219 с.
4. Крывіцкі, А. А. Дыялекталогія беларускай мовы / А. А. Крывіцкі. – Мінск : Выш. шк., 2003. – 294 с.
5. Крывіцкі, А. А. Лінгвагеаграфія / А. А. Крывіцкі // Беларуская мова : энцыклапедыя / пад рэд. А. Я. Міхневіча ; рэдкал.: Б. І. Сачанка (гал. рэд.) [і інш.] – Мінск, 1994. – С. 309–311.
6. Крывіцкі, А. А. Паўднёва-заходні дыялект / А. А. Крывіцкі // Беларуская мова : энцыклапедыя / пад. рэд. А. Я. Міхневіча ; рэдкал.: Б. І. Сачанка (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск, 1994. – С. 415–417.
7. Міхайлаў, П. А. Заходнепалескія гаворкі / П. А. Міхайлаў // Культура Беларусі : энцыклапедыя : у 6 т. / рэдкал.: У. Ю. Аляксандраў (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск, 2013. – Т. 4. – С. 80–83.
8. Міхайлаў, П. А. З гісторыі групоўкі беларускіх гаворак / П. А. Міхайлаў // Роднае слова. – 2013. – № 3. – С. 23–25.
9. Чарнякевіч, Ю. В. Атлас гаворак паўночна-ўсходняй Брэстчыны / Ю. В. Чарнякевіч. – Мінск : Тэхналогія, 2009. – 255 с.
10. Чарнякевіч, Ю. В. Ізаглосы і пучкі ізаглос на картах «Атласа гаворак паўночна-ўсходняй Брэстчыны» / Ю. В. Чарнякевіч // Вес. БДПУ. Сер. 1, Педагогіка. Псіхалогія. Філалогія. – 2016. – № 4. – С. 104–107.
11. Чарнякевіч, Ю. В. Марфалагічная сістэма гаворак жыхароў паўночна-ўсходняй Брэстчыны / Ю. В. Чарнякевіч // Вес. БДПУ. Сер. 1, Педагогіка. Псіхалогія. Філалогія. – 2008. – № 4. – С. 43–45.
12. Чарнякевіч, Ю. В. Фанетычная сістэма гаворак жыхароў паўночна-ўсходняй Брэстчыны / Ю. В. Чарнякевіч // Вес. БДПУ. Сер. 1, Педагогіка. Псіхалогія. Філалогія. – 2008. – № 1. – С. 73–79.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

2. МЕТАДЫЧНЫЯ РЭКАМЕНДАЦЫІ ПА АРГАНІЗАЦЫІ І ВЫКАНАННІ КІРУЕМАЙ САМАСТОЙНАЙ РАБОТЫ СТУДЭНТАЎ

Адной з галоўных задач, якія стаяць перад вышэйшай школай, з'яўляецца павышэнне якасці падрыхтоўкі будучых спецыялістаў. Будучы выпускнік павінен не толькі атрымліваць веды па прадметах, якія прадугледжаны вучэбнымі праграмамі, авалодаць уменнямі і навыкамі выкарыстання гэтых ведаў, метадамі даследчай работы, але і ўмець самастойна набыць новыя навуковыя звесткі.

Сістэматычна арганізаваная самастойная работа студэнтаў з'яўляецца асноўным сродкам падрыхтоўкі да самастойнай дзейнасці, а змест, метады, формы выступаюць у ролі фактараў, якія ўплываюць на даную падрыхтоўку.

Арганізацыя кіруемай самастойнай работы студэнтаў накіравана на вырашэнне наступных **задач:**

– паўтарэнне, замацаванне і абагульненне раней атрыманых ведаў;

– удасканаленне прадметных навыкаў, фарміраванне даследчых уменняў і навыкаў;

– актывізацыя вучэбнай і навукова-даследчыцкай дзейнасці студэнтаў;

– фарміраванне гатоўнасці студэнтаў да самаадукацыі.

Крыніцай інфармацыі пры выкананні студэнтамі кіруемай самастойнай работы могуць выступаць: канспект; друкаваныя матэрыялы; падручнікі і слоўнікі; матэрыялы на электронных носьбітах.

План кіруемай самастойнай работы прадугледжвае: форму работы, змест (аб'ём) работы, тэрмін выканання, віды кантролю.

У залежнасці ад **месца і часу правядзення** КСР, характару кіраўніцтва ёю з боку выкладчыка і спосабу кантролю за яе вынікамі падзяляецца на наступныя віды:

– самастойную працу падчас асноўных аўдыторных заняткаў (лекцый, семінараў);

– самастойную працу пад кантролем выкладчыка ў форме планавых кансультацый, творчых кантактаў, залікаў і экзаменаў;

– пазааўдыторную самастойную працу пры выкананні студэнтам дамашніх заданняў навучальнага і творчага характару.

Самастойнасць пералічаных вышэй відаў прац досыць умоўная, і ў рэальным адукацыйным працэсе гэтыя віды перасякаюцца адзін з адным.

Самастойная праца студэнтаў дзённай формы атрымання адукацыі дастаткова разнастайная, яна **можа прадугледжваць:**

– выкананне самастойных прац;

– выкананне кантрольных прац, складанне схем, табліц;

– працу з даведачнай, метадычнай і навуковай літаратурай па мовазнаўстве;

– абарону выкананых прац;

– падрыхтоўку да дыскусій, канферэнцый;

– падрыхтоўку да тэсціравання і інш.

Асноўныя **віды заданняў** для кіруемай самастойнай працы:

– вывучэнне навуковых і вучэбных тэкстаў (падручнікі, першакрыніцы, дадатковая літаратура);

– складанне плану тэксту;

– графічнае адлюстраванне структуры тэксту;

– канспектаванне тэксту;

– выпіскі з тэксту;

– праца са слоўнікамі, даведнікамі; азнаямленне з нарматыўнымі дакументамі;

– вучэбна-даследчыцкая дзейнасць;

– выкарыстанне аўдыа- і відэазапісаў.

Для **замацавання і сістэматызацыі ведаў**, набытых студэнтамі самастойна, выкарыстоўваюцца наступныя віды дзейнасці:

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

– праца з канспектам лекцыі (апрацоўка тэксту), паўторная работа над вучэбным матэрыялам (з падручнікаў, першакрыніц, дадатковай літаратуры і інш.);

– складанне планаў і тэзісаў адказаў;

– складанне табліц для сістэматызацыі навучальнага матэрыялу;

– вывучэнне нарматыўных матэрыялаў;

– адказы на кантрольныя пытанні;

– падрыхтоўка паведамленняў да выступлення на семінары, канферэнцыі;

– падрыхтоўка рэфератаў, дакладаў;

– складанне бібліяграфіі і інш.;

Для **фарміравання ўменняў** выкарыстоўваюцца наступныя віды дзейнасці:

– выкананне практыкаванняў па ўзоры;

– рашэнне варыянтных заданняў і практыкаванняў;

– выкананне схем, табліц і пад.;

– рэфлексіўны аналіз прафесійных уменняў з выкарыстаннем аўдыё- і відэатэхнікі і інш.

Віды заданняў для кіруемай самастойнай працы, іх змест і характар могуць мець варыятыўны і дыферэнцыяваны характар, улічваць спецыфіку матэрыялу, які выносіцца на самастойнае вывучэнне.

Сярод **канкрэтных відаў** самастойнай работы рэкамендуецца выкарыстоўваць наступныя:

а) самастойная работа па ўзоры (перанос вядомага спосабу ў аналагічную сітуацыю). Пазнаваўчая дзейнасць студэнтаў пры выкананні гэтых заданняў выяўляецца ў асэнсаванні, запамінанні і ўзнаўленні вучэбнага матэрыялу і прымяненні яго па ўзоры. Яе асноўная мэта – замацаванне ведаў, фарміраванне ўменняў і навыкаў.

б) рэканструктыўна-варыятыўная самастойная работа (перанос вядомага спосаба з некаторай мадыфікацыяй у незнаёмую сітуацыю). На гэтым узроўні студэнт прымяняе вядомы спосаб, адаптуючы яго да новай сітуацыі.

в) эўрыстычная самастойная работа (перанос вядомых спосабаў у нестандартную сітуацыю). Пры гэтым студэнт самастойна выбірае, якія рысы ён можа вылучыць, у якой паслядоўнасці іх падаць і на якія акцэнтаваць асабліву ўвагу. Дзякуючы гэтаму, самастойная работа набывае даследчы характар.

Для правядзення **кантролю** самастойнай працы студэнтаў выкарыстоўваюцца:

– праверка індывідуальных заданняў;

– семінарскія заняткі;

– калёквіумы;

– канферэнцыі;

– залікі па тэмах, па раздзелах;

– тэсціраванне;

– кантрольныя работы;

– вусны і пісьмовы экзамены.

Для кантролю эфектыўнасці арганізацыі самастойнай працы студэнтаў можна праводзіць анкетаванне, падчас якога выяўляць карыснасць тых ці іншых відаў і арганізацыйных формаў самастойных прац, правільнасць і своечасовасць іх уключэння ў навучальны працэс, дастатковасць метадычнага забеспячэння, адпаведнасць запланаванага часу на іх выкананне і г.д.

Крытэрыямі адзнакі вынікаў самастойнай працы студэнта могуць з'яўляцца:

– узровень засваення студэнтам вучэбнага матэрыялу;

– уменне студэнта выкарыстоўваць тэарэтычныя веды пры выкананні практычных задач;

– абгрунтаванасць і выразнасць выкладу адказу;

– афармленне матэрыялу ў адпаведнасці з патрабаваннямі стандартаў;

– сфарміраваныя ўменні і навыкі ў адпаведнасці з мэтамі і задачамі вывучэння дысцыпліны.

Самастойная работа студэнтаў можа быць паспяховай толькі ў выпадку яе правільнай арганізацыі, неабходнага метадычнага суправаджэння, дзейснага кантролю, абавязковай сістэматызацыі, а пры неабходнасці і карэкціроўкі ведаў, атрыманых студэнтамі самастойна.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Важным змястоўным элементам самастойнай работы з'яўляецца работа студэнтаў над памылкамі, дапушчанымі пры выкананні запланаванай работы. Выкладчык толькі падкрэслівае словы і выразы, у якіх назіраецца памылковае напісанне ці ўжыванне, даючы студэнту магчымасць разабрацца з імі самастойна, г.з. зрабіць гэтыя недахопы аб'ектамі свядомай мэтанакіраванай работы.

3. МЕТАДЫЧНЫЯ РЭКАМЕНДАЦЫІ ПА АРГАНІЗАЦЫІ І ВЫКАНАННІ САМАСТОЙНАЙ РАБОТЫ СТУДЭНТАЎ

Для павышэння якасці прафесійнай падрыхтоўкі будучых настаўнікаў-філолагаў мэтазгодна на працягу ўсяго тэрміну навучання ў ВНУ прыцягваць кожнага студэнта да сістэматычнай самастойнай работы. Змест і формы самастойнай работы студэнтаў распрацоўваюцца супрацоўнікамі кафедры ў адпаведнасці з мэтамі і задачамі адукацыйнага стандарту.

Матэрыял, рэкамендаваны для самастойнага вывучэння, студэнты павінны атрымліваць ад выкладчыка з першых тыдняў семестра. Матэрыял для самастойнай працы, распрацаваны выкладчыкамі кафедры, можа ўключаць комплексы індывідуальных заданняў па пэўных тэмах, сістэму індывідуальных дамашніх кантрольных работ па тэмах і раздзелах дысцыпліны.

Эфектыўнасць самастойнай працы студэнтаў залежыць ад многіх фактараў. Тут і аптымальны выбраная форма працы, і дакладныя, канкрэтныя ўказанні і рэкамендацыі выкладчыка з наступнай аб'ектыўнай ацэнкай яе вынікаў і, самае важнае, сістэматычнасць і паслядоўнасць у правядзенні такой працы.

Тэксты для самастойнага чытання і вывучэння, канспектавання і рэферыравання, метадычныя ўказанні па напісанні рэферата, кантрольныя тэсты і заданні для самастойнай працы студэнтаў прадстаўлены ў кнізе: Мяцельская, Е. С. Беларуская дыялекталогія: Практыкум / Е. С. Мяцельская, Э. Д. Блінава. - Мінск, 1991. - 287 с.

Модуль	Тэксты для самаст. чытання і вывучэння	Кантрольныя тэксты	Заданні для самаст. работы
Модуль 1. Прадмет і задачы дыялекталогіі	Стр. 21-31, 36-50	Стр. 51-57	Стр. 58-60
Модуль 2. Групоўка гаворак на тэрыторыі Беларусі	Стр. 72-88, 97-112, 125-145, 157-172	Стр. 173-188	Стр. 189-192
Модуль 3. Заходнепалескія гаворкі як асобны структурны тып	Стр. 196-208, 212-230	Стр. 231-236	Стр. 237-238

У дапаможніку прадстаўлены тэмы рэфератаў да кожнага практычнага занятку, а таксама падаюццца тэксты для канспектавання і рэфірыравання:

1) І.Я.Яшкін. Узаемадзеянне рознадыялектных сістэм. Мн., 1976, с.28-62;
2) Вайтовіч Н.Т. Ненаціскны вакалізм народных гаворак Беларусі. Мн., 1968, с. 10-55;
3) М.А.Жыдовіч. Назоўнік у беларускай мове. Мн., 1969, с. 15-44.

ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫКАНАННЯ САМАСТОЙНАЙ ПРАЦЫ СТУДЭНТАЎ

№ п/п	Назва тэмы, раздзела	К-сць гадзін	Заданне	Форма выканання

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

2.1.	Крыніцы вывучэння беларускай дыялектнай мовы. Запісы фальклярыстаў, этнографаў XIX – XXI стст., мастацкія творы пачатку фарміравання сучаснай беларускай літаратурнай мовы, матэрыялы дыялектолагаў XIX – XXI стст., дыялектныя слоўнікі, хрэстаматыі вуснага маўлення, лінгвістычныя атласы і інш.	2	Напісанне рэферата па тэме (рэсурсна-інфармацыйны цэнтр)	Пісьмовая
2.2.	Дыялекталагічныя даследаванні беларускіх гаворак у пасляваенны перыяд.	2	Падрыхтаваць даклад па тэме (рэсурсна-інфармацыйны цэнтр)	Вусная
3.	Тыпы лінгвістычных атласаў у залежнасці ад моўных узроўняў: а) універсальны, б) тэматычны Тыпы лінгвістычных атласаў у залежнасці ад тэрыторыі даследавання: а) агульнанацыянальны, б) рэгіянальны, в) атласы груп моў, г) сем'яў моў ці кантынентаў Беларускія дыялектныя асаблівасці на картах гэтых атласаў. З гісторыі лінгвагеаграфіі (Г.Венкер, Ж.Жыльерон, Я.Карскі, Маскоўская дыялекталагічная камісія, П.Бузук).	2 2 2	Падрыхтаваць даклад (рэсурсна-інфармацыйны цэнтр) Падрыхтаваць даклад (рэсурсна-інфармацыйны цэнтр) Падрыхтаваць даклад (рэсурсна-інфармацыйны цэнтр) Падрыхтаваць даклад (рэсурсна-інфармацыйны цэнтр)	Вусная Вусная Вусная Вусная
4.1.	Першая спроба падзелу гаворак беларускай мовы на групы. Падзел Я.Карскім беларускай мовы на паўночна-ўсходні і паўднёва-заходні дыялекты. Групоўка беларускіх гаворак, зробленая Маскоўскай дыялекталагічнай камісіяй. Пытанні групоўкі гаворак беларускай мовы ў працах М.Дурнаво і П.Бузука. Выдзяленне групы пераходных гаворак паміж дыялектамі беларускай мовы. Сучасная групоўка беларускіх гаворак на аснове матэрыялаў "Дыялекталагічнага атласа беларускай мовы". Асноўныя прынцыпы, на якіх заснавана групоўка (этнагенетычны і культурна-гістарычны).	2 2	Скласці канспект (рэпазіторый) Скласці канспект (рэпазіторый)	Пісьмовая Пісьмовая
4.2.	Групы гаворак паўночна-ўсходняга дыялекту: заходняя (полацкая) і ўсходняя (віцебска-магілёўская).	4	Напісанне рэферата па тэме (рэсурсна-інфармацыйны цэнтр)	Пісьмовая
4.3.	Групы гаворак паўднёва-заходняга дыялекту: заходняя (гродзенска-	4*	Напісанне рэферата па тэме (рэсурсна-	Пісьмовая

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

	баранавіцкая), усходняя (слуцка-бабруйская) і паўднёвая (палеская). Месца палескай групы гаворак у паўднёва-заходнім дыялекце.		інфармацыйны цэнтр)	
4.4.	Дыялектныя зоны як вынік культурна-гістарычнай еднасці беларускай дыялектнай мовы: паўночна-заходняя, паўднёва-ўсходняя, заходняя, усходняя і цэнтральная. Тыповыя моўныя рысы кожнай дыялектнай зоны.	4*	Напісанне рэферата па тэме (рэсурсна-інфармацыйны цэнтр)	Пісьмовая
5. 1.	Нерэгулярныя фанетычныя змены ў беларускай дыялектнай мове. Варыянтнасць зычных на аснове якасных прыкмет. Варыянтнасць галосных на аснове якасных прыкмет. Нерэгулярныя фанетычныя з'вы квалітатыўна-дыстрыбутыўнага характару. Пратэза. Эпентэза. Дыярэза. Метатэза. Прыпадабненне.	2	Напісанне рэферата па тэме (рэсурсна-інфармацыйны цэнтр)	Пісьмовая
5.2.	Фразеалогія. Дыялектныя адрозненні ў фразеалогіі. Агульнапашыраныя і тэрытарыяльна абмежаваныя фразеалагізмы. Прыкметы дыялектных фразеалагізмаў. Сінанімічнасць фразеалагізмаў. Полісемія фразеалагізмаў. Сувязь дыялектнай фразеалогіі з фразеалогіяй літаратурнай мовы.	2	Выкананне практыкавання або рэферат (рэсурсна-інфармацыйны цэнтр)	Пісьмовая
6.1.	Вывучэнне лексікі беларускіх гаворак па асобных рэгіёнах. Лексікаграфічнае даследаванне гаворак Магілёўшчыны.	2	Напісанне рэферата па тэме (рэсурсна-інфармацыйны цэнтр)	Пісьмовая
	Лексікагрфічнае даследаванне гаворак Віцебшчыны.	2	Выкананне практыкавання або рэферат (рэсурсна-інфармацыйны цэнтр)	Пісьмовая
	Лексікагрфічнае даследаванне гаворак Гродзеншчыны.			
	Лексікаграфічнае даследаванне гаворак Гомельшчыны.			
	Лексікаграфічнае даследаванне гаворак Міншчыны.	2	Падрыхтаваць прэзентацыю (рэсурсна-інфармацыйны цэнтр)	Вусная
	Лексікаграфічнае даследаванне гаворак Брэстчыны.			
	Пяцітомны "Слоўнік беларускіх гаворак паўночна-заходняй Беларусі і яго пагранічча" (1979-1986) як новы тып слоўніка ў беларускай дыялектнай лексікаграфіі, што адлюстроўвае слоўнае багацце паўночна-заходняй			

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

	дыялектнай зоны і беларускіх гаворак за межамі Беларусі (на тэрыторыі Латвіі, Літвы, Польшчы). Зборнікі дыялектнай лексікі з розных рэгіёнаў Беларусі. Тэматычныя дыялектныя слоўнікі па беларускай дыялектнай мове.	2	Напісанне рэферата па тэме (рэсурсна-інфармацыйны цэнтр)	Пісьмовая
6.2.	Слоўнікі беларускай дыялектнай фразеалогіі, прынцыпы іх складання. “Слоўнік беларускіх народных параўнанняў” (2011) як вопыт найбольш поўнага збору вобразных канструкцый.	2* 2*	Напісанне рэферата па тэме (рэсурсна-інфармацыйны цэнтр) Падрыхтаваць прэзентацыю (рэсурсна-інфармацыйны цэнтр)	Пісьмовая Вусная

4. ПРЫКЛАДНЫ ПЕРАЛІК ЗАДАННЯЎ КІРУЕМАЙ САМАСТОЙНАЙ РАБОТЫ СТУДЭНТАЎ

Тэма 7 Дыялектная аснова літаратурнай мовы – 4 гадзіны (практычныя)

Заданне:

1 модуль складанасці – на аснове падручніка (Мяцельская, Е. С. Беларуская дыялекталогія: Практыкум / Е. С. Мяцельская, Э. Д. Блінава. - Мінск, 1991. - 287 с.) складзіце план адказаў на пытанні.

1. Ці ёсць адрозненні ў сістэме зычных гаворкі і літаратурнай мовы?.
2. Як перадаюцца ў гаворках пярэднеязычныя санорныя [р] і [р']? Як называюцца такія гаворкі?
3. Як перадаюцца пярэднеязычныя афрыкаты [дз'] — [ц'] і змычныя [д(д')| і [т(т')]?
4. Як перадаюцца пярэднеязычныя шыпячыя [ж], [ч], [ш] і афрыкаты [дж], [ц]?
5. Як перадаюцца губныя фанемы [б] — [б'], [в] — [в'], [м] - [м'], [п] - [п']?
6. Ці ўласцівы фанемы [ф] — [ф'] сістэме кансанантызму беларускай мовы?

2 модуль складанасці – выканайце заданні 7-12 з практыкума (Мяцельская, Е. С. Беларуская дыялекталогія: Практыкум / Е. С. Мяцельская, Э. Д. Блінава. - Мінск, 1991. - 287 с.): складзіце апорныя схемы «Асаблівасці гаворак у склоне», «Асаблівасці гаворак у склоне», «Дыялектныя канчаткі назоўнікаў адзіночнага і множнага ліку ўсіх тыпаў скланення», запоўніце табліцы «Несупадзенне назоўнікаў у родзе»,«Скланенне рознаскланяльных назоўнікаў».

3 модуль складанасці – падрыхтуйце праект «Фанетыка і марфалогія дыялектнай мовы» і абараніце яго.

Тема 8. Дыялекталогія і выкладанне роднай мовы і літаратуры ў школе – 2 гадзіны (лекцыйныя)

Заданне:

1 модуль складанасці – на аснове падручніка (Мяцельская, Е. С. Беларуская дыялекталогія: Практыкум / Е. С. Мяцельская, Э. Д. Блінава. - Мінск, 1991. - 287 с.) складзіце кароткі канспект па пытаннях

3. Дыялектная аснова мовы вучняў і засваенне нормаў літаратурнай мовы.
4. Патрабаванні школьных праграм да культуры вуснай і пісьмовай мовы вучняў.

2 модуль складанасці – падрыхтуйце рэферат па адной з прапанаваных тэмаў.

1. Выяўленне і класіфікацыя дыялектных адхіленняў у вуснай і пісьмовай мове.
2. Аналіз памылак, звязаных з уплывам роднай гаворкі.
3. Супастаўленне дыялектных з'яў з адпаведнымі з'явамі літаратурнай мовы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

4. Папярэджанне дыялектных памылак.

3 модуль складанасці – падрыхтуйце праект «Арганізацыя ў кабінеце беларускай мовы кутка "Родная гаворка"» і абараніце яго.

ПЕРАЛІК РЭКАМЕНДАВАНЫХ СРОДКАЎ ДЫЯГНОСТЫКІ

Для атрымання аб’ектыўнай інфармацыі аб ўзроўні паспяховасці студэнтаў мэтазгодна сістэматычна выкарыстоўваць розныя віды кантролю, сярод якіх: бягучы, тэматычны, прамежкавы і выніковы. Кожны з відаў кантролю ўжываецца на пэўным этапе навучання і выконвае ў педагагічным працэсе адну з функцый: стымулюючую, навучальную, дыягнастычную, выхаваўчую і інш.

Дыягностыка кампетэнцый па дысцыпліне можа мець розныя формы.

Вусны кантроль: франтальнае, індывідуальнае, ушчыльненае (камбінаванае) апытванне на лекцыях і практычных занятках, калёквіумы, даклады, вусны аналіз дыялектнага тэксту, вусны залік.

Пісьмовы кантроль: тэрміналагічныя дыктанты, кантрольныя работы, пісьмовыя работы па аўдыторных (дамашніх) практыкаваннях, рэфераты, пісьмовы аналіз тэксту гаворкі, пісьмовы залік.

Тэставы кантроль: выкананне тэставых заданняў адкрытага і закрытага тыпу.

КРЫТЭРЫІ І ПАКАЗЧЫКІ АЦЭНКІ ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ СТУДЭНТАЎ НА ЭКЗАМЕНЕ

Адзнака	Крытэрыі
10	Студэнт свабодна валодае вучэбным матэрыялам і паказвае яго поўнае разуменне; выяўляе самы высокі ўзровень усведамленасці вывучанага, абгрунтавана выкладае свае думкі, выкарыстоўваючы звесткі з дадатковай літаратуры, робіць самастойныя вывады і заключэнні, падмацоўвае свой адказ уласнымі ілюстрацыямі-доказамі. Аналіз моўных фактаў выкананы без памылак, што сведчыць пра ўменне прымяняць тэарэтычныя веды для вырашэння практычных задач навучання. Перадае матэрыял паслядоўна, захоўваючы нормы літаратуранай мовы; праяўляе адказнасць, пазнавальную актыўнасць і крэатыўнасць. Маўленне адпавядае патрабаванням лагічнасці, дакладнасці, правільнасці, выразнасці.
9	Студэнт свабодна валодае вучэбным матэрыялам, дае поўнае азначэнне лінгвістычным паняццям, выяўляе высокі ўзровень усведамленасці вывучанага і ўменне аргументавана выкладаць яго, падмацоўвае свой адказ яркімі ілюстрацыямі-доказамі (як з дапаможнікаў, так і самастойна падабранымі). Аналіз моўных фактаў выкананы без памылак, што сведчыць пра ўменне прымяняць тэарэтычныя веды для вырашэння практычных задач навучання. Маўленне адпавядае патрабаванням лагічнасці, дакладнасці, правільнасці, выразнасці.
8	Студэнт у дастаткова поўным аб’ёме валодае вучэбным матэрыялам, самастойна абгрунтоўвае свой адказ і прыводзіць ілюстрацыі-доказы, узятыя з дапаможнікаў ці лекцый. Пры выкананні аналізу моўных фактаў дапускае асобныя недакладнасці, якія сам жа выпраўляе. Матэрыял выкладае паслядоўна, з захаваннем літаратурных нормаў; не дапускае фактычных памылак. Маўленне адпавядае патрабаванням лагічнасці, дакладнасці, правільнасці, выразнасці.
7	Студэнт у дастаткова поўным аб’ёме перадае вучэбны матэрыял з асобнымі недакладнасцямі, якія выпраўляе пасля дадатковых пытанняў; можа абгрунтаваць свой адказ, прывесці ілюстрацыі-доказы; матэрыял выкладае паслядоўна з нязначнымі адхіленнямі ад літаратурнай нормы. Аналіз моўных фактаў выкананы з некаторымі памылкамі, якія выпраўляюцца самастойна. Маўленне ў асноўным

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

	адпавядае патрабаванням лагічнасці, дакладнасці, правільнасці, выразнасці.
6	Студэнт перадае вучэбны матэрыял з нязначнымі памылкамі, але выпраўляе іх з дапамогай выкладчыка; тэарэтычныя звесткі падмацоўвае ілюстрацыямі, але без дастаткова глыбокага і доказнага іх абгрунтавання; дапускае недакладнасці ў паслядоўнасці выкладу матэрыялу і яго моўным афармленні. Аналіз моўных фактаў выкананы з нязначнымі памылкамі, якія выпраўляюцца самастойна. Маўленне ў асноўным адпавядае патрабаванням лагічнасці, дакладнасці, правільнасці, выразнасці.
5	Студэнт ў асноўным ведае і разумее галоўныя палажэнні тэмы, але дапускае памылкі ў азначэнні паняццяў і фармулёўцы правіл, якія можа выправіць з дапамогай выкладчыка; выкладае матэрыял непаслядоўна; дапускае памылкі ў моўным афармленні. Аналіз моўных фактаў выкананы з памылкамі, якія выпраўляюцца з дапамогай выкладчыка. Маўленне недастаткова лагічнае і выразнае.
4	Студэнт няпоўна выкладае праграмны вучэбны матэрыял, дапускае асобныя памылкі ў азначэнні паняццяў і фармулёўцы правіл, не ўмее абгрунтаваць свае разважанні, адчувае цяжкасці пры падборы ілюстрацый; парушае паслядоўнасць выкладу матэрыялу, дапускае памылкі ў моўным афармленні адказу. Моўны аналіз выкананы з памылкамі, якія выпраўляюцца з дапамогай выкладчыка. Маўленне недастаткова лагічнае і выразнае.
3	Студэнт ўзнаўляе нязначную частку вучэбнага матэрыялу, дапускае істотныя памылкі, якія выпраўляе з дапамогай выкладчыка. Аналіз моўных фактаў не выкананы або выкананы з грубымі памылкамі. Маўленне не адпавядае патрабаванням лагічнасці, дакладнасці, правільнасці, выразнасці.
2	Студэнт называе асобныя моўныя факты з вучэбнага матэрыялу, дапускае істотныя памылкі, якія выпраўляе з дапамогай выкладчыка. Аналіз моўных фактаў не выкананы або выкананы са значнымі памылкамі. Маўленне не адпавядае патрабаванням лагічнасці, дакладнасці, правільнасці, выразнасці.
1	Студэнт не валодае нават асобнымі фактамі з вучэбнага матэрыялу, не ўсведамляючы іх месца ў агульнай моўнай сістэме. Аналіз моўных фактаў не выкананы або выкананы са значнымі памылкамі. Маўленне не адпавядае патрабаванням лагічнасці, дакладнасці, правільнасці, выразнасці.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

СПІС РЭКАМЕНДАВАНАЙ ЛІТАРАТУРЫ

1. Бірыла, А. В. Выбраныя працы / А. В. Бірыла. – Мінск : Беларус. навука, 2015. – 542 с.
2. Блінава, Э. Д. Беларуская дыялекталогія : вучэб. дапам. / Э. Д. Блінава, Е. С. Мяцельская. – 2-е выд., перапрац. і дап. – Мінск : Выш. шк., 1991. – 304 с.
3. Вайтовіч, Н. Т. Ненаціскны вакалізм народных гаворак Беларусі / Н. Т. Вайтовіч. – Мінск : Навука і тэхніка, 1968. – 219 с.
4. Крывіцкі, А. А. Дыялекталогія беларускай мовы / А. А. Крывіцкі. – Мінск : Выш. шк., 2003. – 294 с.
5. Крывіцкі, А. А. Лінгвагеаграфія / А. А. Крывіцкі // Беларуская мова : энцыклапедыя / пад рэд. А. Я. Міхневіча ; рэдкал.: Б. І. Сачанка (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск, 1994. – С. 309–311.
6. Крывіцкі, А. А. Паўднёва-заходні дыялект / А. А. Крывіцкі // Беларуская мова : энцыклапедыя / пад. рэд. А. Я. Міхневіча ; рэдкал.: Б. І. Сачанка (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск, 1994. – С. 415–417.
7. Леванцэвіч, Л. В. Беларуская дыялекталогія : вучэб.-метад. комплекс / Л. В. Леванцэвіч. – Брэст : Брэсц. дзярж. ун-т, 2014. – 156 с.
8. Міхайлаў, П. А. Заходнепалескія гаворкі / П. А. Міхайлаў // Культура Беларусі : энцыклапедыя : у 6 т. / рэдкал.: У. Ю. Аляксандраў (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск, 2013. – Т. 4. – С. 80–83.
9. Міхайлаў, П. А. З гісторыі групоўкі беларускіх гаворак / П. А. Міхайлаў // Роднае слова. – 2013. – № 3. – С. 23–25.
10. Чарнякевіч, Ю. В. Атлас гаворак паўночна-ўсходняй Брэстчыны / Ю. В. Чарнякевіч. – Мінск : Тэхналогія, 2009. – 255 с.
11. Чарнякевіч, Ю. В. Ізаглосы і пучкі ізаглос на картах «Атласа гаворак паўночна-ўсходняй Брэстчыны» / Ю. В. Чарнякевіч // Вес. БДПУ. Сер. 1, Педагогіка. Псіхалогія. Філалогія. – 2016. – № 4. – С. 104–107.
12. Чарнякевіч, Ю. В. Марфалагічная сістэма гаворак жыхароў паўночна-ўсходняй Брэстчыны / Ю. В. Чарнякевіч // Вес. БДПУ. Сер. 1, Педагогіка. Псіхалогія. Філалогія. – 2008. – № 4. – С. 43–45.
13. Чарнякевіч, Ю. В. Фанетычная сістэма гаворак жыхароў паўночна-ўсходняй Брэстчыны / Ю. В. Чарнякевіч // Вес. БДПУ. Сер. 1, Педагогіка. Псіхалогія. Філалогія. – 2008. – № 1. – С. 73–79.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ